Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны

***краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2014 год***



Кобрын 2014

# Прадмова

Краязнаўчы каляндар змяшчае звесткі аб знамя-нальных падзеях Кобрыншчыны на 2014 год. Даты, уключаныя ў каляндар, адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця рэгіёна; памятныя даты вядомых людзей, біяграфіі якіх звязаны з краем.

Спісы да юбілейных дат уключаюць кнігі і арты-кулы з газет і часопісаў. Матэрыял размешчаны ў наступным парадку: спачатку кнігі па алфавіту, потым артыкулы з газет і часопісаў у адваротным парадку (у межах года – па алфавіту).

Каляндар адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца сваёй малой радзімай ці выкарыстоўвае краязнаўчыя звесткі ў прафесійнай дзейнасці.

Краязнаўчы каляндар выкарыстоўваецца пры планаванні работы бібліятэкі, правядзенні масавых свят і юбілейных мерапрыемстваў.

# Дакументы сведчаць: асноўныя юбілейныя даты горада і раёна



***1519 г.***

***Канец дынастыі князёў Кобрынскіх. Кобрын з прылеглымі землямі становіцца каралеўскім уладаннем – старостваم (першы староста - Вацлаў Касцевіч). Гэтую дату можна ўмоўна лічыць пачаткам новага перыяду гісторыі горада.***

**Казлоў, Л.Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай /Л.Р. Казлоў//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.31.

***1589 г. 5 студзеня***

***Кобрын атрымлівае Магдэбургскае права (самакіраванне).***

**Казлоў, Л.Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай /Л.Р. Казлоў//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.34-37.

**Чирун, А.** Вольный город/Александр Чирун //Кобрынскі веснік.- 2009. – 19 жніўня. - С.5.

**Мартынаў, А.** Унія на Кобрыншчыне /А. Мартынаў //Камуністычная праца. – 1990. - 6 студзеня.

## *1784 г.*

***Апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі наведвае Кобрын і Гарадзец пад час адкрыцця Каралеўскага канала. У гісторыі Кобрына гэта быў апошні візіт каранаванай асобы. Падыйшоў да канца і каралеўскі час горада.***

**Казлоў, Л.Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай /Л.Р. Казлоў //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.37.

## *1794 г. верасень*

***У час падаўлення расійскімі войскамі паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі 5-тысячны атрад пад камандаваннем А.В. Суворава разграміў 14 верасня часці паўстанцаў пад Дзівінам, захапіў Кобрын, а праз тры дні пад Крупчыцамі нанёс паражэнне корпусу К.Серакоўскага.***

**Казлоў, Л.Р.** Картаграфія Беларусі падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі /Л.Р. Казлоў. – Мінск-Брэст, 2004. - 15 с.

**Пліско, Н.М.** Час Суворава /Н.М. Пліско //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.51-57.

**Тадэвуш Касцюшка** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.51.

**1794 год** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.51.

## *1939 г. 22 верасня*

***У Кобрын увайшлі савецкія войскі.***

**Пліско, Н.М.** Да новага жыцця /Н.М. Пліско //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.122-124.

**Той незабыўны верасень…** : З успамінаў А.М. Сушчука, ветэрана вайны і працы //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.124-124.

**Князева, В.М.** Сацыяльна-эканамічнае становішча Кобрыншчыны ў 1939-1940 гг. /В.М. Князева //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.126-130.

**Мелещук, И.** Кобрин в огне 1939-го /Инна Мелещук //Кобрин-информ. - 2012. – 13 сентября. – С.5.

**Мартынов, А.** Судьбоносный 1939 /А. Мартынов //Кобрин-информ. – 2010. – 6 января. – С.6.

**Чирун, А.** Сентябрь тридцать девятого: к 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР /Александр Чирун //Кобрынскі веснік. – 2009. – 21 кастрычніка. – С.8.

**Китайчук, М.** Советская власть в Кобрине: [Кобрин в 1939 г.] /Мечислав Китайчук//Кобрин-информ.– 2008. – 3 апреля.

**Китайчук, М.** Группировка "Кобрин": [Кобрин в 1939 г.] /Мечислав Китайчук //Кобрин-информ. – 2007. –15 ноября. – С.3.

**Бодак, М.С.** Формирование органов советской власти на территории Кобринского района (1939-1940) /М.С. Бодак //Вестник Брестского государственного технического университета. – 2000. - №6. – С.33-35.

**Батулин, С.** И въехал танк на переправу…: [к 60-летию воссоединения белорусских земель с БССР, воспоминания очевидца о дне, когда Красная Армия вошла в г. Кобрин] /С. Батулин //Заря. – 1999. – 2 сентября. – С.2.

**Сущук, А.** 1939 год глазами современника /А. Сущук // Кобрынскі веснік. – 1999. – 18 жніўня. – С.2.

**Сущук, А.** Тот незабываемый сентябрь…: [события 1939г. на Кобринщине] /А. Сущук /Народная газета. – 1999. – 26 жніўня. – С.2.

**Хільчук, М.** Што ж было ў верасні 1939 года? / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1993. – 16 кастрычніка. – С.2.

**Сушчук, А.** Незабыўная дата /А. Сушчук //Камуністычная праца. – 1989. - 29 жніўня.

**Пераломны момант гісторыі**: Да 50-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР //Камуністычная праца. – 1989. - 16 верасня.

**Мартынаў, А.** Год, які прынёс новы лёс: [Кобрын у 1939] /А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1987. – 9 ліпеня.

**Голікава, А.** Восенню 1939-га… /А. Голікава // Камуністычная праца. – 1987. – 26 верасня.

**Мартынаў, А.** У памятным 39-м /А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1979. – 20 кастрычніка.

## *1944 г. 20 ліпеня*

***20 ліпеня стаў памятным днём для жыхароў Кобрыншчыны. У гэты дзень войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі 1944 г. быў вызвалены Кобрын.***

**Пліско, Н.М.** Вызваленне: [20.07. 1944 г. стаў памятным для жыхароў Кобрыншчыны]/Н.М. Пліско//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.230-231.

**Подорожный, Н.А**. Радость освобождения: рассказывают фронтовики /Н.А. Подорожный //По дорогам юности моей /Н.А. Подорожный. - Москва, 1987. – С.73-91.

**Яны вызвалялі Кобрыншчыну** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.232-239.

**Дворецкий, М.** Этих дней не смолкнет слава…: [освобождение г. Кобрина от немецко-фашистских захватчиков] /Моисей Дворецкий //Заря. – 2012. - 2 августа. - С.18.

**Мартынов, А.** Тем временем в городе… : [освобождение города от немецко-фашистских захватчиков] /Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2012. – 21 ліпеня. – С.3.

**Савченко, Н.** Так пришло освобождение. В июле 1944-го /Надежда Савченко //Кобрынскі веснік. – 2012. - 21 ліпеня. - С.3.

**И пришло освобождение** // Кобрынскі веснік. – 2011. – 17 ліпеня. – С.2.

**Как это было:** [20 июля 1944 г. войсками Первого Белорусского фронта был освобождён Кобрин] // Кобрынскі веснік. – 2009. - 18 ліпеня. – С.2.

**Светлый день освобождения** //Кобрынскі веснік. – 2007. - 21 ліпеня. – С. 1-2.

**Деревянко, А.И.** Не забыть эти дни: [воспоминания командира 669 стрелкового полка, освобождавшего г. Кобрин] / А.И. Деревянко // Кобрынскі веснік. – 2005. - 23 ліпеня. – С.1.

**Мартынаў, А.** Кобрын : ліпень 1944-га / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1989. - 20 ліпеня. – С.2-3.

**19-20 ліпеня 1944 года**: Хроніка вызвалення Кобрына // Камуністычная праца. – 1984. – 21 ліпеня.

**Фралоў, П.** Яны вызвалялі Кобрын /П. Фралоў// Камуністычная праца. – 1983. – 1 снежня.

**Александровіч, Б.** У 44-м, пад Кобрынам /Б. Александровіч //Беларусь. – 1978. - №9. – С. 19.

**Ляўчук, К**. Вуліцы імя герояў: [аб героях, загінуўшых пры абароне Кобрына] /К. Ляўчук //Камуністычная праца.– 1975.–4 студзеня.

## *1944 г. 21 ліпеня*

***У ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі часцямі 212-й стралковай дывізіі (палкоўнік У.Г. Кучынёў) быў вызвалены Дзівін, цэнтр аднайменнага раёна, тэрыторыя якога ўваходзіць зараз у склад Кобрынскага раёна.***

## *1959 г. жнівень*

***У жніўні да Кобрынскага раёна далучаны Аніскавіцкі, Гарадзецкі і Грушаўскі сельсаветы скасаванага Антопальскага раёна, Верхалескі, Дзівінскі, Навасёлкаўскі, Павіцкеўскі і Хабовіцкі сельсаветы скасаванага Дзівінскага раёна.***

# Юбілейныя даты вёсак Кобрынскага раёна

## *Вёсцы Акцябр – 490 гадоў*

**Акцябр** (да 1940 г. Камень Шляхецкі; мясцовая назва Камэнь Шляхэцькый) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце.

У 1524 г. Жыгімонт І Стары выдаў пацвярджальны прывілей на маёмасць Камень дваранам Верашчакам. У 1582 г. Камень у Кобрынскім старостве ВКЛ. У 1739 г. маёнтак, уладанне Верашчакаў, у Брэсцкім ваяводстве; у 1777 г. Камень Шляхецкі, уладанне князёў Шуйскіх. З 1795 г. - у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. - у Гродзенскай губерні. У 1886 г. сяло ў Гарадзецкай воласці, 45 двароў, 590 жыхароў, царква, школа, 2 кірмашы. У 1890г. - сяло, 683,75 дзесяціны зямлі, 77 дзесяцін зямлі; пасёлак (на тэрыторыі Залескай воласці), 27,5 дзесяціны зямлі, другі пасёлак (Гарадзецкая воласць), 213,75 дзесяціны зямлі розных уладальнікаў. Побач знаходзіліся аднайменныя 5 маёнткаў, уладанні Э.Чарноцкага, 250 дзесяцін зямлі (разам з фальваркам Адэлін); Ю.Багуслаўскай, 281,25 дзесяціны зямлі; І.Бржастоўскага, 91 дзесяціна зямлі; І.Пятрова, 175 дзесяцін зямлі; У.Міцкевіча, 102,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. Камень Шляхецкі: сяло, 119 двароў, 792 жыхары, хлебазапасны магазін; 2 двары, 12 жыхароў, царква (у 1888 г. у праваслаўным прыходзе 2650 вернікаў), 1 двор, 7 жыхароў, народнае вучылішча (у 1889/90 навучальным годзе было 60 хлопчыкаў, 1 дзяўчынка, у 1892/93 - 72 хлопчыкі, 5 дзяўчынак, у 1905/06гг. - 76 хлопчыкаў, 11 дзяўчынак). У 5 маёнтках налічвалася 70 жыхароў. У 1905 г. у сяле 896 жыхароў, у 5 маёнтках 36 жыхароў. З 1915 г. сяло і маёнткі акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі, з 1919 г. - польскімі войскамі. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Гарадзецкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 68 двароў, 312 жыхароў, 5 фальваркаў, 36 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа, чытальня, вячэрнія курсы, тэатральны і харавы гурткі. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. цэнтр Акцябрскага сельсавета, з 31.3.1959 г. у Гарадзецкім сельсавеце, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940

г. 152 двары, 681 жыхар, няпоўная сярэдняя школа (257 вучняў), хата-чытальня, кааператыўная лаўка, сельсавет. У 1949 г. 40 вясковых гаспадарак аб'ядналіся ў калгас (старшыня А.П. Шаўчук), у вёсцы працавала хата-чытальня. На 1.01.1999 г. 277 двароў, 641 жыхар; будынак адміністрацыі калгаса «Кастрычнік», 2 магазіны, фельчарска-акушэрскі пункт, дзіцячы сад, сельскі Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа. Помнік архітэктуры - Свята-Пакроўская царква (драўляная, пабудавана ў 1937 г.). 273 гаспадаркі, 607 жыхароў (2005 г.)

Помнік архітэктуры - Свята-Пакроўская царква (драўляная, пабудавана ў 1937 г.).

Помнікі на ўшанаванне памяці 129 землякоў і на 2–ух магілах партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

У в. Акцябр нарадзіўся доктар філасоўскіх навук, прафесар Г.П. Давідзюк.


**Акцябр** //Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. - Мінск, 1996. - Т.1. - С.223.

**Акцябр** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.116-117.

**Акцябр** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.562.


## *Вёсцы Басяч – 425 гадоў*




**Басяч** (мясцовая назва Босяч) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1589 г. У 1629 г. маёнтак у Брэсцкім ваяводстве Рэчы Паспалітай. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. - у Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска, 144 дзесяціны зямлі, у Стрыгаўскай воласці. Побач знаходзіліся аднайменныя: ваколіца (розныя ўладальнікі), 311

дзесяцін зямлі; 2 маёнткі - уладанне А.Басяцкага, 203 дзесяціны зямлі; уладанне А.Слаўскага, 167,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. у вёсцы 30 двароў, 207 жыхароў, хлебазапасны магазін; у ваколіцы 14 двароў, 92 жыхары; у маёнтках: Басяч - 30 двароў і 13 жыхароў; Басяч (Канавалаўшчына) - 4 жыхары. У 1905 г. у вёсцы 283 жыхары, у маёнтку - 34. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства; вёска, 35 двароў, 196 жыхароў; калонія, 10 двароў, 72 жыхары. У 1930-я гады працавалі школа і вячэрнія курсы. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Яроміцкім, з 19.07.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. - 68 двароў, 333 жыхары. У 1948 г. 57 вясковых гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Перамога» (старшыня Л.Гузюк). На 1.1.1999 г. 58 двароў, 132 жыхары, магазін, у складзе калгаса «Перамога» (з 2004 СВК "Пакроўскі"; цэнтр – в. Бухавічы). 43 гаспадаркі, 118 жыхароў (2005г.).

**Басяч** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць.- С.123.

**Басяч** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С 567.

**Можаровская, Е**. И ароматом яблочным окутанный Босяч /Елена Можаровская //Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 верасня. – С.3.

**Можаровская, Е**. И день вчерашний имя назовёт: [д. Босяч] /Елена Можаровская //Вечерний Брест.– 2001.–18 мая. – С.3.

## *Вёсцы Брылева – 465 гадоў*

**Брылёва** - вёска ў Кіселявецкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1549 г. у інвентары Кобрынскага Спаскага манастыра. У 1563 г. урочышча каля Кобрына, у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1739 г. - маёнтак у Брэсцкім ваяводстве. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Блоцкай (Балоцкай) воласці, 120,75 дзесяціны зямлі. Побач знаходзіліся аднайменныя: урочышча, уладанне

Д.Вайнштэйна, 20 дзесяцін зямлі; 2 маёнткі, уладанні Я.Брадзінскай, 214,5 дзесяціны зямлі, і Ф. Гіржа, 51 дзесяціна зямлі. У 1897 г. у вёсцы 15 двароў, 105 жыхароў, хлебазапасны магазін, у маёнтках: Брылёва, 36 жыхароў, Брылёва-Падлясок, 17 жыхароў. У 1905 г. вёска, 209 жыхароў, і маёнтак, 8 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Блоцкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства; вёска, фальварак і асада налічвалі 26 дамоў, 157 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Кісялявецкім сельсавеце. У 1940 г. Брылёва – хутары, 45 двароў, 236 жыхароў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы працаваў торфазавод «Брылёва». На 1.1.1999 г. 79 двароў, 201 жыхар, у складзе калгаса «Магдалінскі» (з 2004 “Магдалінскі”). 83 гаспадаркі, 195 жыхароў (2005).

**Брылёва** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.125

**Брылёва** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 568.

### *Вёсцы Буховічы – 455 гадоў*

**Буховічы** (мясцовая назва Буховычы) - вёска, цэнтр Буховіцкага сельсавета і калгаса «Перамога». Вядома з XVI ст. як вёска і маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак Буховічы знаходзіўся ва ўладанні братоў Галянішчавічаў. У маёнтку, ва ўрочышчы Гарбанцы, была пабудавана царква (Буховецкая-Гарбанская), якая ў 1599 г. атрымала фундуш на землі Верашчакаў. Сяло Буховічы ўваходзіла ў склад Кобрынскай эканоміі, войтаўства Астрамецкае, 13 валок зямлі. У 1597 г. - сяло ў Кобрынскім старостве, 13 валок зямлі, знаходзілася ў пажыццёвай заставе ў Крыштофа Зяновіча, ваяводы брэсцкага. У 1786 г. у сяле 11 валок зямлі, у аднайменным засценку 12 маргоў зямлі. Маёнтак Буховічы (ці Кулікоўшчызна, ці Астрамеч) з 1732 г. закладзены Буховецкаму дамініканскаму манастыру (у 1674 г. пабудаваны дамініканскі касцёл).

Манастыр існаваў да 1832 г. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1886 г. 2 праваслаўныя царквы (адна з іх былы касцёл, да якога ў 1889 г. прыбудавана званіца); у 1888 г. прыход налічваў 2637 вернікаў. У 1890 г. у Падалескай воласці, сяло, 359 дзесяцін зямлі, маёнтак, уладанне С.Каішэўскай, 241 дзесяціна зямлі. У 1897 г. вёска, 44 двары, 254 жыхары, хлебазапасны магазін, прыходская Пакроўская царква (захавалася да нашага часу, былы касцёл), дом царкоўнага ахоўніка (4 жыхары). Побач існавалі фальварак Буховічы (Карастоўка), 7 жыхароў; прыватная сядзіба Буховічы, 53 жыхары, ветраны млын. У 1905 г. вёска, 289 жыхароў і 2 маёнткі: Буховічы, 20 жыхароў і Буховічы Малыя, 3 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства. Буховічы - вёска, 20 двароў, 106 жыхароў; фальварак, 4 двары, 26 жыхароў. Фальварак Буховічы Малыя (Карастоўка) налічваў 2 двары, 16 жыхароў. У 1930-я гады дзейнічалі школа, чытальня, тэатральны гурток. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Яроміцкім сельсавеце, з 19.7.1976 г. - цэнтр сельсавета. У 1940 г. у вёсцы 58 двароў, 260 жыхароў; у былым маёнтку 4 двары, 37 жыхароў, працаваў паравы млын. У 1948 г. арганізаваны калгас «Савецкая Беларусь». На 1.1.1999 г. 127 двароў, 372 жыхары, магазін, сельскі клуб, бібліятэка, базавая школа, дзіцячы сад, будынкі выканкама сельсавета і адміністрацыі калгаса «Перамога» (з 2004 СВК “Пакроўскі”). Размешчаны адміністрацыйныя будынкі выканкама сельсавета і калгаса, клуб, бібліятэка, базавая школа, дзіцячы сад, магазін, аддзяленне сувязі.

На 2005 год налічваецца 139 гаспадарак, 378 жыхароў.

Помнік архітэктуры: Пакроўская царква (1674).

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Бухавічы** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.126-127.

**Бухавічы** //Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск, 1970 . - Т. 2. – С.486.

**Бухавічы:** Назва населенага пункта паводле легендаў і паданняў //Брэстчына. – Мінск, 1995. – С.265-268.

**Буховічы** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С 569.

**Буховичи** //Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1.- С. 220.

## *Вёсцы Бяроза – 455 гадоў*



**Бяроза** (мясцовая назва Быроза) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1559 г. Бяроза (Беразое) - маёнтак і сяло ў Кобрынскім павеце ВКЛ. Частка маёнтка знаходзілася ва ўладанні пана Касцюшкі, другая частка - у Сенкі, Дзяменція і Карнілы Кулневічаў. У 1597 г. сяло Бяроза ў Лягатаўскім войтаўстве Кобрынскага староства, 32 валокі зямлі, 3 засценкі (усяго з засценкамі 40 валок); знаходзілася ў пажыццёвым уладанні З.В. Гузельфа. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1864 г. пабудавана драўляная Крыжаўзвіжанская царква (захавалася да нашага часу; у 1888 г. прыход налічваў 1999 вернікаў). У 1886 г. сяло Стрыгаўскай воласці, 30 двароў, 328 жыхароў, царква, школа. У 1890 г. у сяле 349 дзесяцін зямлі. Побач знаходзіўся аднайменны маёнтак, уладанне Восіпа Трашынскага, 237,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. сяло, 62 двары, 398 жыхароў, прыходская царква, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, піцейны дом. У маёнтках: Бяроза - 29 жыхароў, Божы Дар (ці Бяроза) - 7 жыхароў. У 1905 г. у сяле 471 жыхар, у маёнтку Бяроза - 46. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства. Бяроза, вёска, 79 дамоў, 358 жыхароў, і фальварак, 2 дамы, 8 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа і тэатральны гуртак. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940

г. у Яроміцкім, з 19.7.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. у вёсцы 111 двароў, 507 жыхароў; у былым маёнтку - 2 двары, 10 жыхароў. У 1950 г. 45 вясковых гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Сцяг Перамогі» (старшыня В. Дземянчук). На 1.1.1999 г. 119 двароў, 244 жыхары, магазін, бібліятэка, базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, у складзе калгаса «Перамога» (з 2004 СВК "Пакроўскі", цэнтр – в. Бухавічы). 103 гаспадаркі, 205 жыхароў (2005).

Помнікі архітэктуры - цэрквы Ільінская (1863) і Крыжа-ўзвіжанская (1864).

Помнік 46 землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Бяроза** //Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.127-128.

**Бяроза** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С 570.

## *Вёсцы Грушава – 610 гадоў*

**Грушава** (мясцовая назва Грушово) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце. Вядома з XV ст. як сяло Кобрынскага княства ВКЛ. У 1404 г. упамінаецца ў лісце князя Вітаўта сярод іншых населеных пунктаў, якія ён аддаў князю Раману Фёдаравічу (родапачынальнік князёў Кобрынскіх). Жонка князя Сямёна Раманавіча княгіня Ульяна завяшчала пасля сваёй смерці палац Чаравачыцы і сяло Грушава дачцэ Ганне (жонка Фёдара Бельскага). 22.8.1495 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр выдаў княгіні Ганне пацвярджэнне на гэтыя землі. З 1519 г. пасля смерці Ганны сяло знаходзілася ва ўладанні яе другога мужа маршалка ВКЛ Вацлава Касцевіча, з 1532 г. у Кобрынскай эканоміі, уладанне каралевы Боны. У 1-й палове XVI ст. паміж вёскамі Кобрынскай эканоміі Іласк, Бярозна і Грушава знаходзілася



«добра» зямян грушаўскіх - Еські Аляхновіча з братамі. У 1563 г. сяло ў Грушаўскім войтаўстве воласці Гарадзецкага двара Кобрынскай эканоміі, 23 двары, 24 валокі зямлі (зямля дрэннай якасці), сярод іх 1 валока вольная была дадзена на войта І. Ільяшэвіча; сярод гаспадароў Грушава было 2 лаўнікі. Меліся царква з сядзібай святара С. Грыцковіча (на царкву 3 валокі зямлі) і млын (млынар А. Ансаповіч). У 1668 г. вёска той жа эканоміі, у якой Д. Валовіч атрымаў 6 валок зямлі. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1886 г. сяло Іласкай воласці, 78 двароў, 917 жыхароў, царква (у 1888 г. 3206 вернікаў), піцейны дом, Іласкае валаснoе праўленне. У 1890 г. у сяле 1344,25 дзесяціны зямлі. Побач знаходзіўся маёнтак Грушава, уладанне Генрыха Радзевіча, 1741 дзесяціна зямлі (разам з ляснымі дачамі Студзенка, Белалессе). У маёнтку пэўны час жыла вядомая польская пісьменніца Марыя Радзевіч. У 1897г. сяло, 175 двароў, 1040 жыхароў, хлебазапасны магазін, царква, маёнтак, 7 двароў, 76 жыхароў, вінакурны завод, кузня, 2 вінныя склепы. У 1905 г. сяло, 1065 жыхароў, народнае вучылішча (у 1905/06 навучальным годзе было 100 хлопчыкаў, 3 дзяўчынкі), у маёнтку Грушава 47 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска - 101 двор, 431 жыхар, і фальварак - 5 двароў, 39 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Худлінскім сельсавеце, з 16.7.1954 г. цэнтр сельсавета, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне, з 21.1.1961 г. у Гарадзецкім сельсавеце. У 1940 г. у вёсцы 877 жыхароў, працавала МТС (5 трактароў, 2 аўтамашыны), у былым маёнтку 11 коней, 23 каровы. У 1948 г. 12 гаспадарак аб'ядналіся ў калгас імя Леніна (старшыня С.Жаглей). На 1.1.1999 г. 224 двары, 599 жыхароў, сельскі клуб, бібліятэка, базавая школа, дзіцячы сад, 3 магазіны, у складзе калгаса-камбіната імя Дзяржынскага (у 2004 ААТ "Гарадзец-Агра", цэнтр – в. Гарадзец). 263 гаспадаркі, 514 жыхароў (2005).

Парк XVII ст.

Помнік на магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені

1944 г. пры вызваленні вёскі, ён ушаноўвае таксама памяць 37 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Грушава** //Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007.- Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.137-138.

**Грушава** //Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск, 1971. - Т.4. – С.47.

**Грушава** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С 575-576.

**Жук, Е.** Там, где дуб Девайтис шумит…: [об усадьбе Родзевичей в д. Грушево ] /Елена Жук //Вечерний Брест. – 2012. - 18 июля. – С.7.

**Панасюк, М.** Перад гасцямі не будзе сорамна: [Гарадзецкі сельскі савет рыхтуецца да 600-годдзя в. Грушава] /М. Панасюк //Белорусская нива. – 2004. – 15 июля. – С.1.

**Пятроўская, М.** У Грушаве адзначылі юбілей: [600-годдзе з часу першага ўпамінання аб вёсцы] / Марыя Пятроўская //Кобрынскі веснік. – 2004. – 25 жніўня. – С.2.

**Федорук, А.Т.** Грушево /А.Т. Федорук //Старинные усадьбы Берестейщины /А.Т. Федорук, ред. Т.Г. Мартыненко. – Минск: Беларуская энцыклапедыя, 2004. – С. 355-360.

## *Вёсцы Імяніны – 495 гадоў*




**Імянін** (мясцовая назва Мнянын) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Кобрынскі». У 1519 г. маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. Вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Жыгімонт І Стары сваёй граматай пацвердзіў правы баярына кобрынскага Некраша Сямёнавіча Качаноўскага на вечнае ўладанне 2 часткамі маёнтка Імянін і сяла Байкавічы (знаходзілася каля Імяніна), таксама уладар маёнтка атрымаў землі за службу ў князя Івана Сямёнавіча Кобрынскага каля 1459 г. У 1559 г. маёнтак ва ўладанні пана Льва Некрашэвіча і 4

братоў Ждановічаў. У 1563 г. маёнтак і сяло каля г. Кобрын у Брэсцкім ваяводстве; у 1693 г. маёнтак. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Стрыгаўскай воласці, 737 дзесяцін зямлі. Каля вёскі знаходзіўся аднайменны маёнтак, уладанне С. Навамейскага, 951 дзесяціна зямлі; пры вёсцы розныя ўладальнікі мелі 71 дзесяціну зямлі. У 1897 г. вёска, 73 двары, 483 жыхары, хлебазапасны магазін; 2 дамы для рабочых (Імянін), 63 і 7 жыхароў; 3 маёнткі, уладанні Валянціны, Адольфа і нашчадкаў Ільі Стэфаноўскіх - адпаведна 21, 1 і 2 жыхары. У 1905 г. вёска, 621 жыхар, і маёнтак, 97 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 74 двары, 469 жыхароў, і фальварак, 5 двароў, 118 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа і чытальня. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Лепясоўскім, з 30.10.1959 г. у Яроміцкім, з 19.7.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. хутары Імянін налічвалі 145 двароў, 760 жыхароў, былы маёнтак - 3 двары, 8 жыхароў. У 1946 г. працавала сямігадовая школа. У 1950 г. 35 вясковых гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Краіна Саветаў». На 1.1.1999 г. 270 двароў, 706 жыхароў, адміністрацыйны будынак калгаса, магазін, бібліятэка, дзіцячы сад, музычная і сярэдняя школы. 268 гаспадарак, 708 жыхароў (2005г.).

Мемарыяльная дошка на будынку школы ў гонар Б.М.Сурына, камандзіра 123-га авіяцыйнага знішчальнага палка.

**Імянін** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2. Брэсцкая вобласць. - С.150.

**Імянін** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 583-584.

**Імяніны** //Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск, 1971. - Т.5. – С.77.

**Федорук, А.Т.** Именин /А.Т. Федорук //Старинные усадьбы Берестейщины /А.Т. Федорук, ред. Т.Г. Мартыненко. – Минск: Беларуская энцыклапедыя, 2004. – С.502-503.

## *Вёсцы Ляскова – 455 гадоў*

**Ляскова** (мясцовая назва Лыскова) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1559 г. маёнтак і сяло Ляскоўскае, у Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанне Рыгора і Фёдара Аглядовічаў. У 1629 г. маёнтак, уладанне Ляскоўскіх, у Брэсцкім ваяводстве. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Стрыгаўскай воласці, 148 дзесяцін зямлі; ваколіца, 66,5 дзесяціны зямлі, і 3 маёнткі, уладанні: В.Ляскоўскага, 144,5 дзесяціны зямлі, К. Стэфаноўскай, 121 дзесяціна зямлі, Франкоўскага, 145,5 дзесяціны зямлі (маёнтак Ляскова-Лягаты). У 1897 г. у вёсцы 42 двары, 279 жыхароў, хлебазапасны магазін; у ваколіцы (вёска) 10 двароў, 65 жыхароў, 2 кузні, сталярная і калёсная майстэрні. Побач знаходзіліся 3 маёнткі Ляскова - адпаведна 17, 7 і 4 жыхары. Жылы дом Ляскова (Мелехава) налічваў 11 жыхароў. У 1905 г. вёска, 291 жыхар, і маёнтак, 18 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 66 двароў, 374 жыхары, і фальварак, 1 двор, 20 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Яроміцкім, з 19.7.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. у вёсцы 76 двароў, 450 жыхароў, у былым фальварку 2 двары, 25 жыхароў. На 1.1.1999 г. 90 двароў, 215 жыхароў, у складзе калгаса «Перамога» (з 2004 СВК "Пакроўскі", цэнтр – в. Бухавічы). 71 гаспадарка, 172 жыхары (2005).

На заходняй ускраіне вёскі пахаваны рускія воіны, якія загінулі на Кобрыншчыне 13.7.1812 г. у баях з напалеонаўскімі войскамі. У 1986 г. на магіле насыпаны курган і пастаўлена стэла.

**Ляскова** //Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.163-164.

**Ляскова** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.592.

## *Вёсцы Мінянка – 415 гадоў*

**Мінянка** (мясцовая назва Міненка) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Звязда». Упамінаецца ў 1599 г. У 1890 г. у Падалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 290,5 дзесяціны зямлі, пасёлак, 7,5 дзесяціны зямлі (розныя ўладальнікі). У 1897 г. 44 двары, 290 жыхароў, хлебазапасны магазін, кузня. У 1905 г. 352 жыхары. У 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 34 двары, 172 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Яроміцкім, з 19.7.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. хутары, 69 двароў, 246 жыхароў. У 1950 г. 42 гаспадаркі аб’ядналіся ў калгас імя Куйбышава. На 1.1.1999 г. 83 двары, 180 жыхароў, магазін, клуб, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, сярэдняя школа, адміністрацыйны будынак калгаса «Звязда» (з 2004 СВК “Мінянскі”). Дзейнічаюць магазін, клуб, дзіцячы сад, фельчаркска-акушэрскі пункт, бібліятэка, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі. 66 гаспадарак, 150 жыхароў (2005г.).

**Мінянка** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007.- Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.168.

**Мінянка** //Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск, 1973. - Т.7. – С.254.

**Мінянка** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.595.

## *Вёсцы Навасадкі – 225 гадоў*

**Навасадкі** (мясцовая назва Новосадкы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1789 г. у Азяцкім ключы Брэсцкай эканоміі ВКЛ, вёска, 4 валокі зямлі, 8 двароў, 44 жыхары, бровар, карчма (на арэндзе з 1709). З 1795 г. у складзе Расійскай

імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1897 г. вёска ў Верхалескай воласці, 9 двароў, 75 жыхароў, ветраны млын, 221 дзесяціна зямлі (1890). У 1905 г. 132 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Навасёлкаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 10 двароў, 60 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 30.10.1959 г. у Верхалескім сельсавеце, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 29 двароў, 106 жыхароў. На 1.1.1999 г. 18 двароў, 21 жыхар, у складзе калгаса «Сцяг Перамогі» (з 2004 СВК "Раданежскі", цэнтр – в. Корчыцы). 8 гаспадарак, 9 жыхароў (2005).




**Навасадкі** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007.- Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.170.

**Навасадкі** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.596.

## *Вёсцы Падалессе – 415 гадоў*

**Падалессе** (мясцовая назва Подоліссе) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1599 г. У 1890 г. у Падалескай воласці (цэнтр воласці ў в. Яромічы) Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 127,5 дзесяціны зямлі (разам з в. Плянта), пасёлак, 19 дзесяцін зямлі, і ваколіца, 178 дзесяцін зямлі. У 1897 г. у вёсцы 26 двароў, 173 жыхары, хлебазапасны магазін, кузня. У 1905 г. 176 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, цэнтр Падалескай гміны Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 32 двары, 176 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Яроміцкім, з 19.7.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. хутары, 51 двор, 157 жыхароў. На 1.1.1999 г. 31 двор, 78 жыхароў, у складзе калгаса «Перамога» (з 2004 СВК

“Пакроўскі”, цэнтр – в. Бухавічы). 29 гаспадарак, 67 жыхароў (2005).

**Падалессе** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007.- Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.173-174.

**Падалессе** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.598-599.

## *Вёсцы Паляцічы – 455 гадоў*

**Паляцічы** (мясцовая назва Полятычы) - вёска ў Батчынскім сельсавеце. Вядомы з XVI ст. як сяло і маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак, ва ўладанні В.Ц.Варашылы. У 1563 г. сяло, у Паляціцкім войтаўстве Кобрынскай эканомі, 17 валок зямлі, 17 двароў, у 1597 г. у Батчынскім войтаўстве Кобрынскага староства, 17 валок зямлі, карчма. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска, 120 дзесяцін зямлі, і маёнтак, уладанне І.Рынкевіча, 542,5 дзесяціны зямлі (з лесам у Пружанскім павеце). У 1897 г. 13 двароў, 115 жыхароў, хлебазапасны магазін, былая карчма (3 жыхары), у маёнтку 32 жыхары. У 1905 г. вёска, 131 жыхар, і маёнтак, 22 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, у вёсцы 17 двароў, 143 жыхары, у фальварку 4 двары, 38 жыхароў. У 1922 г. у вёсцы была створана падпольная камуністычная арганізацыя. Ячэйкі падпольшчыкаў дзейнічалі ў вёсках Батчы, Варатынічы, Іласк, Корчыцы, Тэўлі і інш. У 1925 г. жыхары вёскі ўдзельнічалі ў першамайскай дэманстрацыі ў Кобрыне, 25.2.1931 г. - у дэманстрацыі ў гонар Міжнароднага дня беспрацоўных, 8.11.1931 г. - у дэманстрацыі ў в. Літвінкі і інш. У 1935-1937 гг. у в. Паляцічы размяшчаўся Кобрынскі РК КПЗБ. Жыхары вёскі І.Какала, Г.Смольскі, Р.Глек у розны час з’яўляліся сакратарамі Кобрынскіх райкомаў КПЗБ і КСМЗБ. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Батчынскім сельсавеце. У 1940 г. вёска, 37 двароў, 187 жыхароў, і былы маёнтак, 4 двары, 12

жыхароў. У былым маёнтку быў арганізаваны калгас імя Варашылава. У 1947 г. калгас адноўлены (старшыня калгаса С.М.Трус); абслугоўваўся Кобрынскай МТС. На 1.1.1999 г. 92 двары, 288 жыхароў, бібліятэка, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, у складзе аграфірмы-калгаса «Патрыкі». У 2004 г. вёска далучана да ААТ “Кобрынская птушкафабрыка”. Працуюць бібліятэка, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая. 91 гаспадарка, 281 жыхар (2005г.).

Вайсковыя могілкі часоў 1-й сусветнай вайны, помнік на ўшанаванне памяці чырвонаармейцаў, якія загінулі ў час савецка-польскай вайны 1920 г. у баях каля вёскі.


**Паляцічы** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2. Брэсцкая вобласць. - С.175-176.

**Паляцічы**// Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.599.

**Федорук, А.Т.** Полятичи /А.Т. Федорук //Старинные усадьбы Берестейщины /А.Т. Федорук, ред. Т.Г. Мартыненко. – Минск: Беларуская энцыклапедыя, 2004. – С.500-501.


## *Вёсцы Патрыкі – 455 гадоў*




**Патрыкі** - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1559 г. сяло і маёнтак Патрыкавічы ў Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанні Я.С. Мрочкавіча са стрыечнымі братамі. У 1563 г. у Патрыкаўскім войтаўстве Кобрынскай эканоміі, сяло, 21 валока зямлі, 21 двор. У 1597 г. у Кобрынскім старостве, 21 валока зямлі, з якіх 1 валока вольная была аддадзена пушкару Кобрынскага замка. У 1712 г. вёска ў Чаравачыцкім ключы Кобрынскай эканоміі, 2 валокі зямлі ў ёй аддадзены пану Урбанскаму, 1,3 валокі - пану Ягалкоўскаму. У 1742 г. сяло, 14 валок зямлі, і маёнтак Патрыкі (ці Мрочкі). У 1786 г. у сяле 21 валока, 175 маргоў зямлі. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай

губерні. У 1890 г. вёска, 256,5 дзесяціны зямлі, у Прускаўскай воласці. Побач з вёскай знаходзіліся 4 аднайменныя маёнткі, уладанні: К.Савіцкага, 149 дзесяцін зямлі; К. Масальскага, 251,5 дзесяціны зямлі; М.Няцэцкага, 72 дзесяціны зямлі; К.Радавіцкай, 600 дзесяцін зямлі. У 1897 г. у вёсцы 32 двары, 202 жыхары, хлебазапасны магазін, ветраны млын з жылым домам (11 жыхароў), у 4 маёнтках - 28, 45, 4 і 29 жыхароў. Пры Маскоўска-Варшаўскай шашы меліся: ахоўны дом № 16 Патрыкі, 5 жыхароў; старожка Патрыкі, 3 жыхары. У 1905 г. існавалі: вёска, 232 жыхары, будка пры шашы, 5 жыхароў, 4 маёнткі - 16, 21, 23 і 8 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 19 двароў, 158 жыхароў, і 4 фальваркі, 5 двароў, 41 жыхар. У 1930-я гады працавала школа, праводзіліся нядзельныя чытанні. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Пескаўскім, з 16.7.1954 г. у Пецькаўскім, з 18.12.1972 г. у Хідрынскім сельсаветах. У 1940 г. вёска, 53 двары, 300 жыхароў, пачатковая школа, і былыя 4 маёнткі Патрыкі, 27 двароў, 190 жыхароў. На 82 га тэрыторыі былых маёнткаў арганізавана прыгарадная гаспадарка Кобрынскага гарпрамхарчгандлю. У 1947 г. дзейнічаў саўгас «Патрыкі» (дзяржпітомнік), у 1948 г. арганізаваны калгас імя 17 Верасня. На 19.9.1948 г. калгас налічваў 55 гаспадарак, 40 коней, 31 павозку, 34 плугі, 52 бараны, 5 конных малатарань, каля 195 га ворыўнай зямлі (старшыня калгаса К.Р. Грынюк). На 1.1.1999 г. 171 двор, 470 жыхароў, клуб, бібліятэка, магазін, школа-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, у складзе аграфірмы «Беларусь» ( з 2004 г. СВК "Вербнае", цэнтр – в. Пескі). 166 гаспадарак, 482 жыхары (2005г.).

У в. Патрыкі нарадзіўся беларускі мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі М.І. Кузьміч.

Помнік на ўшанаванне памяці 34 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Патрыкі** //Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.176.

**Патрыкі** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. – Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.600.

## *Вёсцы Прылукі Вялікія - 455 гадоў*

**Прылукі Вялікія** (мясцовая назва Прылукы Вылыкы) - вёска ў Астроміцкім сельсавеце. У XVI ст. маёнтак і сяло ў Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак знаходзіўся ва ўладанні М. Лазаровіча з братамі. У 1571 г. сяло Прылукі, каралеўская маёмасць у Брэсцкім ваяводстве. У 1669 г. кароль польскі Міхал Вішнявецкі пацвердзіў прывілей на сяло Брэсцкаму езуіцкаму калегіуму. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. у Залескай воласці, вёска, 137,2 дзесяціны зямлі, 3 маёнткі, уладанні А. Манцэвіча, 649,5 дзесяціны зямлі (разам з фальваркам Асташава); І. Урсын-Нямцэвіча, 188,5 дзесяціны зямлі (разам з фальваркам Асташава); С. Скіндэра, 59,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. у вёсцы 16 двароў, 121 жыхар, хлебазапасны магазін; у пасёлку Наваселіцы (Прылукі) 13 двароў, 97 жыхароў, на хутары Асташава (Прылукі) 36 жыхароў; у 2 маёнтках Прылукі 4 жыхары. У 1905 г. вёска, 144 жыхары, маёнтак, 95 жыхароў, і фальварак, 5 жыхароў. З 1921 г. вёска Прылукі Вялікія ў складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 11 двароў, 60 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Закросніцкім, з 16.7.1954 г. у Залескім сельсаветах. У 1940 г. 22 двары, 102 жыхары. У 1948 г. арганізаваны калгас імя Чапаева. На 1.1.1999 г. 23 двары, 55 жыхароў, у складзе калгаса імя Мічурына. 19 гаспадарак, 44 жыхары (2005 г.).

**Прылукі Вялікія** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С.180-181.

**Прылукі Вялікія** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.603.

## *Вёсцы Худлін – 515 гадоў*

**Худлін** - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1499-1500 гг. У 1563 г. Ходлін, у Грушаўскім войтаўстве Гарадзецкага двара Кобрынскай эканоміі ВКЛ, сяло, 16 валок зямлі, 13 двароў, з іх 3 гаспадары-буднікі (на Палессі развозчыкі тавараў). У 1786 г. у Брэсцкай эканоміі, сяло, 16 валок зямлі. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. у Зелаўскай воласці, сяло, 360,5 дзесяціны зямлі, і маёнтак, уладанне І.Мітрашэўскага, 276 дзесяцін зямлі. У 1897 г. вёска (пры паштовым шляху Кобрын - Пінск і лініі Палескіх чыгунак), 67 двароў, 420 жыхароў, школа граматы, хлебазапасны магазін, маёнтак, 11 двароў, 72 жыхары. У 1905 г. у вёсцы 483 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Гарадзецкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 31 двор, 192 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета, з 16.7.1954 г. у Грушаўскім, з 21.1.1961 г. у Гарадзецкім сельсаветах, з 8.8.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. у вёсцы 109 двароў, 372 жыхары, пачатковая школа, кааператыўны магазін, сельсавет, арганізаваны калгас імя 6-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР (55 коней, 80 галоў буйной рагатай жывёлы). У 1949 г. 52 гаспадаркі аб’ядналіся ў калгас імя Шверніка. На 1.1.1999 г. 51 двор, 116 жыхароў, магазін, у складзе калгаса-камбіната імя Дзяржынскага (з 2004 ААТ “Гарадзец-Агра”, цэнтр – в. Гарадзец). 49 гаспадарак, 108 жыхароў (2005г.).

Радзіма ўдзельніка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, аднаго з арганізатараў партызанскага руху на Кобрыншчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны М.Ц. Шыша (загінуў у баі ў 1942 г.). У 1974 г. на ўшанаванне памяці Шыша ў цэнтры вёскі пастаўлена стэла.

**Худлін** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007.- Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С. 193.

**Худлін** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.612.

## *Вёсцы Ягалкі – 455 гадоў*

**Ягалкі** (мясцовая назва Яголкы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1559 г. маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанне С.Слібоўскага. Паводле вайсковага перапісу 1567 г., маёнтак шляхецкага роду Кісловічаў. У 1631 г. у Брэсцкім ваяводстве. У 1749 г. Ягалкі называлі таксама Кіслыя, Верхава, Кружына і Хадынічы. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. у Прускаўскай воласці, вёска, 66 дзесяцін зямлі, маёнтак, уладанне Р.Кяскевіча, 130 дзесяцін зямлі, і ваколіца, 329,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. вёска, 11 двароў, 80 жыхароў, выселак, 4 жыхары, маёнтак, 5 жыхароў, 3 ваколіцы, 89 жыхароў. У 1905 г. ваколіца, 85 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 26 двароў, 147 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Хідрынскім, з 16.7.1954 г. у Пецькаўскім, з 18.12.1972 г. зноў у Хідрынскім сельсаветах. У 1940 г. 35 двароў, 169 жыхароў. На 1.1.1999 г. 1 двор, 1 жыхар, у складзе калгаса «Зара» (у 2004 г. СВК “Узыходзячая зара”, цэнтр – в. Хідры). 1 гаспадарка, 1 жыхар (2005 г.).

**Ягалкі** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С. 197.

**Ягалкі** //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.615.

## *Вёсцы Яромічы – 415 гадоў*

**Яромічы** (мясцовая назва Еромычы) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, за 12 км ПнУ ад горада і чыгуначнай станцыі Кобрын., 58 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па аўтадарозе Кобрын – Івацэвічы.

Упамінаюцца ў 1599 г. У 1886 г. у Падалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 11 двароў, 131 жыхар, 201 дзесяціна зямлі (на 1890), школа. У 1897 г. 29 двароў, 174 жыхары, валаснное праўленне, хлебазапасны магазін, кузня, піцейны дом, Падалескае народнае вучылішча, у якім у 1889/90 навучальным годзе вучыліся 64 хлопчыкі, у 1892/93г. - 63 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі, у 1905/06 г. - 69 хлопчыкаў, 9 дзяўчынак. У 1905 г. 178 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства. У 1930-я гады працавалі школа і вячэрнія курсы. З 1939 г. у БССР, з 15.1.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета, з 19.7.1976 г. у Буховіцкім сельсавеце. У 1940 г. 60 двароў, 188 жыхароў, МТС, няпоўная сярэдняя школа, сельпо, магазін, хата-чытальня, паштовае аддзяленне, амбулаторыя, сельсавет. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі зчэрвеня 1941 г. да ліпеня 1944 г. У 1949 г. 30 гаспадарак аб’ядналіся ў калгас «Свабода» (старшыня Р.М. Давыдзюк).

На 1.1.1999 г. 271 двор, 840 жыхароў, магазін, дзіцячы сад, амбулаторыя, бібліятэка, у складзе калгаса «Перамога» (з 2004г. СВК “Пакроўскі”, цэнтр – в. Бухавічы). 263 гаспадаркі, 682 жыхары (2005г.).

Помнік архітэктуры - Міхайлаўская царква (1784) з цаглянай брамай.

Магіла ахвяр фашызму.

**Яромічы** //Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя /рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск: БелЭн, 2007. - Т.4, кн.2.Брэсцкая вобласць. - С. 197-198.

**Яромічы** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.615.

# Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння І.У. Анціпаровіча*



**Анціпаровіч Іван Усцінавіч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. Мельнікі Кобрынскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1915 г. закончыў царкоўна-прыходскуго школу ў в. Чаравачыцы. У тым жа годзе ў сувязі з 1-й сусветнай вайной як бежанец апынуўся ў Сімбірскай губерні. Яго бацька быў прызваны ў армію, а Іван з 12 гадоў пачаў працаваць у рамонтных майстэрнях на чыгунцы. У 1922 г. сям'я Анціпаровічаў вярнулася на радзіму, у Заходнюю Беларусь. Іван Усцінавіч працаваў на гаспадарцы бацькоў, па найме ў памешчыкаў. У 1923 г. яго прызвалі ў польскую армію, у якой ён праслужыў год. Вярнуўшыся дадому, зноў працаваў па найме, пачаў знаёміцца з рэвалюцыйнай літаратурай. У 1925 г. Іван уступіў у КПЗБ і стаў тэхнікам камуністычнай ячэйкі. Яго абавязкам было распаўсюджванне літаратуры і лістовак, напісанне і вывешванне транспарантаў і лозунгаў. За ўдзел у арганізацыі дэманстрацыі ў в. Чаравачыцы ў 1926 г. быў арыштаваны і зняволены ў турму, у якой прасядзеў 10 месяцаў. Аднак з-за недаказанасці віны яго адпусцілі. У 1927 г. Іван Анціпаровіч зноў быў арыштаваны за ўдзел у дэманстрацыі ў в. Літвінкі. Пінскі акруговы суд прыгаварыў яго да двух гадоў турэмнага зняволення. Пасля адбыцця пакарання Іван вярнуўся ў родную вёску і зноў уключыўся ў рэвалюцыйную барацьбу. У маі 1930 г. яго прызначылі рэдактарам райкома КСМЗБ. 27 ліпеня 1930 г. польскія ўлады трэці раз арыштавалі Анціпаровіча, і ў 1931 г. ён быў прыгавораны да 7 гадоў турмы. Пакаранне Іван адбываў у польскім горадзе Вронкі, дзе прасядзеў у адзіночнай камеры да амністыі 3 студзеня 1936 г. З прыходам Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 г. Іван Усцінавіч перабраўся ў Кобрын, дзе ўдзельнічаў у наладжванні работы органаў кіравання, арганізацыі народнай міліцыі. У міліцыі ён і застаўся працаваць

сакратаром да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У чэрвені 1941 г. Анціпаровіч быў эвакуіраваны ў савецкі тыл, дзе служыў у органах унутраных спраў спачатку ў Яльцы, а з 1943 г. - у Бранску. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вярнуўся ў Кобрын. Да 1953 г. працаваў у Кобрынскім РАУС, а калі выйшаў на пенсію - на ткацкай фабрыцы. Памёр у 1993 г.

**Анціпаровіч** Іван Усцінавіч//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.113-114: фат.

### *Да 75-годдзя з дня нараджэння Н.В. Амельянюк*

**Амельянюк Ніна Васільеўна** нарадзілася ў 1939 г. у в. Лешня Капыльскага раёна. Закончыла гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай у в. Азяты, у вячэрняй школе і СШ № 1 Кобрына. У 1979 -1982 гг. завуч, у 1982 -1996 гг. дырэктар СШ №1 Кобрына. Выбіралася дэпутатам гарадскога Савета. Званне “Заслужаная настаўніца БССР” прысвоена ў 1978 г.

**Амельянюк** Ніна Васільеўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.429.

### *Да 95-годдзя з дня нараджэння І.І. Арлова*



**Арлоў Іван Іванавіч** нарадзіўся ў 1919 г. у в. Бабакава Іванаўскай вобласці, Расія. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Чырвоную армію, у першыя дні вайны апынуўся ў акружэнні і застаўся на тэрыторыі Кобрынскага раёна. Ужо восенню былыя чырвонаармейцы пачалі збіраць зброю, а вясной 1942 г. арганізавалі групу, якая называла сябе чапаеўцамі, узначаліў яе І.І. Арлоў, пазней яна стала першым на Кобрыншчыне партызанскім атрадам імя Чапаева. 27 красавіка 1943 г. у час правядзення аперацыі па

падрыве моста каля в. Жухаўцы ў баі супраць гітлераўцаў І.І.Арлоў быў цяжка паранены ў галаву, схоплены і дастаўлены акупантамі ў Кобрын, дзе і памёр. У студзені 1944 г. на базе атрада імя Чапаева была створана партызанская брыгада імя Чапаева, а аднаму з атрадаў прысвоена імя Арлова.

**Арлоў** Іван Іванавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.-С.213-214 : фат.

### *Да 95-годдзя з дня нараджэння М.А. Астравуха*

**Астравух Мікалай Антонавіч** нарадзіўся ў 1919 г. у Мінскай вобласці. У 1940 г. прыехаў у Дзівінскі раён, працаваў старшынёй Павіццеўскага сельсавета, пазней - старшынёй Павіццеўскага сельскага спажывецкага таварыства. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у арганізацыі партызанскіх атрадаў, быў сувязным. У 1943 г. стаў партызанам-разведчыкам. Восенню 1943 г. загінуў пры выкананні задання.

**Астравух** Мікалай Антонавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.219.

### *Да 60-годдзя з дня нараджэння С. Дз. Ашмянцава*



**Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч** нарадзіўся ў 1954 г. у в. Рай Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1978). Працаваў загадчыкам гаража, галоўным інжынерам аўтапрадпрыемства Кобрынскай райсельгастэхнікі. У 1979-1990 гг. - намеснік старшыні па аўтатранспарце Кобрынскай райсельгастэхнікі, інструктар, загадчык сельскагаспадарчага аддзела Кобрынскага гаркама КПБ. У 1990-1995 гг. - старшыня калгаса імя Суворава Кобрынскага раёна. У 1995-2002 гг. працаваў старшынёй Кобрынскага райвыканкама, з 2002 г. - намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама.

**Ашмянцаў** Сяргей Дзмітрыевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.449: фат.

## *Да 100-годдзя з дня нараджэння Ф.М. Баранава*



**Баранаў Фёдар Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1914 г. Кадравы афіцэр Чырвонай арміі, служыў у Брэсцкай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў у акружэнне пад Баранавічамі. Не маючы магчымасці выйсці з варожага тылу, разам з іншымі ваеннаслужачымі арганізаваў партызанскую групу, якая першапачаткова налічвала 12 чалавек. У маі 1942 г. група прыбыла ў Булінскі лес у Слонімскім раёне, дзе аб’ядналася з групай А.П.Огнева і была ўключана ў асобны атрад імя Шчорса 54-й групай (ротай). У красавіку 1943 г. паводле загаду штаба партызанскага злучэння Брэсцкай вобласці 54-я група пераўтворана ў самастойны атрад імя Суворава. З ліпеня да снежня 1943 г. Ф.М. Баранаў быў начальнікам штаба гэтага атрада. Са снежня 1943 г. начальнік штаба брыгады імя Дзяржынскага, якая дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Бярозаўскага, Косаўскага і Целяханскага раёнаў. У маі - ліпені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя Чапаева, якая дыслацыравалася ў Дахлаўскім лесе і дзейнічала ў Кобрынскім і часткова Антопальскім раёнах. Брыгада прымала ўдзел у вызваленні Кобрынскага раёна. Узнагароджаны 3 ордэнамі. Пасля вайны жыў і працаваў у Маскве.

**Баранаў** Фёдар Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.214-215: фат.

## *Да 35-годдзя з дня нараджэння І.Г. Барадзіч*

**Барадзіч Інга Генадзеўна**, спартсменка. Нарадзілася ў 1979г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па плаванні.

Удзельніца Алімпійскіх гульняў у Атланце, неаднаразовая чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь па плаванні.

**Бародзіч** Інга Генадзеўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.432.

### *Да 115-годдзя з дня нараджэння Дз. С. Барысюка*



**Барысюк Дзмітрый Сцяпанавіч** нарадзіўся ў 1899 г. у в. Турная Кобрынскага раёна. У час 1-й сусветнай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі. З 1917 г. па 1922 г. у Чырвонай арміі. У 1923 г. вярнуўся ў в. Турная. Член КПЗБ з 1925 г. За ўдзел у падпольнай барацьбе супраць акупацыі Польшчай Заходняй Беларусі быў арыштаваны і зняволены ў Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер. У Вялікую Айчынную вайну пры актыўным удзеле Дз.С. Барысюка ў ліпені 1941 г. створаны Турнянскі антыфашысцкі камітэт, які падтрымліваў сувязь з усімі партызанскімі атрадамі, што дзейнічалі на тэрыторыі Кобрынскага раёна, а таксама з атрадам імя Суворава Пінскага партызанскага злучэння. Дз.С. Барысюк загінуў 13.03.1943 г. у час выплаўкі толу са снарада. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

**Барысюк** Дзмітрый Сцяпанавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.86, 219: фат.

### *Да 100-годдзя з дня нараджэння А.К. Букрабы*

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** нарадзіўся ў 1914 г. у в. Навасёлкі ў сялянскай сям'і. Удзельнік Кобрынскага (Навасёлкаўскага) узброенага выступлення сялян 1933 г. Асуджаны на 10 гадоў. Пакаранне адбываў у турмах Кобрына, Седльцаў, Вільні, Равіча. У верасні 1939 г. вярнуўся на радзіму. У 1940-1941 гг. сакратар Навасёлкаўскага валаснога выканкама, дырэктар школы. У Вялікую Айчынную вайну партызан атрада імя

Суворава, у жніўні 1943 - сакавіку 1944 г. камісар атрада імя Арджанікідзе брыгады імя Молатава. Служыў у польскім штабе партызанскага руху (з 1944). Пасля вайны працаваў намеснікам старшыні Дзівінскага, старшынёй Дзівінскага, Пружанскага і Антопальскага райвыканкомаў, 1-м сакратаром Шарашоўскага і Пружанскага райкомаў КП(б)Б. Са студзеня 1963 г. старшыня Брэсцкага аблсаўпрофа. З верасня 1965 г. і да выхаду на пенсію (1975) - старшыня парткамісіі пры Брэсцкім абласным камітэце КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам ПНР «Віртуці Мілітары» (залаты крыж) і інш. Памёр у 1977 г.

**Букраба** Аляксандр Кірылавіч //Памяць:гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.214.

### *Да 85-годдзя з дня нараджэння А.М.Булавіцкага*



**Булавіцкі Аляксандр Мікалаевіч** нарадзіўся 28 кастрычніка 1929 г. у в. Чахец Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці Працаваў настаўнікам. У 1954-1966 гг.- інструктар Пружанскага райкома, Брэсцкага абкома, 1-ы сакратар Шарашоўскага, Кобрынскага райкомаў ЛКСМБ, старшыня калгаса «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна. У 1966-1968 гг. старшыня Кобрынскага райвыканкама. З 1968 г. старшыня калгаса «Сцяг Перамогі» Кобрынскага раёна, з 1981 г. старшыня Гарадзецкага міжгаспадарчага аб’яднання, з 1982 г. старшыня калгаса-камбіната імя Ф.Э.Дзяржынскага. Першы старшыня Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1985-1990 гг., выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, іншымі ўзнагародамі.

**Булавіцкі** Аляксандр Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.450: фат.

**Булавіцкі** А.М. (старшыня калгаса імя Дзяржынскага) //Дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР: Адзінаццатае скліканне. – Мінск, 1985. – С.121.

## *Да 60-годдзя з дня нараджэння В.А. Бялінскага*

**Бялінскі Віталь Андрэевіч** нарадзіўся 5 жніўня 1954 г. у в. Даўганосы Ковельскага раёна Валынскай вобл., Украіна. Закончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (1976). Працаваў майстрам ПМК-80 трэста «Слуцксельбуд», майстрам, прарабам, старшым прарабам будупраўлення № 31 у Пінску. З 1984 г. начальнік лабараторыі будтрэста № 2 Пінска, з 1986 г. інструктар Пінскага гаркома КПБ. Потым кіраваў жыллёва-камунальнай гаспадаркай (ЖКГ) Пінска, з 1997 г. першы намеснік начальніка вытворчага ўпраўлення ЖКГ Брэсцкага аблвыканкома. З 17.4.2001 г. да лютага 2002 г. - старшыня Кобрынскага гарвыканкама.

**Бялінскі** Віталь Андрэевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.450.

## *Да 115-годдзя з дня нараджэння В.І. Вайткоўскай*



**Вайткоўская Варвара Ігнацьеўна** нарадзілася 4.12.1899 г. Закончыла Екацярынаслаўскую жаночую гімназію (1918). У чэрвені 1940 г. - чэрвені 1941 г. супрацоўнік рэдакцыі чырвонаармейскай газеты «Час Родины» ў Кобрыне, у ліпені 1941 г. - сакавіку 1944 г. - газеты «В бой за Родину» на Карэльскім фронце. Пасля вайны жыла і працавала ў Кобрыне. Узнагароджана медалямі. Памерла ў 1981 г.

**Вайткоўская** Варвара Ігнацьеўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.240 : фат.

## *Да 115-годдзя з дня нараджэння Л.Т. Валасюка*



**Валасюк Лука Трафімавіч** нарадзіўся ў 1899г. у Батчы Кобрынскага раёна. Закончыў настаўніцкія курсы ў г. Роўна (1940). У 1921-1923 гг. служыў у Польскай арміі. З канца 1923 г. сакратар Кобрынскага падпольнага райкома КПЗБ. Вясной 1926 г. арыштаваны польскімі ўладамі і асуджаны на 4 гады турмы. У маі 1936 г. - чэрвені 1937 г. вязень Бяроза-Картузскага канцлагера. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны дапамагаў палонным байцам Чырвонай арміі, сем'ям савецкіх ваеннаслужачых. Пазней сувязны партызанскага атрада імя Чапаева (са студзеня 1944 г. аднайменнай брыгады). Удзельнік вызвалення Кобрына. Пасля вайны працаваў старшынёй калгаса.

**Валасюк** Лука Трафімавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.234: фат.

## *Да 85-годдзя з дня нараджэння В.А. Вараб'ёва*



**Вараб'ёў Вадзім Андрэевіч** нарадзіўся 06.05.1929 г. у Брэсце. Закончыў Вольскае авіяцыйнае тэхнічнае вучылішча ВПС (1954), Ленінградскую вышэйшую школу міліцыі (1966). У Вялікую Айчынную вайну з лютага па чэрвень 1942 г. удзельнік Брэсцкага падполля. З чэрвеня 1942 г. сувязны Старасельскага партызанскага атрада (пазней імя Чарнака), з верасня 1943 г. да красавіка 1944 г. разведчык атрада імя Шчорса. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. У 1949-1961 гг. служыў у Савецкай арміі. З 1961 г. у запасе, капітан. Працаваў у органах унутраных спраў у Пскоўскай вобласці, Расія. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Вараб'ёў** Вадзім Андрэевіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.234: фат.

## *Да 75-годдзя з дня нараджэння І.Б. Венцэля*



**Венцэль Іван Баляслававіч** нарадзіўся 2 студзеня 1939 г. у г. Ляхавічы Брэсцкай вобласці. Закончыў Брэсцкі тэхнікум чыгуначнага транспарту (1958), Беларускі інстытут чыгуначнага транспарту (1970), Мінскую ВПШ, працаваў манцёрам, механікам, электрамеханікам на чыгунках Баранавіч і Краснаярска. З 1965 г. - 2-і сакратар Лунінецкага райкама ЛКСМБ, 1-ы сакратар Драгічынскага райкама ЛКСМБ, намеснік загадчыка аддзела Брэсцкага абкама ЛКСМБ. У 1975-1982 гг. сакратар, 2-і сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. У 1982-1988 гг. - старшыня Кобрынскага райвыканкама. У 1988-1995 гг. - старшыня Брэсцкага гарвыканкама.

**Венцэль** Іван Баляслававіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.450-451: фат.

## *Да 85-годдзя з дня нараджэння Я.А. Воўка*

**Воўк Яўген Арсенцьевіч** - палкоўнік медыцынскай службы. Нарадзіўся ў 1929 г. у в. Мярніца Кобрынскага раёна. Кандыдат медыцынскіх навук, заслужаны ўрач Узбекістана. Памёр у 1986 г.

**Воўк** Яўген Арсенцьевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.432.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння М.Ф. Галаднюка*

**Галаднюк Мікалай Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Кустовічы Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскіх груп, з сакавіка 1944 г. партызан атрада

імя Кірава. З ліпеня 1944 г. на 3-м Украінскім фронце. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына, Чэхаславакіі. Дзень Перамогі сустрэў у Германіі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Галаднюк** Мікалай Фёдаравіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.234: фат.

*Да 95-годдзя з дня нараджэння М.З. Глёка*

**Глёк Міхаіл Зоцікавіч** нарадзіўся 15.10.1919 г. у в. Паляцічы Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1944 г. служыў у 1340-м стралковым палку 234-й стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту, аўтаматчык. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Германіі, Польшчы, у штурме Берліна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр 30.3.1997 г.

**Глёк** Міхаіл Зоцікавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.241.

*Да 55-годдзя з дня нараджэння С.А. Гордуна*

**Гордун Сяргей Аляксандравіч** - протаіерэй. Нарадзіўся 4 сакавіка 1959 г. у в. Дзівін. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1976), Маскоўскую духоўную акадэмію (1986). Працаваў настаўнікам Маскоўскай духоўнай семінарыі. З 1989 г. працуе ў Мінскай духоўнай семінарыі, дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, дацэнт кафедры багаслоўскіх дысцыплін факультэта тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

**Гордун** Сяргей Аляксандравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.432.

**Гардун, С**. “Нам неабходна шырокая дыскусія вакол выкладання ў школах асноў хрысціянскай культуры”/С. Гардун, размаўляла В. Мядзведзева //Звязда.–2009.–14 кастрычніка.–С.7.

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння А.В. Грышкоўскага*



**Грышкоўскі Аляксей Васільевіч** - генерал-маёр (1945). Нарадзіўся 10 мая І904 г. у в. Мярніца. Закончыў Ваенную акадэмію імя Дзяржынскага (1940). З 1918 г. у Чырвонай арміі, прымаў удзел у баях на Тамбоўшчыне і ў Крыме, вучыўся на камандзірскіх курсах. Вялікую Айчынную вайну пачаў пад Ленінградам камандзірам артылерыйскага палка ў чыне маёра. Удзельнічаў у вызваленні Украіны, у баях у Польшчы, Чэхаславакіі. Вайну закончыў у Германіі камандуючым артылерыяй 18-й арміі ў чыне генерал-маёра. Пасля вайны камандуючы артылерыяй арміі, намеснік камандуючага артылерыяй ваеннай акругі, начальнік факультэта Артылерыйскай радыётэхнічнай акадэміі імя Говарава, дырэктар саўгаса «3-і рашаючы» пад Харкавам. Памёр 5 сакавіка 1990 г.

**Грышкоўскі** Аляксей Васільевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.432: фат.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння М.П. Грома*



**Гром Мікалай Пятровіч** нарадзіўся 14.12.1924 г. у в. Ліпава Кобрынскага раёна. Закончыў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча. Працаваў на гаспадарцы. У Вялікую Айчынную вайну са снежня 1943 г. партызанскі сувязны, потым у партызанскай брыгадзе «За Радзіму» імя Флегантава. З лета 1944 г. у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў Брэст, Ратна (Украіна), Гдыня, Торунь (Польшча) і інш. Дзень Перамогі сустрэў у Берліне.

**Гром** Мікалай Пятровіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.241: фат..

### *Да 70-годдзя з дня нараджэння Г.Р. Гулюка*

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** - дзяржаўны дзеяч, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Нарадзіўся 23 ліпеня 1944 г. у в. Дварэц (Яромічы). Закончыў Горэцкую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў прарабам у Яроміцкай МТС, начальнікам ПМК у г. Маларыта, намеснікам міністра, міністрам меліярацыі СССР. Дырэктар Дэпартамента меліярацыі НДІ сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі.

**Гулюк** Георгій Рыгоравіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.432.

**Наш** земляк в российском министерстве: [наш земляк из д. Ерёмичи Г.Гулюк – директор Департамента мелиорации Минсельхозпрода России] //Заря. – 2008. – 24 мая. – С.2.

### *Да 50-годдзя з дня нараджэння М.М. Дземідовіча*

**Дземідовіч Мікалай Мікалаевіч** нарадзіўся 17.12.1964 г. у в. Гарадзец Кобрынскага раёна. У 1982 г. закончыў Гарадзецкую сярэднюю школу, дапрызыўную падрыхтоўку прайшоў у Брэсцкай аўташколе ДТСААФ. У сакавіку 1983 г. прызваны ў Савецкую арміію, служыў у Туркестанскай ваеннай акрузе. У кастрычніку 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан. 25 снежня 1984 г. Мікалай разам з баявымі сябрамі суправаджаў транспартную калону. Пачаўся абстрэл. Снарад трапіў у бронетранспарцёр, і вадзіцель М.М. Дземідовіч загінуў. Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках в. Гарадзец.

**Дземідовіч** Мікалай Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.444 - 445: фат.

### *Да 95-годдзя з дня нараджэння А.І. Дзеравянкі*



**Дзеравянка Андрэй Іванавіч** нарадзіўся 31.10.1919 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. да мая 1945 г. на фронце. Камандзір 669-га стралковага палка маёр А.І. Дзеравянка ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Дзеравянка** Андрэй Іванавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.235: фат.

### *Да 55-годдзя з дня нараджэння У.І. Дзехцярука*



**Дзехцярук Уладзімір Іванавіч** - дзеяч беларускай дыяспары ў Эстоніі. Нарадзіўся 24 студзеня 1959 г. у в. Павіцце. Пасля заканчэння ў 1972 г. Брэсцкага чыгуначнага тэхнікума быў накіраваны ў Казахстан, дзе працаваў электрамеханікам Сарышаганскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі і начальнікам чыгуначнай станцыі. У 1973 г. служыў на Ціхаакіянскім флоце на падводнай лодцы. У 1976 г. паступіў у Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Пасля заканчэння накіраваны ў Эстонію на вытворчае аб'яднанне «Эстонсланец». Працуе начальнікам участка сігналізацыі і сувязі акцыянернага аб'яднання «Пылеўківі Раўдтэс» у г. Кохтла-Ярве.

У 1988 г. выбраны ў раду Беларускага культурнага згуртавання г. Таліна і праз год стварыў у г. Кохтла-Ярве Беларуска-эстонскае згуртаванне. У 1998 г. дабраахвотна выйшаў з яго і пачаў супрацоўнічаць са згуртаваннем беларусаў «Спадчына» ў г. Нарва. Доўгі час удзельнічаў у падрыхтоўцы радыёперадач на хвалях «Бацькаўшчыны» для беларусаў Эстоніі, быў дэлегатам З'езда беларусаў блізкага замежжа, арганізаваў паездку Эстонскага камернага хору ў Гомель, пяць

веласіпедных вандровак з Эстоніі ў Беларусь. Захапляецца краязнаўствам, геаграфіяй і гісторыяй Эстоніі. Аўтар зборніка вершаў і апавяданняў «Сярод белых эстонскіх начэй» (1995), кніг «Трылабітавы бераг» (1999), «Кроплі лёсу» (2000).

**Дзехцярук** Уладзімір Іванавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.433.

**Бялоў, Дз.** Ад Эстоніі – да Беларусі : [8 гадоў падарожнічае У. Дзехцярук, ураджэнец в. Павіцце, на веласіпедзе па такому маршруту] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2009. – 5 жніўня. – С.2.

**Хільчук, М.** Чатыры кнігі земляка : [аб творчасці У. Дзехцярука] Марыя Хільчук //Кобрынскі веснік. – 2005. – 17 жніўня. – С.3.

**Хільчук, М.** Доўгі шлях дадому : [лёс і творчасць У. Дзехцярука] Марыя Хільчук //Кобрынскі веснік. – 1999. – 2 кастрычніка. – С.4.

**Астравумава, М.** «Сярод белых эстонскіх начэй»: [упершыню ў Эстоніі выйшла кніга на беларускай мове – зборнік В. Дзехцярука "Сярод белых эстонскіх начэй"] /М. Астравумава //Кобрынскі веснік. – 1996. – 10 студзеня.

**Вечар, А.** Жыве ў Эстоніі беларус…: [У. Дзехцярук] /А. Вечар //Камуністычная праца. – 1990. – 11 жніўня. – С.4.

## *Да 70-годдзя з дня нараджэння Р.Г. Запарожчанка*



**Запарожчанка Раіса Георгіеўна** - вучоны-фізік. Нарадзілася 25 лютага 1944 г. у в. Мярніца. У 1966 г. закончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля аспірантуры пры Інстытуце фізікі АН Беларусі працавала малодшым навуковым супрацоўнікам. У 1977 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці квантавая электроніка. Тэматыка яе даследаванняў звязана з актыўнай сінхранізацыяй лазернага выпраменьвання для атрымання

ультракароткіх імпульсаў святла, з нелінейна-аптычнымі метадамі ператварэння частаты ультракароткіх імпульсаў і нелінейным прапусканнем святла паўправаднікамі. Асноўным метадам даследавання, што развіла Раіса Георгіеўна, з’яўляецца метад матэматычнага мадэліравання працэсаў у лазерах і нелінейна-аптычных асяроддзях. Надрукавала больш за 100 навуковых артыкулаў у айчынных і замежных часопісах, атрымала 9 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы. Па выніках гэтых даследаванняў у 1996 г. ёй прысвоена навуковая ступень доктара фізіка-матэматычных навук па спецыяльнасці лазерная фізіка. Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава Нацыянальнай АН Беларусі.

**Запарожчанка** Раіса Георгіеўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.434-435.

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння Б.Р. Ільясюка*



**Ільясюк Барыс Рыгоравіч** нарадзіўся 24.7.1904 г. у в. Пецькі Кобрынскага раёна. У час 1-й сусветнай вайны знаходзіўся ў бежанстве ў Варонежскай губерні (сяло Троіцкае), там закончыў гімназію. У 1923 г. вярнуўся ў Заходнюю Беларусь, удзельнічаў у рэвалюцыйнай барацьбе. Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939) працаваў настаўнікам, інспектарам райана, дырэктарам дзіцячай тэхнічнай школы Кобрына. У Вялікую Айчынную вайну са снежня 1941 г. на фронце, удзельнічаў у баях за гарады Ялец (Ліпецкая вобл.), Ліўны (Арлоўская вобл.) і інш. Быў цяжка паранены. З 1943 г. працаваў у Саўнаркоме Удмурцкай АССР. У 1944 г. вярнуўся ў Кобрын. З 1948 г. старшыня, з 1959 г. сакратар Кобрынскага гарвыканкама. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Славы ІІІ ступені, 9 медалямі. Памёр у 1989 г.

**Ільясюк** Барыс Рыгоравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.242, 452: фат.

## *Да 100-годдзя з дня нараджэння А.М. Караваева*



**Караваеў Аляксандр Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1914 г. у в. Танкавічы Сяроўскага раёна Свярдлоўскай вобласці, Расія. З ліпеня 1940 г. служыў у складзе 182-га асобнага сапёрнага батальёна на тэрыторыі Літвы. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны з баямі адыходзіў на ўсход, трапіў у палон. Уцёк. У 1942-1944 гг. у партызанскім атрадзе імя Катоўскага, намеснік камандзіра атрада па разведцы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. З ліпеня 1944 г. да ліпеня 1946 г. працаваў старшынёй Дзівінскага райвыканкома. У канцы 1946 г. выехаў на Урал.

**Караваеў** Аляксандр Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.215.

## *Да 120-годдзя з дня нараджэння Д.А. Каранчука*

**Каранчук Даніла Аляксеевіч** нарадзіўся 21.12.1894 г. у в. Лягаты Кобрынскага раёна. У гады грамадзянскай вайны ваяваў пад Рыгай, у цэнтральных раёнах і на поўдні Расіі. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у фарміраванні маршавых рот, быў намеснікам камандзіра часці па гаспадарчых пытаннях у г. Пугачоў Саратаўскай вобласці (Расія). Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. вярнуўся ў Кобрын, з 1947 г. дырэктар харчкамбіната, працаваў у гархарчгандлі, райгандлі, загадчыкам райсабеса, архіварыусам. Памёр 18.04.1986 г.

**Каранчук** Даніла Аляксеевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.242-243.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння П.Р. Каранчука*



**Каранчук Павел Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Магдалін. З 1948 г. працаваў старшынёй калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», іншымі ўзнагародамі. Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна. Патрыёт з вялікай літары, чалавек, у памяці якога на трымалася мноства прозвішчаў, фактаў, дат, падзей.

Каранчук Павел Рыгоравіч нарадзіўся ў сям’і сялян. Сямі гадоў ад роду бацька аддаў свайго першынца ў Барысаўскую школу. У 1936 годзе Павел скончыў чатыры класа пачатковай школы, далей, па згодзе бацькоў, з 1 верасня таго ж года паступіў у пяты клас Кобрынскай польскай школы, дзе і закончыў 7 класаў. Па заканчэнні рускамоўнай школы у г. Кобрыне Павел атрымаў у сельскім Савеце накіраванне на вучобу у ФЗА г. Магілёва. Аднак вучыцца не прыйшлося: у самым пачатку лета памёр бацька, а праз два тыдня пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Пасля вызвалення родных мясцін ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Павел Рыгоравіч быў адпраўлены на аднаўленне Дняпроўска-Бугскага канала, узначальваў мясцовую камсамольскую арганізацыю. У 1949 годзе ўступіў у рады камуністычнай партыі.

У 1948 годзе прымаў удзел у станаўленні калгаса “Новый путь”, які сам узначаліў і 36 гадоў з дня ў дзень знаходзіўся на пасту старшыні. Калгас “Новый путь” быў у ліку тых гаспадарак, на базе якіх праводзіліся рэспубліканскія семінары па сельскай гаспадарцы. Першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў бываў у гэтай гаспадарцы неаднаразова. Дарэчы, з лёгкай рукі Машэрава ў гаспадарцы быў пабудаваны кармазавод.

Павел Рыгоравіч выйшаў на пенсію ў 1984 годзе, аднак шмат добрых спраў за сваю кіраўніцкую дзейнасць паспеў зрабіць. Была пабудавана пачатковая школа ў в. Магдалін і

сярэдняя школа ў в. Кісялёўцы. Усіх добрых спраў не пералічыць. Беспакойны чалавек П.Р.Каранчук, будучы пенсіянерам, актыўна працаваў у ветэранскіх арганізацыях, старастай вёскі Магдалін.

У 1985 годзе Павел Рыгоравіч захапіўся тапаніміяй - навукай паходжання геаграфічных назваў. У мясцовай газеце “Кобрынскі веснік” апублікаваны шэраг артыкулаў пад рубрыкай “Деревенька моя”. У час падрыхтоўкі, збору матэрыялаў і выдання кнігі “Памяць. Кобрынскі раён” Каранчук П.Р. прымаў актыўны ўдзел у яе выданні.

**Долготович, Б.Д**. Коренчук Павел Григорьевич /В.Д. Долготович //Почётные граждане белорусских городов: биографический справочник /Б.Д. Долготович. – Минск, 2008. – С.30-31.

**Каранчук** Павел Рыгоравіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.427.

**Павел** Григорьевич Коренчук //Они награждены орденом Ленина: альбом. – Кобрин, 1981.

**Павел** Григорьевич Коренчук: [биографический очерк]: альбом. – Магдалин, 2003. - 19 с.: фото.

**Коренчук** Павел Григорьевич : [ушёл из жизни почётный гражданин Кобринского района П.Г. Коренчук] //Кобрынскі веснік. – 2012. – 14 красавіка. – С.12.

**Сацук, А.** Рождённый октябрём : [сведения из биографии П.Г. Коренчука] /Алексей Савчук // Кобрынскі веснік. – 2011. - 6 лістапада. – С.2.

**Шевченко, А.** Судьба председателя : [о почётном гражданине Кобринского района П.Г. Коренчуке] /Алла Шевченко //Кобрин-информ. – 2007. – 3 мая. – С.3.

**Коренчук, П.** «Не все умеют командовать… А руководить – это, знаете ли, искусство»: [беседа с первым председателем колхоза «Новый путь», почётным гражданином Кобринского района, удостоенным орденов Ленина, «Знак почёта» и др.] /П. Коренчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 17 снежня. – С.3.

**Петров, П.** Из одного металла льют медаль за бой, медаль за труд: [об известных людях Кобринщины, в их числе и о П.Г. Коренчуке]/П. Петров //Заря. – 2004. – 24 февраля. – С.2.

**Почётные** граждане Кобринского района: [Коренчук П.Г., Сухарев В.И.] //Кобрынскі веснік.- 2005. – 24 жніўня. – С.1.

### *Да 110-годдзя з дня нараджэння М.П. Карповіча*

**Карповіч Максім Пятровіч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. Асмолавічы. Працаваў у бацькоўскай гаспадарцы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенныя гады калгаснік, брыгадзір паляводчай брыгады ў калгасе «Шлях Леніна» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966).

**Карповіч** Максім Пятровіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.427.

### *Да 105-годдзя з дня нараджэння Х.М. Касымава*



**Касымаў Хамза Мірсайхавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у в. Ахметава, Башкірыя. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1942 г. да сакавіка 1943 г. намеснік камандзіра палка 16-й Башкірскай кавалерыйскай дывізіі. Пад Сталінградам быў цяжка паранены, пакінуты пад апеку рабочага шахты № 10 у Данбасе. Пры масавым вывазе шахцёраў у Германію ў маі 1943 г. уцёк з эшалона, з мая 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан атрада імя Катоўскага, у маі - ліпені 1944 г. камісар атрада. Са снежня 1944 г. да мая 1945 г. у Чырвонай арміі, камандзір палка. Быў цяжка паранены, дэмабілізаваны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў у г. Уфа.

**Касымаў** Хамза Мірсайхавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.215.

## *Да 95-годдзя з дня нараджэння У.М. Кірмановіча*



**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** - Герой Савецкага Саюза (1945), палкоўнік (1958). Нарадзіўся 5.11.1919 г. у Кобрыне. Закончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1942), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1955). У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 г. на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Камандзір знішчальнай процітанкавай батарэі капітан У.М. Кірмановіч вызначыўся пры вызваленні Латвіі. 22 жніўня 1944 г. у час танкавай контратакі праціўніка ў раёне пас. Букайшы Добельскага раёна батарэя на чале з У.М.Кірмановічам першая прыняла ўдар, падбіла і спаліла 6 танкаў, 3 самаходныя гарматы, што спрыяла паспяховаму наступленню савецкіх войскаў. За гэты подзвіг У.М.Кірмановіч быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. З 1960 г. выкладчык Харкаўскага ваенна-авіяцыйнага вучылішча імя двойчы Героя Савецкага Саюза С.І.Грыцаўца. Да 1974 г. у Савецкай арміі. На будынку кобрынскай СШ № 2, у якой вучыўся У.М. Кірмановіч, устаноўлена мемарыяльная дошка. Памёр у 2001 г.

**Залатая** зорка Кобрына. Кірмановіч Уладзімір Міка-лаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.239: фат.

**Кирманович** Владимир Николаевич //Ваенная энцыкла-педыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси /рэдкал. А.У. Языковіч (гал. рэд.), мастак В.А. Ляхар. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2010. – С.516-517.

**Долготович, Б.Д.** Кирманович Владимир Николаевич /Б.Д. Долготович //Почётные граждане белорусских городов /Б.Д. Долготович. – Минск, 2008. – С.30.

**Кирманович** Владимир Николаевич //Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С.454.

**Кирманович** Владимир Николаевич //Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. – Минск, 2007. - Т.4. – С.48.

**Кірмановіч У.М.** //Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск, 1972 . - Т. 5. – С.590 : фота.

**Кірмановіч У.М.** //Героі Савецкага Саюза і Беларусі – ураджэнцы Брэстчыны: партрэты-плакаты. – Брэст, 1999.

**Владимир** Николаевич Кирманович //Они награждены орденом Ленина: альбом. – Кобрин, 1981.

**Золотая** Звезда Кирмановича: ими гордится Кобрин //Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С.26.

**Курига, Е.** Золотая Звезда Кирмановича /Е. Курига //Кобрин-информ. – 2008. – 30 октября. – С.3.

**Герои** – наши земляки: Кирманович В.Н. //Нёман. – 1967. - №3. – С.48.

## *Да 50-годдзя з дня нараджэння М.М. Кірысюка*



**Кірысюк Міхаіл Мікалаевіч** - малодшы сяржант. Нарадзіўся 7.9.1964 г. у в. Хабовічы Кобрынскага раёна. У 1979 г. закончыў Хабовіцкую васьмігадовую школу, у 1980 г. - ПТВ № 102 г. Кобрына, пасля працаваў у ПМК № 70. У маі 1983 г. прызваны ў рады Савецкай арміі, служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Пасля заканчэння вучэбнага падраздзялення ў верасні 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан у якасці камандзіра аддзялення. Памёр 1.3.1984 г. Пахаваны на могілках в. Хабовічы.

**Кірысюк** Міхаіл Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.445: фат.

**Кірысюк** Міхаіл Мікалаевіч //Памяць. Афганістан. – Мінск: БелСЭ, 1991. - С.207: фат.

## *Да 95-годдзя з дня нараджэння В.Р. Коўтуна*



**Коўтун Васіль Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1919 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце са снежня 1941 г., служыў старшыной дывізіёна ў 60-м гвардзейскім Кобрынскім артылерыйскім палку. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі.

**Коўтун** Васіль Рыгоравіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.235: фат.

## *Да 105-годдзя з дня нараджэння Р.М. Кошаля*

**Кошаль Рыгор Міхайлавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у г. Смалявічы Мінскай вобл. Закончыў курсы галоўных бухгалтараў (1933), Пінскі кааператыўна-харчовы рабфак. Працаваў у г. Сянно Віцебскай вобл. У кастрычніку 1939 г. пераведзены ў Кобрын на пасаду галоўнага бухгалтара міжраённай канторы «Белгандальплодаагародніна». У 1942 г. устанавіў сувязь з партызанамі, у 1943 г. пайшоў у партызанскі атрад імя Катоўскага, быў старшым дыверсійнай групы. Помсцячы, фашысцкія захопнікі 11 верасня 1943 г. расстралялі сям'ю Р.М. Кошаля - жонку Ефрасінню Афанасьеўну і траіх малалетніх дзяцей - Аляксандра, Валерыя і Міхаіла. У 1944 г. разам з атрадам выйшаў за лінію фронту.

**Кошаль** Рыгор Міхайлавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.221.

## *Да 65-годдзя з дня нараджэння М.А. Крывецкага*

**Крывецкі Мікалай Анатольевіч** нарадзіўся 5 красавіка 1949 г. у в. Малінаўка Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў

паляводам, брыгадзірам у калгасе «Савецкая Беларусь», намеснікам старшыні калгаса імя Кірава (в. Хомеч). У 1975-1985 гг. інструктар Драгічынскага райкама КПБ, намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Драгічынскага райвыканкама, інструктар, намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела Брэсцкага абкама, другі сакратар Маларыцкага райкама КПБ, старшыня Іванаўскага райвыканкама. У 1985-1991 гг. 1-ы сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. З сакавіка да снежня 1991 г. - намеснік старшыні Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. У апошні час кіраўнік Адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншымі ўзнагародамі.

**Крывецкі** Мікалай Анатольевіч//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.453.

### *Да 75-годдзя з дня нараджэння В.У. Курашыка*



**Курашык Віталь Уладзіміравіч** - дзяржаўны дзеяч. Нарадзіўся 8 мая 1939 г. у в. Дзівін. Пасля заканчэння ў 1960 г. Тарэзскага горнага тэхнікума Данецкай вобл. (Украіна) працаваў машыністам, горным майстрам шахты «Качагарка», тэхнолагам, галоўным тэхнолагам завода высакавольтнай апаратуры г. Канстанцінаўка. У 1974-1982 гг. другі, першы сакратар Канстанцінаўскага гаркама КПУ, у 1982-1985 гг. старшыня гарвыканкама г. Еўпаторыя (Крым). У 1985-1987 гг. загадчык аддзела Крымскага абкома КПУ, у 1987-1991 гг. намеснік старшыні, першы намеснік старшыні, старшыня Крымскага аблвыканкама. У 1991-1993 гг.- Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Крым. З мая 1993 г. па 14 чэрвеня 2001 г.- надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне.

**Курашик** Виталий Владимирович // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С.517.

**Курашык** Віталь Уладзіміравіч// Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.437: фат.

**Курашик, В. В.** Я не хочу судьбу иную… / В.В. Курашик. – Киев, 2002. – 392с.

**Курашик, В.** Я… посол. Что я могу? /В. Курашик //Рэспубліка. – 1994. – 16 чэрвеня. – С.5.

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння Дз. К. Курышкі*



**Курышка Дзмітрый Кузьміч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. Балоты Кобрынскага раёна. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працаваў у Кобрыне на чыгунцы. У пачатку вайны вярнуўся ў в. Балоты, аказваў дапамогу чырвонаармейцам, што трапілі ў акружэнне, удзельнічаў у арганізацыі партызанскіх атрадаў. З ліпеня 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан-разведчык атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў у Кобрыне. Памёр у 1984 г.

**Курышка** Дзмітрый Кузьміч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.222.

## *Да 95-годдзя з дня нараджэння М.М. Ламейкі*



**Ламейка Міхаіл Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1919 г. у в. Вішнёўка Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны сям’я М.М.Ламейкі аказвала дапамогу чырвонаармейцам, якія трапілі ў акружэнне, збірала і перадавала зброю партызанскім групам. За сувязь з партызанамі фашысты ў 1942 г. расстралялі сям’ю Ламейкі. З верасня 1942 г. Міхаіл Мікалаевіч баец атрадаў імя Шчорса і

«Савецкая Беларусь», з красавіка 1943 г. да красавіка 1944 г. - партызанскага атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны працаваў у паравозным дэпо Брэста. Трагічна загінуў 17.2.1977 г.

**Ламейка** Міхаіл Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.222.

### *Да 80-годдзя з дня нараджэння В.Л. Леанюка*



**Леанюк Віктар Лук'янавіч** нарадзіўся 3 снежня 1934 г. у в. Гнеўчыцы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Пінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум, ВПШ пры ЦК КПСС. Працаваў на Лунінецкай і Іванаўскай МТС. З 1957 г. інструктар Іванаўскага райкама, Брэсцкага абкама, у 1959-1962гг. - 1-ы сакратар Кобрынскага райкама ЛКСМБ, потым інструктар Кобрынскага райкама КПБ. У 1963-1969 гг. старшыня Кобрынскага гарвыканкама. З 1969 г. па 1975 г. намеснік дырэктара Кобрынскага СПТВ № 102. Затым працаваў у сістэме будаўніцтва ў Беларусі і Расіі, удзельнічаў у асваенні Нечарназем'я РСФСР. Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета. Мае ўрадавыя ўзнагароды СССР. На пенсіі з 1994 г. Жыве ў Мінску.

**Леанюк** Віктар Лук'янавіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.453: фат.

### *Да 50-годдзя з дня нараджэння С.П. Лесняка*

**Лясняк Сяргей Пятровіч** - радавы, вадзіцель бронетранспарцёра. Нарадзіўся 3.11.1964 г. у Кобрыне. У 1979 г. закончыў 8 класаў кобрынскай сярэдняй школы № 6. У 1982 г. - Кобрынскае ПТВ № 102 будаўнікоў. Працаваў газазваршчыкам на птушкафабрыцы ў Кобрыне. Прайшоў падрыхтоўку ў

Брэсцкай аўташколе ДТСААФ. У маі 1983 г. быў прызваны ў Савецкую армію ў Туркестанскую ваенную акругу. У кастрычніку 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан у якасці вадзіцеля БТР. Загінуў 7.11.1983 г. Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках горада Кобрына.

**Лясняк** Сяргей Пятровіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.446: фат.

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння Е.П. Лукіной*

**Лукіна Ефрасіння Пятроўна** нарадзілася 7 ліпеня 1904 г. у Віцебску. Закончыла Мінскую вышэйшую сельскагаспадарчую школу (1936). Працавала старшынёй калгаса «Пражэктар» Шклоўскага раёна, намеснікам дырэктара Лёзненскай МТС. З 1939 г. інструктар Брэсцкага абкама КП(б)Б, з 1941 г. дырэктар МТС у Саратаўскай вобл. (Расія). З 1943 г. знаходзілася ў рэзерве аператыўнай групы ЦК КП(б)Б у Маскве. У ліпені 1944 г. - кастрычніку 1946 г. сакратар Кобрынскага райкама КП(б)Б. У 1946-1959 гг. на гаспадарчай рабоце ў Кобрыне. Выбіралася дэпутатам Кобрынскага гарадскога Савета. На пенсіі з 1959 г.

**Лукіна** Ефрасіння Пятроўна // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.453.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння М.М. Любіменка*

**Любіменка Міхаіл Мікалаевіч** - Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся 29.4.1924 г. у с. Новаандрэеўка Арэхаўскага раёна Запарожскай вобл. У Чырвонай арміі з 1941 г. Закончыў Тбіліскае пяхотнае вучылішча (1942), курсы «Выстрал» (1959). На фронце з 1942 г., ваяваў у 37-м гвардзейскім Кобрынскім стралковым палку 12-й стралковай дывізіі. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Вызначыўся 17 красавіка 1945 г. Намеснік камандзіра батальёна разам з батальёнам першы пераправіўся цераз р.Одэр, захапіў плацдарм,

замацаваўся на ім, адбіў 6 контратак праціўніка, забяспечыў пераправу ўсіх падраздзяленняў палка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31.5.1945 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Да 1969 г. служыў у Савецкай арміі, падпалкоўнік.

**Любіменка** Міхаіл Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.232-233.

### *Да 90-годдзя з дня нараджэння А.К. Мазурына*

**Мазурын Анатоль Кузьміч** нарадзіўся 16.01.1924 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. З ліпеня 1941 г. служыў старшым тэлеграфістам у 37-м гвардзейскім стралковым палку, удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Мазурын** Анатоль Кузьміч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.236.

### *Да 110-годдзя з дня нараджэння Дз. К. Малькова*



**Малькоў Дзмітрый Кузьміч** - Герой Савецкага Саюза (1944), генерал-лейтэнант (1955). Нарадзіўся 8.11.1904 г. у в. Лаўрухіна Савецкага раёна Кіраўскай вобласці. У Чырвонай арміі з 1927 г. Закончыў ваенную пяхотную школу (1930), Ваенную акадэмію Генштаба (1948). У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, Беларускім, 3-м і 1-м Прыбалтыйскіх, 1-м Беларускім франтах: начальнік штаба, камандзір стралковай дывізіі. Палкоўнік Дз.К.Малькоў вызначыўся пры вызваленні Брагінскага раёна Палескай вобл. 27-28.9.1943 г. дывізія пад яго камандаваннем першай фарсіравала Дняпро, выбіла праціўніка з

траншэй, замацавалася і пашырыла плацдарм. Палкоўнік Дз.К. Малькоў, камандзір 12-й гвардзейскай Пінскай стралковай дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Да 1960 г. служыў у Савецкай арміі.

**Малькоў** Дзмітрый Кузьміч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.233: фат.

### *Да 110-годдзя з дня нараджэння А.М. Мартынава*



**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** нарадзіўся 20 жніўня 1904 г. у Кобрыне. У 1911-1915 гг. вучыўся ў Кобрынскім прыходскім вучылішчы. У 1-ю сусветную вайну сям'я эвакуіравалася ў г. Рагачоў, дзе А.М. Мартынаў працягваў вучобу ў рэальным вучылішчы. Працаваў настаўнікам: у школе лікбезу (зіма 1920/21), у в. Мікалаеўка (сакавік 1921-май 1922). Пасля смерці бацькі ў 1922 г. сям'я вярнулася ў Кобрын. У 1922-1939 гг. быў чорнарабочым на сезонных работах і на лесазаводзе. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР з 24.9.1939 г. прыцягнуты на працу ў Часовае ўпраўленне Кобрынскага павета для наладжвання работы пошты. 1 лістапада 1939 г. прызначаны загадчыкам гарадской бібліятэкі. У Вялікую Айчынную вайну быў сувязным партызанскага атрада імя Чапаева, выконваў разведвальныя заданні оперупаўнаважанага партызанскай брыгады імя Чапаева. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад акупантаў аднаўляў работу бібліятэкі. 4 жніўня 1946 г. прызначаны дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А.В.Суворава. Пад яго кіраўніцтвам музей стаў адным з лепшых у Беларусі, дзе сабраны унікальныя калекцыі зброі, нумізматыкі. А.М. Мартынаў удзельнічаў у грамадскім жыцці Кобрыншчыны: у 1960-я гады арганізаваў раённае аддзяленне Таварыства аховы прыроды, у 1966 г. - Таварыства аховы

помнікаў гісторыі і культуры, якое ўзначальваў да 1972 г. Вёў вялікую краязнаўчую работу. Гісторыя нашага горада багата падзеямі, якія ў свой час даследаваў Мартынаў і з уласцівай яму лёгкасцю выказваў на бумазе. Ім напісана больш за 70 артыкулаў, якія публікаваліся ў рэспубліканскіх і мясцовых органах друку. Быў ганаровым грамадзянінам Кобрына. Узнагароджаны медалём імя Н.К. Крупскай. Памёр 15.11.1999 г.

**Долготович, Б.Д.** Мартынов Алексей Михайлович /Б.Д. Долготович //Почётные граждане белорусских городов /Б.Д. Долготович. - Минск, 2008. - С.31.

**Мартынаў** Аляксей Міхайлавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.437-438: фат.

**Бабенко, Е.** Историк, краевед, администратор: [20 августа исполнилось бы 105 лет со дня рождения А.М. Мартынова] / Елена Бабенко //Кобрынскі веснік. - 2009. - 22 жніўня. - С.2.

**Бабенко, Е.** В. Муза Клио глазами летописца /Е.В. Бабенко // Кобрин-информ. - 2009. - 8 января. - С.6.

**Вержбицкая, В**. Личность в истории Кобрина: [о А.М. Мартынове] /В.Вержбицкая //Кобрин-информ. - 2004. - 11 ноября.

**Историку** и краеведу посвящается:[к 100-летию со дня рождения А. Мартынова]//Вечерний Брест. - 2004.- 27августа.

**Рысь, А**. Захавальнік гісторыі: [А.М. Мартынову – 100 гадоў з дня нараджэння] /М. Рысь //Краязнаўчая газета. – 2004. - №36 (верасень). - С.7.

**Рысь, Е.** Хранитель истории: [к 100-летия со дня рождения А.М. Мартынова] /Елена Рысь //Кобрынскі веснік. - 2004. - 18 жніўня. - С.2.

**Хільчук, М.** І яшчэ пра Аляксея Мартынава /М.Хільчук //Кобрынскі веснік.- 2004.- 25 жніўня.

**Макарук, О.** Жасмин с ароматом истории: [об А.М. Мартынове] /О. Макарук //Заря. - 2003. - 19 июня .- С.3.

**Аб узнагароджанні** А.М. Мартынава Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь: пастанова Савета Міністраў ад 26 кастрычніка 1999г. //Рэспубліка. - 1999. - 2 лістапада. – С.4.

**Жывой** гісторыяй свайго горада называюць жыхара Кобрына А.М. Мартынава //Голас Радзімы. - 1995. - 7 снежня.

**Кобяк, Р.** А.М. Мартынов / Р. Кобяк //Белорусская нива. - 1995. - 22 ноября. – С.3; Культура. - 1995.- 29 лістапада. - 5 снежня.- С.7.

**Сущук, А.** Слово о старшем товарище: [Мартынову – 90 лет]/А. Сущук //Кобрынскі веснік. - 1994. - 24 жніўня. - С.1.

**Захавальнік** гісторыі: [аб А.М. Мартынаве] //Камуністычная праца. - 1989. - 16 верасня. - С.3.

## *Да 100-годдзя з дня нараджэння Ф.І. Маскаленка*



**Маскаленка Фёдар Ільіч** нарадзіўся ў 1914 г. у в. Водзіна Данецкай вобласці, Украіна. Закончыў Данецкі палітэхнікум. У верасні 1941 г. удзельнічаў у стварэнні партызанскіх атрадаў, у т.л. атрада імя Чапаева, адным з камандзіраў якога ён быў. Партызаны яго атрада ўзарвалі 41 варожы эшалон, знішчылі 37 аўтамашын, 20 цыстэрнаў з гаручым. Сам Ф.І. Маскаленка удзельнічаў у 17 баях, падрыве 3 мастоў, 7 аўтамашын, знішчэнні 11 км тэлеграфнай сувязі. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрынскім раёне. З 1952 г. быў старшынёй калгаса «1 Мая», пазней працаваў старшынёй сельсавета. Памёр у верасні 1960 г.

**Маскаленка** Фёдар Ільіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 216 : фат.

### *Да 85-годдзя з дня нараджэння К.І. Мельнікавай*

**Мельнікава Кіра Іванаўна** нарадзілася ў 1929 г. у г. Лепель Віцебскай вобласці. У 1949 г. закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча. Працавала настаўніцай у няпоўнай СШ в. Запруды, загадчыцай школы ў в. Перкі, настаўніцай пачатковых класаў у кобрынскіх сярэдніх школах № 3,2,5. Званне "Заслужаны настаўнік " прысвоена ў 1965 г.

**Мельнікава** Кіра Іванаўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 430.

### *Да 90-годдзя з дня нараджэння Н.І. Місюк*

**Місюк Надзея Іосіфаўна** нарадзілася ў 1924 г. у в. Брылёва. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызанка атрада імя А.В. Суворава Пінскага злучэння. З 1944 г. па 1951 г. сакратар Кісялевіцкага сельсавета. З 1951 г. звеннявая, а з 1957 г. брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

**Місюк** Надзея Іосіфаўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.428.

### *Да 95-годдзя з дня нараджэння С.М. Міхальчышына*

**Міхальчышын Савелій Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1919 г. на Украіне. Перад Вялікай Айчыннай вайной прызваны ў Чырвоную армію, быў накіраваны ў Магілёўскае пяхотнае вучылішча. З 1941 г. лейтэнант С.М. Міхальчышын служыў у Брэсцкай крэпасці пры штабе, потым прызначаны камандзірам кулямётнай роты. Вайну сустрэў у Брэсцкім гарнізоне, у час адступлення быў кантужаны. У лесе ваеннаслужачыя, сярод якіх знаходзіўся і Міхальчышын, арганізавалі групу, якая потым улілася ў партызанскі атрад імя Кірава. Удзельнік вызвалення Кобрына. З 1944 г. у дзеючай арміі, вызваляў Кёнігсберг. Пасля вайны служыў у

органах унутраных спраў у гарадах Брэсце, Кобрыне. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі.

**Міхальчышын** Савелій Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 237: фат.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння М.А. Назарука*

**Назарук Міхаіл Аляксеевіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Боркі Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну спачатку быў партызанскім сувязным, з чэрвеня 1943 г. стралок партызанскага атрада імя Чкалава (са студзеня 1944 г. атрада імя Паставалава брыгады імя Чапаева). Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Пасля вызвалення Беларусі ў Чырвонай арміі, удзельнічаў у баявых дзеяннях у складзе 3-га Прыбалтыйскага фронту, вызваляў Латвію, Эстонію. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Астроміцкім сельсавеце, на хлебазаводзе.

**Назарук** Міхаіл Аляксеевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С.237.

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння М.М. Несцярука*

**Несцярук Максім Мікітавіч** нарадзіўся ў 1904 г. у в. Павіцце Кобрынскага раёна. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўключыўся ў падпольную барацьбу. З 1942 г. да 1943 г. быў сувязным партызанскіх атрадаў імя Шчорса і імя Катоўскага. Загінуў у кастрычніку 1943 г.

**Несцярук** Максім Мікітавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.223.

## *Да 55-годдзя з дня нараджэнняМ.А. Новіка*



**Новік Мікалай Аляксеевіч** нарадзіўся 22 красавіка 1959 г. у в. Астромічы. У 1970-1976 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І.В. Ахрэмчыка на мастацкім аддзяленні. У 1977-1979 гг. служыў у Савецкай арміі. У 1980-1986 гг. працаваў мастаком-графікам у газеце «Заполярная правда» (г. Нарыльск, Расія). У 1986-1991 гг. вучыўся на аддзяленні прамысловага дызайну Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер Акадэмія мастацтваў). Член Саюза дызайнераў Беларусі (1991). Займаецца дызайнам асяроддзя, абсталявання, графічным дызайнам. Сярод асноўных работ - праекты школы мастацтваў саўгаса «Днепрабугскі» Кобрынскага раёна, абсталявання для вучэбнай майстэрні малюнка і жывапісу, дзіцячага паркавага атракцыёну. Працуе і як жывапісец у жанры пейзажу і нацюрморта. Блізкая мастаку тэма - сучасная беларуская вёска: побыт, уклад жыцця, вясковы ландшафт. Ён аўтар шматлікіх мастацкіх палотнаў, сярод якіх напісаныя ў 1983-1984 гг.: «Індустрыяльны пейзаж», «Жаркі» (нацюрморт), «Гарадскі пейзаж. Горад Нарыльск», «Дарога на Талнах», «Асенняя тундра», «Чырвоныя камяні», «Ваколіцы г. Нарыльска», «Возера Глыбокае», «Пасёлак Валёк», «Берагі р. Нарылкі», «Вечныя льды»; у 1992 г.: «Гарадскі пейзаж. Мінск», «Стары Кобрын», «Львоўскі дворык», «Рамонкі», «Вясковы пейзаж. Астромічы»; у 1993 г.: «Заснежаныя стрэхі», «Зімовая вёска», «Праснікі», «Гарадок. Талінскі матыў», «Кветкі», «Бэз»; у 1995 г.: «Вясковае жыццё», «Непагодлівы дзень»; у 1996 г.: «Студня», «Веснавыя праталіны», «Першы снег», «Марозны дзень», «Зімовы вечар», «Восень», «Пралеска», «Дарога ў Косава», «Вёсачка Красноўка». Працы М.А. Новіка знаходзяцца ў прыватных мастацкіх калекцыях у Англіі, Германіі, Канадзе, Польшчы, ЗША, Францыі і іншых краінах.

**Новік** Мікалай Аляксеевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.439-440: фат.

**Хільчук, М.** Сапраўдны мастак і дом будуе не так: [пра мастака з в. Астромічы М. Новіка] /Марыя Хільчук //Кобрынскі веснік. – 2003. – 16 жніўня. – С.3.

## *Да 95-годдзя з дня нараджэння І.Ц. Разумоўскага*

**Разумоўскі Іван Ціханавіч** нарадзіўся 23.01.1919 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны паступіў у ваеннае вучылішча ў Маскве. Вайну пачаў 22 чэрвеня 1941 г. у складзе курсанцкай роты вучылішча, якая неўзабаве была накіравана на заходнюю граніцу СССР. Служыў у 533-м армейскім Кобрынскім знішчальным процітанкавым артылерыйскім палку, удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Вайну закончыў у маі 1945 г. камандзірам знішчальнай процітанкавай батарэі ў званні капітана. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі.нагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Разумоўскі** Іван Ціханавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён.- Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.237.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння М.А. Салея*



**Салей Мікалай Андрэевіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Балоты Кобрынскага раёна. Закончыў Ленінградскае ваенна-палітычнае вучылішча (1952) і гістарычны факультэт Гомельскага педінстытута (1954). У маі 1943 г. стаў падрыўніком партызанскага атрада імя Катоўскага, пастаянна выконваў заданні па падрыве шашэйных дарог і чыгунак. Актыўна дапамагаў партызанам і яго бацька - сувязны А.Ц. Салей. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў М.А.Салей

быў прызваны ў Чырвоную армію, потым накіраваны на працу ў органы НКУС. У 1954 г. дэмабілізаваны, вярнуўся ў родныя мясціны. У 1959-1976 гг. працаваў дырэктарам школы ў в. Кісялёўцы Кобрынскага раёна. Узнагароджаны медалямі.

**Салей** Мікалай Андрэевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.-С.225.

### *Да 30-годдзя з дня нараджэння М. Серадовіча*

**Серадовіч Мікалай** - спартсмен. Нарадзіўся ў 1984 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы, прызёр юніёрскіх чэмпіянатаў свету ў 2001 г. (Германія), 2002 г. (Ямайка).

**Серадовіч** Мікалай // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 441.

### *Да 50-годдзя з дня нараджэння І.Ф. Сідаруке*



**Сідарук Ігар Фёдаравіч** нарадзіўся ў Кобрыне 23 ліпеня 1964 года ў сям'і служачых. Тут закончыў школу, пазней - філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ў 1986 г. Настаўнічаў на Салігоршчыне. Затым працаваў рабочым на Кобрынскім рамонтным заводзе, карэспандэнтам у газетах "Кобрынскі веснік" і "Брэсцкі кур'ер". З 1993 года загадчык літаратурна-драматычнай часткі ў Брэсцкім абласным тэатры лялек. Першыя літаратурныя вопыты Ігара Сідарука друкаваліся ў выданнях "Студенческий меридиан", "Маладосць", "Чырвоная змена", "Дзень паэзіі-90".

Ігар Сідарук выступае ў драматургіі і паэзіі, піша для дзяцей. У 1992 г. у калектыўным зборніку "Драўляны рыцар" (выдавецтва "Юнацтва") была апублікавана яго п'еса для дзяцей "Кветкі пад ліўнем". У гэтым жа годзе аўтар выдае кнігу вершаў "Чарнабел", у 1994 г. - паэтычны зборнік "Сатана Арганата" і дзіцячую кніжку "Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука".

Асноўны кірунак літаратурнай творчасці І. Сідарука - драматургія. Ён - аўтар п'ес "Галава" (сцэнічны дэбют у 1992 годзе ў тэатры-лабараторыі нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна"), "Прыгоды Люстрынкі", "Меч Анёла", "Збавіцель", "Дрэва багоў", "Плач, саксафон!..", "Янка-зух і нячысты дух", "Штукатуры", «Белая дама» і іншых, пастаўленых у розных тэатрах Беларусі. За сцэнарый спектакля "Залатая табакерка" атрымаў Гран-пры на міжнародным тэатральным фестывалі "Белая вежа-2001" у Брэсце.

Пра "Галаву" І. Сідарука знаўцы тэатра і драматургіі гавораць "як пра рэч эксперыментальную, наватарскую... Гэта тое, чаго мы дасюль не сустракалі ў беларускай драматургіі". Упершыню пастаноўку п'есы ажыццявіў у 1992 г. Дзяржаўны тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна".

Асобную, змястоўную старонку ў творчасці Ігара Сідарука складае дзіцячая драматургія. Найбольш пашыраным у ёй з'яуляецца жанр драматычнай казкі. У Ігара Сідарука ў гэтым плане варта адзначыць драматычную казку "Кветкі пад ліўнем".

У тэатрах лялек Беларусі пастаўлены яго "Меч Анела" (1993г.), "Янка-зух і нячысты дух" (1993 г.), "Завадныя парасяткі" (1994 г.), "Збавіцель" (1994 г.), "Штукары" (1994 г.).

У альманаху "Ксэракс беларускі" (1993г., №4) апублікавана п'еса Ігара Сідарука "Торба", у "Ксэракс беларускі" (1992 г., №3) - п'еса "Затурханыя", у зборніку "Казкі для сцэны" (1992 г.) - п'еса для дзяцей "Прагнасць - не ў радасць".

Зборнік "Моўкнасць" - трэці паэтычнк зборнік Ігара Сідарука. Празрыстая разняволенасць, прыцішаныя інтанацыя, спроба выклікаць асацыятыўную вобразнасць някідкімі выразнымі сродкамі - вось што ўласціва вершам паэта. Зборнік выданы ў 1997 г. выдавецтвам "С. Лаўрова» ў Брэсце. На сённяшні час І. Сідарук працуе ў газеце "Кобрынскі веснік", працягвае сваю літаратурную дзейнасць.

**Ігар** Сідарук //Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст, 2008. – С.315-316.

**Сідарук** Ігар Фёдаравіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 441.

**Ляшук, В.Я.** Сідарук Ігар /В.Я.Ляшук //Літаратура Берасцейшчыны /Ляшук В.Я., Снітко Г.М. - Брэст, 1999. - С.364-366.

**Сідарук, І.** Магнетызм друкаванага слова: [кніга ў жыцці І. Сідарука] /І. Сідарук //Кобрынскі веснік. – 2012. – 18 лютага.

**Трафімчык, А.** Дабро VS Зло: [дзіцячы драматург І. Сідарук] /Анатоль Трафімчык //ЛіМ. - 2012. – 20 ліпеня. – С.6.

**Сідарук, І.** "Іншым радок дыктуе само неба…":[наш зямляк – вядомы літаратар Ігар Сідарук – адзначыў 25-годдзе творчай дзейнасці] /Ігар Сідарук, гутарыла Ганна Каравайчык //Кобрынскі веснік. – 2008. – 6 жніўня. – С.6.

**Лявонава, Е.** Беларуская літаратура ў Аўстрыі: [у аўстрыйскім часопісе прадстаўлена беларуская літаратура апошніх дзвух дзесяцігоддзяў, у тым ліку творы кабрынчаніна І. Сідарука]/ Ева Лявонава //ЛіМ. – 2007. – 13 красавіка.

**Кісліцына, Г.** Мадыфікацыя празаічных жанраў у сучаснай беларускай літаратуры: [у тым ліку аб творах І. Сідарука] /Ганна Кісліцына //Роднае слова. – 2006. - №9. – С.23-25.

**Кісліцына, Г.** Апошні цвік: [аб п'есе І. Сідарука "Квадратная варона"] /Ганна Кісліцына //ЛіМ.–2001.–6 красавіка.– С.6.

**Знаёмцеся**: Ігар Сідарук, драматург //Культура. – 2000. – 17-24 чэрвеня. – С.7: фат.

**Шавель, М.** "Я ведаю, куды плыве наш карабель": [Брэсцкі абласны тэатр лялек атрымаў грант Фонд Сораса за пастаноўку "Дрэва багоў" паводле І. Сідарука] /М. Шавель //Культура. – 2000. – 26 жніўня. - 1 верасня. – С.7.

**Кісліцына, Г.** Беларускі постмадэрнізм: спроба індэнтыфікацыі: [у тым ліку аб творчасці І. Сідарука] / Г. Кісліцына //Культура. – 1996. - 3-9 верасня. - С.6-7.

**Савіцкая, А.** "Ці уваскрэснем мы душою…: [аб творчасці драматурга І. Сідарука] /А. Савіцкая //Мастацтва. – 1996. - №7. - С.32-35.

**Садаўнічы, Э.** Містэрыя "Калючага дроту" : Парадоксы сучаснай беларускай драматургіі: [ у тым ліку ўпамінаецца п'еса

"Галава" І. Сідарука] /Э. Садаўнічы //Роднае слова. – 1996. - №12. – С.61.

**Фонд** Сороса поможет поставить в Бресте новый спектакль по пьесе И. Сидорука "Дерево богов"' в театре кукол //Брестский курьер. – 1995. - 15-21 июня. - С.12.

**Бельскі, А.** Пуцявінамі абнаўлення: Маладая беларуская драматургія 80-х - пач. 90-х г.г.: [у тым ліку аб драматурге І. Сідаруке] /А. Бельскі //Роднае слова. – 1994.- №1. - С.28-30.

**Бунеева, Л.** "Дзверы у неба": Ігар Сідарук і яго героі /Л. Бунеева //Тэатральная Беларусь. – 1994. - №1. - С.42-43.

**Зелка, К.** "У Віфліяме божая матка нарадзіла дзіцятка: [калядная прэм'ера па п'есе І. Сідарука "Збівацель" у тэатры лялек] /К. Зелка //Брестский курьер. – 1994. - 6 декабря. - С.9.

**Круг** чтения: [выйшла кніга І. Сідарука "Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сідарука"] //Брестский курьер. – 1994. - 4-11 августа. - С.9.

**Лаўшук, С.** На вольнай сцэне... "вольны дух": [аб п'есе «Галава» І. Сідарука /С. Лаўшук] //Рэспубліка. – 1994. - 16 ліпеня. - С.5.

**Сянкевіч, М.** Пачытаем разам: [аб кнізе І. Сідарука "Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сідарука"] /М. Сянкевіч //Народная трыбуна. – 1994. - 5 лістапада.

**У выдавецтве** "Талер" выйшла кніга для дзяцей Ігара Сідарука //Кобрынскі веснік. – 1994. - 26 ліпеня.

**Вкратце**: В областном театре кукол прошла премьёра спектакля "Меч ангела" по пьесе Ігоря Сідарука //Брестский курьер. – 1993. - 9-15 апреля. - С.1.

**Ігар** Сідарук: рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік /аддзел абслугоўвання і інфармацыі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. – Кобрын, 2002. – 4с.

### *Да 105-годдзя з дня нараджэння П. С. Сідарук*

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** нарадзілася ў 1909 г. у в. Ілаўск у сялянскай сям'і. З 1927 г. член КСМЗБ, з 1931 г. - КПЗБ. У 1932 г. за падпольную дзейнасць арыштавана і знявола на 2 гады. Пасля выхаду з турмы працягвала

падпольную дзейнасць, зноў была арыштавана і зняволена на 7 гадоў. У верасні 1939 г. вызвалена. У кастрычніку 1939 г. была выбрана дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны апынулася ў Паволжжы, пазней была закінута ў Кобрынскі раён для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. Была членам бюро Антопальскага падпольнага райкама КП(б)Б, які знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Кірава. Пасля вайны працавала сакратаром Кобрынскага райкама партыі, пазней намеснікам старшыні Кобрынскага райвыканкама. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР у 1947-1951 гг. Ганаровая грамадзянка горада Кобрына.

**Долготович, Б.Д.** Сидорук Прасковья Семёновна /Б.Д. Долготович //Почётные граждане белорусских городов /Б.Д. Долготович. - Минск, 2008. – С.32.

**Сідарук** Праскоўя Сямёнаўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 455.

**Белов, Д.** Сквозь аресты и тюрьмы…:[активным участником событий воссоединения Западной Беларуси с БССР была П. Сидорук, почётный гражданин Кобрина] /Дмитрий Белов //Кобрынскі веснік. – 2009. – 11 сакавіка. – С.3.

**П.С. Сидорук** – почётный гражданин г. Кобрина //Знамя юности. – 1988. – 16 октября.

**Сяргей, А.** З партбілетам ля сэрца: [аб ганаровым грамадзяніне г. Кобрына П.С. Сідарук] /А. Сяргей //Камуністычная праца. – 1982. – 16 верасня.

**Сідарук, П.С.** І дзеці змагаліся…: [з успамінаў удзельніцы рэвалюцыйнага падполля, ганаровай грамадзянкі Кобрына, персанальнай пенсіянеркі ] /П.С. Сідарук //Камуністычная праца. – 1981. – 16 мая.

**Віншуем** з сямідзесяцігоддзем ганаровую грамадзянку Кобрына П.С. Сідарук //Камуністычная праца. – 1979. – 24 лістапада.

## *Да 105-годдзя з дня нараджэння Ф.Н. Сідзюка*



**Сідзюк Фама Ніканавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у в. Турная Кобрынскага раёна. З 1934 г. сакратар ячэйкі КПЗБ у роднай вёсцы, з 1935 г. падраённы сакратар КПЗБ Турнянскага ўчастка. У 1936 г. арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены ў Бяроза-Картузскі канцлагер. У 1937 г. вызвалены, аднак зноў арыштаваны. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939) працаваў у Кобрынскім гархарчгандлі. З 1941 г. у Чырвонай арміі, быў накіраваны ў Тамбоў (Расія), да 1945 г. служыў у савецкім тыле. Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў у Кобрыне. Памёр у 1991 г.

**Сідзюк** Фама Ніканавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.115.

**Камендант, С.** Віншуем юбіляра: [да 70-годдзя Ф.Н. Сідзюка] /С. Камендант //Камуністычная праца. – 1979. – 15 снежня.

## *Да 65-годдзя з дня нараджэння І.В. Соўпеля*



**Соўпель Ігар Васільевіч** - беларускі вучоны, спецыяліст у галіне інфарматыкі. Доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1994). Нарадзіўся 8 красавіка 1949 г. у в. Гарадзец. Закончыў матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1971). Працаваў у Інстытуце матэматыкі АН БССР. У 1976-1978 гг. аспірант кафедры матэматычнага забеспячэння аўтаматычнай сістэмы кіравання (АСК) БДУ. У 1980 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, з 1981 г. дацэнт. У 1991 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Аўтаматызаваная перапрацоўка тэкста на аснове ўзнаўленчага мадэліравання лінгвістычных аб'ектаў і працэсаў».

З 1997 г. загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. З'яўляецца навуковым кіраўніком лабараторыі інтэлектуальных інфармацыйных сістэм. Ён сфармуляваў і развіў канцэпцыю новага навуковага напрамку ў галіне штучнага інтэлекту - узнаўленчага мадэліравання лінгвіс-тычных аб'ектаў і працэсаў. Яго навуковыя і прыкладныя інтарэсы цесна звязаны з праектаваннем, разработкай і ўкараненнем сістэм аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў, уключаючы сістэмы лінгвістычных баз ведаў, семантычнага аналізу тэкстаў, аўтаматычнага рэферыравання, машыннага перакладу, інтэлектуальных інтэрфейсаў карыстальніка, інжэнерыі ведаў, інтэлектуалізацыі інфармацыйных сістэм. З'яўляецца аўтарам шэрагу вынаходніцтваў у галіне штучнага інтэлекту, якія запатэнтаваны ў міжнародных патэнтных фондах. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны такія знакамітыя ў сучаснай інфарматыцы інтэлектуальныя інфармацыйныя сістэмы, як Cobrain, Knowledgist, Vedy, Goldfive Intelligence, а таксама шэраг сістэм у межах важнейшых рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм, якія забяспечваюць і развіваюць камп'ютэрную форму існавання беларускай мовы. Ён з'яўляецца членам Навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 1999 г. узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

**Совпель** Игорь Васильевич //Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. - Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2.- С. 279.

**Соўпель** Ігар Васільевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.442.

### *Да 80 -годдзя з дня нараджэння А.З. Старыкавай*

**Старыкава Анастасія Зоцікаўна** нарадзілася ў 1934 г. у в. Лелікава. З 1949 г. працавала ў калгасах «Чырвоная Зорка» Кобрынскага раёна, імя Лесі Украінкі Валынскай вобласці (Украіна), саўгасах «Нежынскі» Качатаўскай вобласці

(Казахстан) і «Патрыкі» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971).

**Старыкава** Анастасія Зоцікаўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.428.

### *Да 75-годдзя з дня нараджэння А.С. Стоцкага*

**Стоцкі Аляксей Сямёнавіч** нарадзіўся ў 1939 г. у в. Стрыгава. Пасля службы ў радах Савецкай арміі стаў працаваць трактарыстам у калгасе імя Дзімітрава Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Стоцкі** Аляксей Сямёнавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.428.

### *Да 95-годдзя з дня нараджэння В.В. Сцёцкіна*



**Сцёпкін Валянцін Васільевіч** нарадзіўся ў 1919 г. у Кобрынскім раёне. У 1936 г. уступіў у падпольную арганізацыю КСМЗБ. З верасня 1943 г. баец партызанскага атрада імя Чапаева. З лістапада 1943 г. палітрук роты, са студзеня 1944 г. камісар атрада імя Малянкова, з мая 1944 г. начальнік штаба партызанскай брыгады імя Чапаева. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна накіраваны на савецкую работу ў Косаўскі раён Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны медалямі.

**Сцёпкін** Валянцін Васільевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.217: фат.

### *Да 85-годдзя з дня нараджэння М.М. Суботы*

**Субота Міхаіл Максімавіч** нарадзіўся ў 1929 г. у в. Лозкі Пружанскага раёна. Пасля службы ў радах Савецкай арміі і заканчэння Пінскага вучылішча механізацыі працаваў камбай-

нерам у Яроміцкай МТС, а з 1958 г. трактарыстам у калгасе імя Мічурына Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), медалём.

**Субота** Міхаіл Максімавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.428.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння Я.І. Тураўца*



**Туравец Якаў Іванавіч** нарадзіўся 7.11.1924 г. у г. Петрыкаў Гомельскай вобл. У пачатку 1940 г. разам з сям'ёй прыехаў у Брэст для аднаўлення Дняпроўска-Бугскага канала. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны сям'я не паспела эвакуіравацца, восенню 1942 г. фашысты расстралялі бацьку, маці, двух братоў і сястру, а Я.І.Тураўцу ўдалося ўцячы. Прыйшоў у Старасельскі атрад (з чэрвеня 1943 г. атрад імя М.М.Чарнака), з кастрычніка 1943 г. партызан, разведчык атрада імя Катоўскага Брэсцкага партызанскага злучэння. З красавіка 1944 г. у Чырвонай арміі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны закончыў ваеннае вучылішча, пазней ваенную акадэмію, інжынер-палкоўнік, выкладчык ВНУ.

**Туравец** Якаў Іванавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.226: фат.

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння П.П. Фацеева*



**Фацееў Пётр Піліпавіч** нарадзіўся ў 1924 г. у Маскве. 17 чэрвеня 1941 г. разам з маці і малодшымі братамі прыехаў у госці да сваякоў у в. Гарадзец Антопальскага (цяпер Кобрынскі) раёна. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны аказаўся на акупіраванай тэрыторыі, неўзабаве стаў сувязным атрада імя Кірава. З верасня 1943 г. разведчык партызанскага атрада імя Катоўскага, прымаў і апрацоўваў

зводкі Саўінфармбюро. З мая 1944 г. да кастрычніка 1946 г. служыў у Чырвонай арміі. Пасля дэмабілізацыі закончыў Маскоўскі энергетычны інстытут, працаваў загадчыкам аддзела вымярэнняў і вымяральнай тэхнікі пры інстытуце. Узнагароджаны медалямі.

**Фацееў** Пётр Пиліпавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.226.

## *Да 110-годдзя з дня нараджэння А.І. Федасюка*

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** - дзяржаўны дзеяч. Нарадзілася 17 жніўня 1904 г. у в. Андронава. Закончыла школу партыйных кадраў КПЗБ у Мінску (1929), Камуністычны універсітэт нацыянальных меншасцей Захаду ў Маскве (1934). З 1926 г. член Кобрынскага падпольнага райкама, з 1928 г. член Брэсцкага падпольнага акруговага камітэта КПЗБ. У кастрычніку 1931г. - сакавіку 1932 г. сакратар Навагрудскага акруговага камітэта КПЗБ. У 1929 - 1937 гг. сакратар ЦК КСМЗБ. З мая 1934 г. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова была зняволена польскімі ўладамі. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. дэпутат Народнага сходу Заходняй Беларусі, член яго паўнамоцнай камісіі на сесіі Вярхоўнага Савета СССР. Са студзеня 1940 г. на савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанах - сакратар Дзівінскага падпольнага райкама, член бюро Брэсцкага падпольнага абкама КП(б)Б. У 1944-1957 гг. сакратар Брэсцкага, Маладзечанскага гаркамаў КПБ, загадчык аддзела ЦК КПБ. Дэлегат I (1928), II (1935) з’ездаў КПЗБ, кангрэса КІМа (1933). Член ЦК КП(б)Б у 1949-1952 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1946-1954 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1940-1947 гг. Узнагароджана ордэнамі Леніна і Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Федосюк** Александра Ивановна //Регионы Беларуси: энциклопедия : в 7 т. - Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 433.

**Федасюк** Аляксандра Іванаўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. – С. 443-444.

### *Да 30-годдзя з дня нараджэння М.А. Ціхановай*

**Ціханова Марына Аркадзьеўна** - спартсменка. Нарадзілася ў 1984 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы. Прызёр чэмпіянатаў свету сярод юніёраў у 1999 г. (Польшча) і ў 2002 г. (Ямайка).

**Ціханова** Марына Аркадзьеўна //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.-С.444.

### *Да 80-годдзя з дня нараджэння А.І. Шымко*

**Шымко Аляксей Іванавіч** нарадзіўся ў 1934 г. у г. Кобрыне. Закончыў факультэт станкавага жывапісу завочнага народнага ўніверсітэта мастацтваў імя Крупскай (1959 г.), мастацкі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна факультэт ТГВМ (1964 г.). Алейны жывапіс і акварэль у стылі наіўнага рэалізму. Стваральнік тонкага лірычнага Кобрынскага краявіда.

**Шымко** Аляксей Іванавіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 526.

### *Да 55-годдзя з дня нараджэння У.М. Чыквіна*



**Чыквін Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1959 г. у г. Высокае Камянецкага раёна. Закончыў мастацкі факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (1985 г.). Працаваў выкладчыкам і майстрам разьбы па дрэву ў ПТВ-105 народных мастацкіх промыслаў. Працаваў выкладчыкам на мастацкам факультэце Брэсцкага педагагічнага універсітэта. Алейны жывапіс і графіка у рэалістычным стылі ў традыцыі віцебскай мастацкай школы. У

скульптуры развівае формаўтваральныя традыцыі 20-х гадоў мінулага стагоддзя. З 2004 г. з'яўляецца членам Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, у 2005 г. выбраны старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза майстроў.

**Чыквін** Уладзімір Мікалаевіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С. 526.

**Мельнік, Р.** Фігуры роду Сапегаў – у падарунак : [актыўны ўдзел у абласным пленэры разьбяроў манументальнай скульптуры прыняў кобрынскі народны майстар Уладзімір Чыквін] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік.– 2013. – 19 чэрвеня.

**Мошчык, С.** "Скарб" Берасцейшчыны : [аб абласным клубе майстроў народнай творчасці, кобрынскім майстры У. Чыквіне] /Сяргей Мошчык //Вечерний Брест. – 2011. – 9 декабря.

**Кандрашук, Н.** Сустракаліся майстры народнага мастацтва :[кобрынскія рамеснікі У. Чыквін і В. Дароцька ўдзельнічалі ў беларуска-шведскім семінары разьбяроў] /Наталья Кандрашук //Кобрынскі веснік. – 2011. – 15 кастрычніка. – С.12.

**Мельнік, Р.** Майстар. Аднойчы і пажыццёва: [аб народным майстры У. Чыквіне] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік. – 2011. – 17 красавіка. – С.1.

**Кобринский** мастер Чиквин //Кобрин-информ. – 2011. – 15 апреля. – С.2.

**Кобринский** мастер оценивает шведских мастеров: [В. Чиквин – член Белорусского союза мастеров народного творчества Республики Беларусь] //Кобрин-информ.– 2009. – 17 сентября. – С.28.

**Чыквін, У.** "А творчае жыццё ўсё ў плённай працы" /Уладзімір Чыквін //Кобрынскі веснік. – 2009. – 22 ліпеня. – С.6.

**Шевченко, А.** В творческой мастерской Владимира Чиквина /Алла Шевченко //Кобрин-информ. – 2006. – 3 августа.

**Хильчук, М.** Рук мастерство и дерева тепло: [о кобринском художнике В. Чиквине]/Мария Хильчук //Кобрынскі веснік. – 2005. – 21 верасня. – С.3.

**Данилова, Е.** Не только состояние души : [о выставке работ В. Чиквина – художника и скульптора] /Е. Данилова //Кобрин-информ. - 2004. – 18 марта. – С.3.

**Трибулёва, Е.** Соло для деревянной ложки: [о коллекции резчика по дереву В. Чиквина, кобринского умельца] /Е. Трибулёва //Вечерний Брест. – 2004. – 28 января. – С.2.

### *Да 90-годдзя з дня нараджэння Ф.Ф. Швайко*



**Швайко Фёдар Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Стрыі Кобрынскага раёна. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў семнаццацігадовым узросце стаў сувязным партызанскіх груп. З сакавіка 1943 г. у атрадзе імя Чапаева, са студзеня 1944 г. у брыгадзе імя Чапаева, спачатку радавы, потым камандзір аддзялення узвода, апошнія паўгода перад расфарміраваннем брыгады - камандзір роты. Удзельнік вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. У ліпені 1944 г. накіраваны на працу ў аддзел міліцыі Кобрына. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Швайко** Фёдар Фёдаравіч //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002.- С.227.

### *Да 100-годдзя з дня нараджэння А.К. Шварцкопфа*

**Шварцкопф Аляксей Карлавіч** нарадзіўся ў 1914 г. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Даслужыўся да камандзіра 2-й батарэі 533-га армейскага знішчальнага процітанкавага артылерыйскага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Шварцкопф** Аляксей Карлавіч//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.239: фат.

# Юбілеі прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна

## Пракуратуры Кобрынскага раёна – 75 гадоў




Пракуратура Кобрыншчыны бярэ пачатак з верасня 1939г. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна ў ліпені 1944 г. пракурорам раёна быў прызначаны юрыст 1 класа Лукоўкін А.В. У тыя гады ў штаце пракуратуры практычна не было супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй, на працу прыходзілі былыя франтавікі, якія скончылі трохмесячныя юрыдычныя курсы і працягвалі завочнае навучанне.

Уклад ва ўмацаванне законнасці ў раёне ўнеслі пракурорскія працаўнікі Кобрыншчыны Якіменкаў В.І., Міжэўскі І.С., Маеўскі І.А., Капітан В.С., Пархачук А.А., Амельянюк В.В., Сцепанюк Е.М., Запарошчанка М.І. і іншыя.

У 1978 году, яшчэ студэнтам Калінінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, прыйшоў на службу ў органы пракуратуры выхадзец з Кобрыншчыны Валерый Васільевіч Амельянюк. За шэсць першых гадоў службы ён прайшоў шлях ад стажора да намесніка пракурора Кобрынскага раёна.

Прыкладам добрасумленнага выканання свайго службовага абавязку, таленавітым і справядлівым кіраўніком быў Кобрынскі міжраённы пракурор Васіль Сцяпанавіч Капітан, які з лютага па снежань 1996 г. з'яўляўся Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.

30 сакавіка 2010 г. пракуратуру Кобрынскага раёна ўзначаліў А.І. Петрасюк. М.І. Запарошчанка, адпрацаваўшы 10 гадоў пракурорам Кобрынскага раёна, узначаліў пракуратуру ў Пружанах.

Пракуратура Кобрынскага раёна забяспечвае нагляд за законнасцю дзеянняў следчага апарата, работы міліцыі, абгрунтаванасці прымаемых рашэнняў суда.

**Белов, Д.** Помочь и защитить : [о старшем помощнике прокуратура Кобринского района Марине Свистунович] / Дмитрий Белов //Кобрынскі веснік. - 2013. - 19 чэрвеня. - С.3.

**Петросюк, А.** Неукоснительно соблюдать закон : [осуществляя надзор за исполнением законодательства об обращениях граждан, прокуратура района в 1 полугодии 2013 г., провела проверки] / Александр Петросюк // Кобрынскі веснік. - 2013. -14 верасня. - С. 3.

**Петросюк, А.** "Соблюдению законности – безоговорочный приоритет" : [о работе Кобринской прокуратуры] / Александр Петросюк //Кобрынскі веснік. - 2013. - 26 чэрвеня. - С.1, 2.

**Петросюк, А.** “Цель – верховенство закона” : [принятые Кобринской прокуратурой меры позволили добиться снижения преступлений] /Александр Петросюк //Кобрынскі веснік. - 2013.- 2 лютага. - С.3.

**Петрасюк, А.** Не пакараць, а папярэдзіць : [гутарка з пракурорам Кобрынскага раёна] /Аляксандр Петрасюк, гутарыў Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. - 2012. – 23 чэрвеня. - С.2.

**Петросюк, А.** Вести наступательную борьбу: [о работе органов прокуратуры, направленной на борьбу с коррупцией и преступностью] /Александр Петросюк //Кобрынскі веснік. - 2012. – 11 лютага. - С.3.

**Федаровіч, І.** Вартавыя законнасці : [пракуратура Кобрынскага раёна] /Ігар Федаровіч //Кобрынскі веснік. - 2011. – 3 снежня. - С.1.

**Петросюк, А.** Алло! Прокуратура слушает…: [о работе прокуратуры с обращениями граждан рассказывает прокурор А. Петросюк]/А. Петросюк, беседовала Жанна Елизарова //Кобрин-информ. - 2010. – 2 сентября. - С.3.

**Петросюк, А. И**. Прокуратура стоит на страже законности: [о задачах районной прокуратуры в текущем году] / А. Петросюк, беседовала Маргарита Савчук //Кобрин-информ. - 2010. – 22 апреля. - С.4.

**Савчук, М.** Они стоят на страже законности : [прокуратура Кобринского района]/Маргарита Савчук //Кобрин-информ. – 2010. – 1 июля. - С.4.

**Пракуратура** пераехала : [7 верасня пракуратура раёна справіла наваселле ў будынку былой шахматнай школы па вуліцы Савецкай] //Народная трыбуна. –2009. –12 верасня. – С.3.

**Запорощенко, М.И**. Важное звено государственнной системы : [о работе прокуратуры Кобринского района /Михаил Запорощенко] // Кобрынскі веснік. - 2008. - 30 жніўня. - С.1,2.

**Запорощенко, М**. Приоритеты прокурорской работы /Михаил Запорощенко // Кобрынскі веснік. - 2008. - 30 жніўня.

**Запарошчанка, М.** На варце захавання законнасці : [аб пракуратуры Кобрынскага раёна]/М. Запарошчанка //Кобрынскі веснік. – 2002. – 26 чэрвеня. – С.2.

## Аддзелу ўнутраных дзел Кобрынскага райвыканкама- 75 гадоў






Міліцыя Брэстчыны, у тым ліку Кобрыншчыны, бярэ пачатак з верасня 1939 г., пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі з Беларускай ССР. Ужо на чацвёрты дзень пасля гістарычнага ўз'яднання быў выдадзены Загад № 5 ад 21 верасня 1939 г., у якім прадпісвалася Часовым Кіраванням гарадоў стварыць грамадзянскую міліцыю, усклаўшы на яе ахову рэвалюцыйнага парадку і барацьбу з крымінальна-злачыннымі элементамі.

Наступным этапам станаўлення органаў унутраных спраў Брэсцкай вобласці стала выданне загада НКУС СССР № 001337

ад 2 лістапада 1939 г. "Пра арганізацыю органаў КВД Заходняй Беларусі". Паводле гэтага загада было створана Кіраванне НКУС па Пінскай вобласці, у склад якога ўвайшлі Столінскі, Драгічынскі, ***Кобрынскі,*** Косаўскі, Лунінецкі, Брэст-Літоўскі, Пружанскі павятовыя аддзелы НКУС. 29 лістапада 1939 г. быў выдадзены загад НКУС СССР № 001441 пра утварэнне Кіравання НКУС па Брэст-Літоўскай вобласці Беларускай ССР з дыслакацыяй у горадзе Брэст-Літоўску. Гэтым жа загадам Кіраванню НКУС па Брэст-Літоўскай вобласці былі падпарадкаваны Пружанскі і Кобрынскі павятовыя аддзелы НКУС. Менавіта гэты дзень прынята лічыць днём утварэння міліцыі Брэстчыны.

Слаўны і гераічны шлях прайшла кобрынская міліцыя. Актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам, злачыннасцю прымалі першыя ўчастковыя інспектары А.І. Ратайка, К.П. Тур, М.І. Барздун. Гераічны шлях у гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў участковы М. М. Шаўчук, які за мужнасць і гераізм быў узнагароджаны 12 ордэнамі і медалямі.

Слаўныя баявыя традыцыі пераймалі і наступныя пакаленні работнікаў міліцыі. Супрацоўнікі міліцыі праяўлялі мужнасць, адвагу, вернасць абавязку пры нясенні нялёгкай службы пры ахове грамадскага парадку і барацьбой са злачыннасцю. У 90-я г. 20 ст. сярод лепшых супрацоўнікаў Кобрынскага ГРАУС : оперупаўнаважаныя аддзела крымінальнага вышуку Ю.П. Дзедзюк, П.М. Магуйла, нам. начальніка АБЭЗ Г.П.填ератолчын, оперупаўнаважаныя АБЭЗ А.У. Макарук, В.В. Вішнеўскі, участковыя інспектары С.В. Цімашчук, А.А. Кананчук, М.Ф. Ігнацюк і інш.

На працягу 1983 -1995гг. аддзел унутраных спраў лідзіраваў сярод падобных аддзелаў у вобласці. Доказам гэтага з'яўляецца ўзнагароджанне Кобрынскага ГРАУС тройчы пераходным Чырвоным Сцягам УУспраў аблвыканкома.

У студзені 1998 г. быў створаны ансамбль народнай музыкі і песні Кобрынскага ГРАВУС, які адразу заваяваў папулярнасць не толькі ў Кобрыне.

У лістападзе 2009 г. Кобрынскі раённы аддзел унутраных спраў адзначыў сваё 70-годдзе, у гэты ж дзень адбылося

адкрыццё новага будынка РАУС. Усе службы Кобрынскага аддзела РАУС зараз размешчаны ў адным месцы (раней такія службы, як МРЭО, ДАІ, ІДН, крымінальна - выканаўчая інспекцыя, аддзяленне па грамадзянстве і міграцыі, былі «раскіданы» па ўсім горадзе). У новым будынку - прасторныя кабінеты, абсталяваныя новай тэхнікай, у тым ліку больш 100 новых камп'ютараў.

За вынікі аператыўна-службовай дзейнасці ў 2011 г. Кобрынскі РАУС атрымаў нямала ўзнагарод. Па-першае, яго прызналі першым на Брэстчыне сярод аддзелаў сваёй катэгорыі. Па-другое, лепшымі ў вобласці сталі адразу шэсць падраздзяленняў РАУС.

**Аб узнагароджанні** медалём "За бездакорную службу" 1, 2, 3 ступені : Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь от 29 сакавіка 2013 г. №136: [медалём "За бездакорную службу" 2 ступені ўзнагароджаны начальнік Кобрынскага раённага аддзела следчага камітэта, падпалкоўнік юстыцыі Зарэцкі Пётр Пятровіч] //Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. - 2013. - № 17. - С.15.

**Бенедисюк, Р.П.** Коррупционные преступления на Кобринщине выявляют и пресекают сотрудники ОБЭП /Р.П. Бенедисюк //Кобрин-информ. - 2013. - 26 сентября. - С.6.

**"Проинспектировали"** участковых : [работа участковых инспекторов обсуждалась в Кобрине на расширенном совещании служб ОВД] / Иван Сергеев // Заря. - 2013. - 17декабря. - С.3

**Савчук, М.** Анализ, планирование, контроль... : [сегодня штаб районного отдела милиции успешно возглавляет майор милиции В.В.Турчинович] /Маргарита Савчук //Кобрин-информ. - 2013.- 5 декабря. - С.5.

**Савчук, М.** На секретной службе в милиции : [о режимно-секретной службе Кобринского райотдела милиции] / Маргарита Савчук //Кобрин-информ. - 2013. - 28 ноября. - С.6.

**Савчук, М.** По велению души : [ко Дню чествования ветеранов ОВД РБ - о начальнике милиции общественной

безопасности и специальной милиции С.Ф. Антонюке /Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2013.- 7 ноября. - С.6.

**Савчук, М.** По стопам отца : [в Кобринском РОВД немало династий, одна из них - семья Головко] / Маргарита Савчук //Кобрин-информ. - 2013. - 16 мая. - С.4.

**Светава, Я.** Участковага павінны ведаць у твар: [на Кобрыншчыне адбылася выязная пашыраная нарада супрацоўнікаў прафілактычных службаў органаў унутраных спраў вобласці] / Яна Светава //Звязда. - 2013. -18 снежня. - С.2.

**Список** участковых Кобринского РОВД //Кобрин-информ. - 2013. - 11 апреля. - С.4.

**Мельнік, Р.** Са святам, мая міліцыя! : [дзве старонкі газеты прысвечаны кобрынскай міліцыі] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік. – 2013. – 2 сакавіка. – С.1,3.

**Савчук, М.** В память о погибших сотрудниках милиции : [открыт памятный знак сотрудникам Кобринского РОВД, погибшим при исполнении служебных обязанностей] /Маргарита Савчук //Кобрин-информ. – 2013. – 7 марта. - С.4.

**Суббота, М.** Милиция отвечает за безопасность людей /Максим Суббота //Кобрин-информ. – 2011. – 9 августа. – С.4.

**Мельнік, Р.** "Аператыўны дзяжурны слухае…": [круглыя суткі нясуць варту супрацоўнікі аператыўна-дзяжурнай службы РАУС] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік – 2012. – 3сакавіка. - С.4.

**"Служым** народу!" : [па выніках работы за 2012 г. Кобрынскі РАУС прызны адным з лепшых на Брэстчыне]//Народная трыбуна. – 2012. – 2 сакавіка. – С.1.

**Рекуц, С.** "Форменное" новоселье : [5 ноября состоялась церемония открытия нового здания Кобринского РОВД] /Сергей Рекуц //Заря. – 2009. – 10 ноября. – С.2.

**Сайт** управления внутренних дел Брестского облисполкома http://uvd.brest.by/struktura-ovd/go-rovd/38/

## Кобрынскаму ваеннаму камісарыяту – 70 гадоў






Асноўныя крытэрыі работы **Кобрынскага ваеннага камісарыята** - гатоўнасць да правядзення мабілізацыі людскіх і транспартных рэсурсаў на тэрыторыі раёна ў мірны і ваенны час, а таксама стан улікова-прызыўнай працы ў ваенкамаце, поўнасць і якасць правядзення мерапрыемстваў па тэрытарыяльнай абароне.

Менавіта ваенны камісарыят з'яўляецца асноўным звяном для мабілізацыі ваеннаабавязаных і фармаванні войскаў у ваенны час. Мабілізацыйнае аддзяленне Кобрынскага РВК, якім кіруе падпалкоўнік С.М. Макараў, прызнана лепшым сярод мабілізацыйных аддзяленняў райгарваенкаматаў вобласці.

Штогод для павышэння кваліфікацыі вайсковага рэзерву больш 100 звольненых у запас салдатаў і афіцэраў з Кобрына і раёна праходзяць ваенныя зборы. На тэрыторыі раёна арганізоўваюцца тэрытарыяльныя войскі, вядзецца падрыхтоўка кадравага патэнцыялу для забеспячэння задач тэрытарыяльных войскаў. Гэтым займаецца ваенны камісарыят. У задачу камісарыята ўваходзіць і забеспячэнне мабілізацыйнай гатоўнасці транспартных сродкаў да пастаўкі ва Ўзброеныя Сілы ў перыяд правядзення мабілізацыі. За 2009 год Кобрынскі раённы ваенкамат заняў 1 месца сярод ваенных камісарыятаў Брэсцкай вобласці.

На ўліку ў Кобрынскім райваенкамаце больш 4 тысяч чалавек. Найважнейшым кірункам працы з'яўляецца набор юнакоў у групы па навучанні ваенна-тэхнічным спецыяльнасцям.

Клопат пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, а

таксама пра ваенных пенсіянераў - таксама прамы абавязак ваенкамата.

**Мельнік, Р.** Служыць Айчыне!: [На Кобрыншчыне распачалася чарговая прызыўная кампанія] /Раман Мельнік ; фота аўтара //Кобрынскі веснік. - 2013. - 20 сакавіка. - С. 2.

**Круглов, И.В.** И снова призыв: [Кобринский комиссариат возглавил подполковник И.В. Круглов] /И.В. Круглов, беседовала Маргарита Савчук//Кобрин-информ.–2012.–29 марта.

**Круглоў, І.** “Прэстыж арміі сёння высокі, як ніколі…”: [гутарка з ваенным камісарам Кобрынскага ваенкамата] /Ігар Круглоў, гутарыў Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2012. – 22 лютага. – С.2.

**Васюк, Н.** Военкомату–«отлично» /Наталья Васюк //Кобрин-информ. – 2010. – 28 января. – С.2.

**Медаль** ад фонду імя Жукава: [знакам “За мужнасць і любоў да Айчыны 1941-1945гг” узнагароджаны ваенны камісар В. Пракапюк]//Кобрынскі веснік. – 2009. – 15 ліпеня. – С.3.

**Васюк, Н.** Военкомат в будни и праздники /Наталья Васюк //Кобрин-информ. – 2008. – 10 апреля. – С.4.

**Кобринский** военкомат в числе лучших//Кобрин-информ. – 2008. – 10 января.

**Мельнік, Р.** Не толькі прызыў на службу: [ аб рабоце раённага ваеннага камісарыята] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік. – 2008. – 5 красавіка. – С.3.

## Установе “Рэдакцыя раённай газеты “Кобрынскі веснік” і праграме радыёвяшчання “Кобрынскае раённае радыё” – 75 гадоў

Кобрынскі Веснік



Раённая газета ў Кобрыне выдаецца з верасня 1939 г. Спачатку называлася «Труд», з 1953 г. - «Праца», са студзеня 1963 г. - «Камуністычная праца», з 1991 г. - «Кобрынскі веснік». З

чэрвеня 1941 па жнівень 1944 газета не выдавалася. Выходзіць 2 разы ў тыдзень на беларускай і рускай мовах. У асноўных рубрыках «Навіны», «Ваенна-патрыятычнае выхаванне», «Адно акно», «Добраўпарадкаванне», «Рэдакцыя слухае!», «Адраджэнне сяла», «Прырода і экалогія» публікуюцца афіцыйныя паведамленні, дакументы, асвятляецца жыццё раёна, распавядаецца пра найболей значныя дасягненні жыхароў Кобрыншчыны. Пастаянныя тэматычныя палосы «Культура», «Эканоміка», «Здаровы лад жыцця», «Бізнэс-клас» і іншыя прысвечаны жыцці моладзі, суб'ектам гаспадарання розных формаў уласнасці, экалагічным праблемам, бяспецы на дарогах, творчасці паэтаў і празаікаў раёна.

У структуру рэдакцыі ўваходзіць і «Кобрынскае раённае радыё».


**Астаповіч, А.** На ўсё жыццё: [аб газеце "Кобрынскі веснік"] /Аркадзь Астаповіч //Нашчадкам слова застаецца. – Брэст, 2001. - С. 81-82.

**Гісторыя** газетным радком. Па старонках кобрынскай раённай газеты //Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.421-426.

**"Камуністычная праца"**, газета, орган Кобрынскага РК КПБ і раённага Савета народных дэпутатаў // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя. В 5 т. – Мінск, 1980. – Т.3. - С.258.

**"Камуністычная праца",** газета, орган Кобринского РК КПБ и районного Совета народных депутатов // Белорусская ССР: краткая энциклопедия. В 5 т. – Минск, 1980. – Т.3. - С.250.

**Куцэра, Г.Д.** Карэспандэнты «Камуністычнай працы" / Г.Д. Куцэра //Раённая ў пошуку. - Мінск, 1974. – С. 81-82.

**Пянко, А.М.** Кобринское районное радио /А.М. Пянко //Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С.483.

**Пянко, А.М.** "Кобрынскі веснік" /А.М. Пянко //Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С.484.

**Мельнік, Р.** У кожную сям'ю – з дабром!: [ у рамках Дня падпісчыка супрацоўнікі "Кобрынскага весніка" арганізавалі сустрэчу са сваімі чытачамі] / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2013. – 18 снежня. – С.1,2.

**Мельнік, Р.** Сучаснасць у віртуальнай прасторы: [сайту газеты "Кобрынскі веснік" у сакавіку споўнілася 4 гады] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 красавіка. – С.2.

**За патрыятычнае** выхаванне: [па выніках рэспубліканскага конкурсу "Кобрынскі веснік" узнагароджаны граматай Міністэрства абароны] //Народная трыбуна. – 2012. – 24 лютага. – С.1.

**Мельнік, Р.** Чарговая перамога "Мерыдыяна": [ на абласным конкурсе "Слова маладых" сярод раённых газет лідзіруе "Кобрынскі веснік"]/ Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2012. – 6 студзеня. – С.2.

**Міхалевіч, Г.** Чаканне сустрэчнага руху: [У абласным конкурсе "На лепшае асвятленне ў СМІ прадпрымальніцкай дзейнасці" "Кобрынскі веснік" прызнаны лаўрэатам ] / Галіна Міхалевіч // Народная трыбуна. – 2012. – 13 красавіка. – С.3; Заря. – 2012. – 10 апреля. – С.1,4.

**За выхаванне** патрыётаў: ["Кобрынскі веснік" узнагароджаны дыпломам Міністэрства інфармацыі] //Народная трыбуна. – 2011. – 26 лютага. – С.1.

**Мороз, Е.** Слово молодым и … талантливым: [победителем в областном журналистском конкурсе стал корреспондент из Кобрина Р. Мельник] / Евгения Мороз // Заря. – 2010. – 30 декабря. – С.19.

**Пянко, А.** Кожны нумар нясе пазітыў: [аб газеце "Кобрынскі веснік"] Аляксей Пянко //Кобрынскі веснік. – 2010. – 12 чэрвеня. – С.1,2.

**Гурецкий, А.** «Говорит Кобрин»: [Из опыта работы районного радио] / А.Гурецкий //Заря. – 1964. – 27 декабря.

**Сайт** газеты "Кобрынскі веснік" www.vkobrine.by

## Адкрытаму акцыянернаму таварыству “Кобрынскі масласыраробчы завод” – 75 гадоў



**Адкрытае акцыянернае таварыства “Кобрынскі масласыраробчы завод”** заснавана ў 1939 г. як маслазавод. Пасля Вялікай Айчыннай вайны рэканструяваны. У пачатку 1950-х гадоў на прадпрыемстве працавала каля 30 чалавек, штодзень перапрацоўвалася зімой каля 300 л малака, летам -20 т. У 1967 г. пабудаваны новы завод, магутнасць якога была разлічана на перапрацоўку 50 т малака за змену. У выніку мадэрнізацыі вытворчасці адбыўся пераход ад разліву малака ў флягі да выпуску яго ў поліэтыленавых пакетах, ад вагавага тварагу ў флягах да фасаванага ў пакетах. Было здадзена ў эксплуатацыю прыёмна-мыйнае аддзяленне, рэканструяваны кампрэсарны цэх, кацельня, цеплапункт, апаратны ўчастак, у 1989 г. уступіў у строй цэх сухога абястлушчанага малака. У 1997 г. набыў статус адкрытага акцыянернага таварыства. Пастаўшчыкамі з’яўляюцца гаспадаркі і прыватны сектар Кобрынскага раёна. Прадпрыемства забяспечвае пастаўшчыкоў мыйнымі і дэзінфекцыйнымі сродкамі, дробным інвентаром, транспартам, ёмістасцямі для збору малака, халадзільнікамі. Акрамя таго, праводзіцца закупка малака ў насельніцтва. Для развіцця сельскагаспадарчай базы прадпрыемства ў 1999 г. зрасходавала 6,6 млрд. рублёў уласных сродкаў, у тым ліку 3,6 млрд. на набыццё інвентару і абсталявання, 3 млрд. на будаўніцтва малакапрыёмнага пункта, 10 халадзільнікаў для ахалоджвання малака ў гаспадарках.

Для абслугоўвання даільнага і халадзільнага абсталявання малочнатаварных ферм на заводзе створаны спецыяльны механізаваны атрад і спецыяльны транспартны ўчастак, асноўнай

задачай якога з'яўляецца захаванне якасці ў працэсе транспарціроўкі - гэтай мэце служаць 27 новых аўтамалочных цыстэрнаў з нержавеючай сталі. Што ж датычыцца работы па кантролю якасці на самім прадпрыемстве, то тут яна працягваецца літаральна на ўсіх этапах - ад першага з'яўлення цыстэрны з малаком да канчатковай адгрузкі гатовай прадукцыі.

## Кобрынскаму раённаму вузлу электрасувязі Брэсцкага філіяла рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Белтэлекам"- 75 гадоў

Сёння на Кобрыншчыне налічваецца больш за 37 тысяч тэлефонных аппаратаў. Заявы на ўстаноўку тэлефона разглядаюцца ў самыя кароткія тэрміны.

Аднак сучасная электрасувязь, спектр якой прадастаўляе Кобрынскі РВЭС, не абмяжоўваецца адным толькі тэлефонам. Штодзень расце колькасць абанентаў высакаскораснага інтэрнэта byfly, якая сення складае больш за 8 тысяч чалавек. Набірае папулярнасць і інтэрактыўнае тэлебачанне ZALA.

Развіваецца сфера электрасувязі ў сельскай мясцовасці. Вузлы перадачы даных ёсць не толькі ў вёсках Вялікія Лепясы, Дзівін, Павіцце, насельніцтва якіх звыш 1,5 тысячы чалавек, але і яшчэ ў 20-ці вёсках. Тэхнічнае пераўзбраенне робіць паслугі РВЭС даступнымі ўсё ў новых і новых населеных пунктах.


**З узнагародай**: [Васільчук В.В., кабельшчык-спайшчык Кобрынскага кабельнага участка прадпрыемства электрасувязі "Белтэлекам", Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узнагароджаны медалём "За працоўныя заслугі"]//Кобрынскі веснік.- 2013. - 18 снежня. - С.1.

**Информ – курьер**: местные новости: [сотрудники РУЭС осуществили ввод эксплуатационных узлов передачи данных на территории района] //Кобрынскі веснік. - 2011. - 9 лютага. - С.1.

**Интернет** стал доступнее: [в Кобрине появились три новые точки доступа к высокоскоростному Интернету] //Кобрынскі веснік. - 2011. – 12 студзеня. - С.1.

**Савчук, М**. Вместо домашнего телефона – мультимедийная платформа: [о том, как и для чего внедрена телефония нового поколения] /Маргарита Савчук //Кобрин-информ. - 2011. -15 декабря. - С.2.

**Бялоў, Дз.** Сувязь: самы шырокі спектр паслуг: [Кобрынскі РВЭС] /Дз. Бялоў //Кобрынскі веснік. - 2010. - 24 лютага. - С.4.

**Інфармкур’ер**: мясцовыя навіны: [з 1 кастрычніка Кобрынскім РВЭС уведзены ў эксплуатацыю 4 новыя вузлы перадачы даных у вёсках]//Кобрынскі веснік. - 2010. - 16 кастр. - С.1.

**Дорофеев, А.В.** «Новые шаги в развитии связи»: [интервью с начальником Кобринского РУЭС] / А.В.Дорофеев, беседовала Н.Васюк //Кобрин-информ. - 2010. - 6 мая. - С.2.

**Орлова, И.** У ворот с Евросоюзом – по-европейски: [ новые информационные технологии помогают почтовикам Кобринщины находить кратчайший путь к клиенту] / И. Орлова //Народная газета. - 2010. - 27 кастрычніка. - С.4.

**Рекуц, С**. Какой агрогородок не любит быстрой сети?: [в агрогородке Дивин открылся первый в области сельский центр общественного доступа в Интернет] /Сергей Рекуц //Заря. - 2010. - 13 ноября. - С.4.

**Бялоў, Дз.** Падарунак ад “Белтэлекама”: [урачыста адкрыты новы сэрвісны цэнтр] / Дз. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 19 верасня. - С.1,2.

**Дорофеев, А.В.** «Все лучшее в нашей отрасли есть в Кобрине»: [начальник Кобринского РУЭС рассказывает о работе предприятия ] /А.В.Дорофеев //Кобрин-информ. - 2009. - 7 мая.

**Васюк, Н.** РУЭС на связи: [почетное звание «Человек года» в области транспорта и связи присвоено начальнику Кобринского РУЭС А.В.Дорофееву]/Н.Васюк //Кобрин-информ.- 2007. - 10 мая. - С.3.

**Пянко, А**. На пульсе динамичной жизни:[телефонизация в Кобринском районе] /А.Пянко //Кобрынскі веснік. - 2006. - 23 верасня. - С.2.

**Дубчук, Ф.** Сувязь Кобрыншчыны прырастае нумарамі: [у 2000 г. у раёне пашырылася нумарная ёмістасць гарадской і сельскай тэлефоннай сеткі] /Ф.Дубчук //Кобрынскі веснік. - 2001. - 1 студзеня. - С.4.

# Юбілеі ўстаноў адукацыі раёна

## Дзяржаўнай сацыяльна-педагагічнай установе “Кобрынская дзіцячая вёска” – 20 гадоў






**Кобрынская "Дзіцячая вёска"** - незвычайнае паселішча ў горадзе са своеасаблівымі правіламі, парадкамі і жыццём. Паабапал сцежак і дарог - прыгожыя дрэўцы і клумбы. Навокал цікавыя ландшафтныя ўпрыгожванні, дзіцячыя пляцоўкі, прывабныя катэджы.

Дзяржаўная сацыяльна-педагагічная ўстанова адукацыі "Кобрынская "Дзіцячая веска" была арганізавана ў 1994 г. У снежні 1994 г. дзіцячая вёска налічвала 6 дамоў, і ў іх выхоўваліся 60 дзяцей-сірот. Гэта першая ўстанова такога тыпу ў рэспубліцы для выхавання дзяцей-сірот. Праз яе прайшлі больш за 230 дзяцей. Сёння тут працуюць 15 дамоў, у якіх выхоўваюцца 116 дзяцей ад 3-х да 18-ці гадоў За кожным домам замацавана маці- выхавальнік, якая жыве разам з дзецьмі, і памочнік па гаспадарцы. У чатырох дамах жывуць паўнацэнныя сямейныя пары, а некаторыя нават прыехалі са сваімі роднымі дзецьмі. У сем'ях у сярэднім па 7-9 выхаванцаў.15 мам і 3 таты выхоўваюць крыху больш за сотню дзяцей. І ўжо больш за сотню выпускнікоў пайшло “ў вялікі свет”(2011г.).

Кобрынскую "Дзіцячую вёску" падтрымліваюць многія прадпрыемствы нашай краіны, грамадскія арганізацыі. Да святаў сюды заўсёды прыязджаюць з падарункамі. Акрамя агульных спонсараў за кожным домам замацаваны шэф - прадпрыемства, якое дапамагае канкрэтнай сям'і.

На думку дырэктара дзіцячай вёскі Алы Сапяжынскай, такая ўстанова адукацыі - лепшая форма сямейнага выхавання дзяцей-сірот. У братоў і сясцёр ёсць магчымасць застацца разам, дзеці набываюць сабе бацькоў, выхоўваюцца ва ўзаемапавазе, атрымліваюць неацэнны вопыт сямейных зносін.

**Бунеева, Л**. Мама на пороге дома: [о Кобринской детской деревне]/ Л. Бунеева //Брэстчына вачамі журналістаў. – Брэст: ААТ "Брэсцкая друкарня", 2005. – С.128-134.

**Пашкович, Л.** Детской деревне - 19!: [19-й день рождения отметила Кобринская детская деревня, где проживают 120 ребят]/Людмила Пашкович //Кобрин-информ. - 2013. - 21снежня. С.4.

**Пилипчук, Г. Л.** Реальная бабушка: [о воспитателе дома "Кобринской детской деревни" С.В. Грицук] /Г.Л. Пилипчук //Кобрин-информ. - 2013.- 17 октября. - С. 5.

**Ради** детских улыбок : [Кобринская детская деревня] //Кобрин-информ. - 2013. - 2 мая. - С. 5.

**Бялоў, Дз.** Усё было не дарэмна…: [Кобрынскай дзіцячай вёсцы – 18 гадоў]/Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2012. - 19 снежня. – С.2.

**Казакова, А.** Бабушка для Владика: [у детей детской деревни есть не только родители, но и бабушки, и дедушки] /Анна Казакова //Кобрин-информ. – 2012. – 4 октября. – С.4.

**Васюк, Н.** Мамина деревня: [Кобринская детская деревня] /Наталья Васюк //Вечерний Брест.– 2011. – 14 октября. – С.4.

**Занько, Н.** "Тут для дзяцей дом…": [жыццё ў дзіцячай вёсцы мала чым адрозніваецца ад жыцця звычайнай сям'і] /Настасся Занько //Кобрынскі веснік. – 2011. – 17 снежня. – С.2.

**Галянчук, Г.** Сагрэтыя сэрцы: [116 дзяцей знайшлі сабе сем'і ў Кобрынскай дзіцячай вёсцы] /Ганна Галянчук //Народная трыбуна. – 2010. – 25 верасня. – С.4.

**С приветом** из Италии: [кобринская детская деревня принимает гостей из Италии] //Кобрин-информ. – 2010. – 15 апреля. – С.2.

**Бялоў, Дз.** “Дзякуй за жыццё! Мы – з Кобрынскай вёскі”: [Кобрынская дзіцячая вёска адзначыла сваё 15-годдзе]/Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2009. - 16 снежня. – С.2.

**Васюк, Н.** Торт для детской деревни: [Кобринская детская деревня благодарна своим шефам и спонсорам] /Наталья Васюк //Кобрин-информ . – 2009. – 24 декабря. – С.3.

**Сапяжынская, А.** “Галоўнае – сям’я”: [размова з дырэктарам ДСПУ “Кобрынская дзіцячая вёска” А. Сапяжынскай] /Ала Сапяжынская, гутарыў Дз. Бялоў //Кобрынскі веснік. - 2009. – 7 сакавіка. – С.1-2.

**Лисичик, Т.** “Чужие” родные дети: [кобринская детская деревня первая в республике для детей-сирот перешагнула 10-летний юбилей]/Т. Лисичик //Брестский курьер. – 2004. – 16 декабря. – С.27.

## ДУА «Дзіцячы сад - сярэдняя школа № 4 г. Кобрына” – 55 гадоў



**Сярэдняя школа № 4** г. Кобрына здадзена ў эксплуатацыю ў верасні 1959 г. Школа была пабудавана за кошт сродкаў Міністэрства асветы і абароны. Будынак школы быў разлічаны на 400 месцаў. Кантынгент навучэнцаў і педагагічны калектыў былі сфармаваны за кошт школ № 1,2,3. Вучнёўскі калектыў у верасні 1959 года склаў 457 навучэнцаў. Дырэктарам школы быў прызначаны Лявонцій Аляксеевіч Лешчык, намеснікам дырэктара – Васіль Васільевіч Барысенка.

У 1960-1961 навучальным годзе адбыўся першы выпуск навучэнцаў школы ў колькасці 27 чалавек. Два першых дзесяцігоддзі школы прайшлі пад лозунгам удасканалення навучальна-выхаваўчай працы і здаровага фізічнага развіцця навучэнцаў. У 1971 г. школа ўзнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства Асветы СССР і камплектам спартыўнага інвентара. Ганаровай граматай МП СССР быў таксама

ўзнагароджаны дырэктар школы Лешчык Л.А. і настаўнік фізкультуры Амельянюк А.Т.

У 1987 году дырэктарам школы прызначана Ніна Якаўлеўна Яўтуховіч. Працягваецца вялікая праца па патрыятычным выхаванні, дзе самы актыўны ўдзел прымаюць шэфы вайсковай часткі. У 1989 г. школа займае першае месца ў Рэспубліканскай ваенна-спартыўнай гульні «Арляня» і «Зараніца». Дырэктар школы Н.Я. Яўтуховіч узнагароджваецца значком «Выдатнік грамадзянскай абароны БССР».

У кастрычніку 1991 г. школа пераходзіць у новы будынак. У 1999 г. дырэктарам школы прызначаны Сінгалевіч Серафім Фёдаравіч. У 2002 г. на базе школы створаны класы ваенна-патрыятычнага накірунку, у 2004 г. – класы прававога накірунку. Навучэнцы прававых класаў у канцы кожнага навучальнага года ўдзельнічаюць у прававой алімпіядзе «Феміда», якую праводзіць Акадэмія МУС. За шэсць гадоў удзелу ў алімпіядзе навучэнцы ўвесь час узнагароджваліся дыпламамі 1 – 3 ступені. На працягу чатырох апошніх гадоў – пераможцы ў творчым конкурсе эсэ «Мы выбірае шлях».

Перамогамі адзначана і гісторыя класаў патрыятычнага накірунку. Усяго за дзесяць гадоў існавання дадзеных класаў навучэнцамі з Рэспубліканскіх алімпіяд прывезены 31 дыплом рознай ступені, 6 кубкаў за перамогі ў розных намінацыях. Педагагічны калектыў узнагароджаны Ганаровымі граматамі Акадэміі МУС і Акадэміі ВС РБ за вялікую працу па патрыятычным і прававым выхаванні навучэнцаў.

2012 год стаў для школы па шэрагу пытанняў пераломным:

- на падставе рашэння Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта №940 ад 16.08.2012 г. установа была рэарганізавана шляхам пераўтварэння ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Дзіцячы сад-сярэдняя школа № 4 г. Кобрына»;
- адкрыццё 5 класа інтэграванага (сумеснага) навучанні і выхаванні з рускай мовай навучання;
- на пасаду дырэктара з 20.08.2012 г. прызначана Фігурына Алёна Васільеўна.

**Бялоў, Дз.** З выпускнога – у першы клас: [СШ №4 з простай сярэдняй школы ператварылася ў дзіцячы садок-сярэднюю школу] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2013. – 5 чэрвеня. – С.2.

**Ивченков, С.Н.** ЮридСШ №4 /С.Н. Ивченков //Кобрин-информ. – 2013. – 9 мая. – С.4.

**Рулевые** школьного корабля: к началу нового учебного года *СШ №4* , №8 возглавили новые руководители //Кобрин-информ. – 2013. – 29 августа. – С.2.

**Жук, Е.** Есть в Кобрине братство кадетское: [о кадетских классах в СШ №4] /Елена Жук //Вечерний Брест. – 2012. – 29 августа. – С.7.

**Лук, Н.** “Догнать” и “перегнать” Ангелину: [в СШ №4 открыт интегрированный класс, где наравне со всеми учениками занимаются дети с особенностями развития] /Нина Лук //Вечерний Брест. – 2012. – 30 лістапада. – С.5.

**Фигурина, А.** Долгожданный детский сад: [СШ №4 преобразован в детский сад-школу] /Алена Фигурина, беседовала Наталья Кондрашук //Кобрин-информ. – 2012. – 30 августа. – С.3.

**Бялоў, Дз.** Кадэцкі падарунак: [адразу 26 дыпломаў прывезла каманда кобрынскіх кадэтаў з СШ №4 з грамадска-патрыятычнай змены ў лагеры “Зубраня”] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2011. – 5 кастрычніка. – С.3.

**Бялоў, Дз.** І дух сапраўднага братэрства: [аб кадэцкіх і юрыдычных класах СШ №4] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2011. – 7 мая. – С.3.

**Команда** “Прометей” в числе лучших : [в республиканской правовой алимпиаде команда СШ № 4 заняла второе место] //Кобрин-информ. – 2011. – 5 мая. – С.2.

**Пад** эгідай Феміды: [каманда вучняў юрыдычных класаў СШ №4 на рэспубліканскай алімпіядзе заняла другое месца] //Народная трыбуна. – 2011. - 14 мая. – С.3.

**Бялоў, Дз.** Гонар мундзіра - на вышыні: [вучні юрыдычных і кадэцкіх класаў СШ №4 атрымалі 1 месца на рэспублі-

канскім злёце ў ваенна-патрыятычнай гульне “Зарніца”] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2010. – 2 ліпеня. – С.4.

**Бялоў, Дз.** Школа патрыятызму і годнаці : [СШ №4] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2010. – 9 кастрычніка. – С.12.

**Сайт** СШ №4 г. Кобрина http://sch4.kobrin.edu.by/

## ДУА «Сярэдняя школа № 7 г. Кобрына” – 35 гадоў



Шэсць функцыяніруючых у Кобрыне сярэдніх навучальных устаноў не маглі змясціць усіх дзяцей, таму ў 1979 году была пабудавана яшчэ адна школа.

1 снежня 940 навучэнцаў пераступілі яе парог і 44 педагога прыступілі да сваіх абавязкаў. Дырэктарам стаў Васіль Паўлавіч Бадза. На працягу 20-ці гадоў Васіль Паўлавіч быў нязменным кіраўніком дружнага і згуртаванага калектыва, які імкнуўся падтрымліваць навучальна-выхаваўчы працэс на належным узроўні.

З 1979 па 1985 г. у школе працавала ўзорнапаказальная Ленінская зала. З прыходам перабудовы на яго месцы быў створаны Ваенна-гістарычны музей. Пасля Васіля Паўлавіча ў школе змянілася некалькі кіраўнікоў: Ігнацюк Ніна Якаўлеўна, Знахарчук Васіль Міхайлавіч. З 2008 г. і па сённяшні дзень дырэктарам школы з'яўляецца Крумкач Андрэй Аляксеевіч. У 2006 г. будынак адрамантавалі. Будаўнікі падарылі школе новае аблічча. Прасторныя холы і калідоры, абсталяваная спартзала, утульныя кабінеты, музей «Скарбы роднага краю» - гэта СШ № 7.

Вынікам плённай працы некаторых настаўнікаў з'яўляюцца перамогі ў розных конкурсах метадычнага характару, публікацыі ў перыядычных выданнях (Соўпель С.Н. і Чэхомаў А.Д. апублікавалі свае матэрыялы ў «Настауніцкай газеце»). Настаўнік англійскай мовы Шэлегейка Т.П. і настаўнік хіміі

Чэхомаў А.Д. прынялі ўдзел у раённым конкурсе «Настаўнік года». Андрэй Дзмітрыевіч заняў трэцяе месца.

Сведчанне эфектыўнасці адукацыйнага працэсу - перамогі вучняў школы на прадметных алімпіядах, у навукова-практычных канферэнцыях, у рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся", высокі працэнт паступленняў выпускнікоў у ВНУ.

Прашчуровіч Юлія, вучаніца 11 класа, стала пераможцам конкурсу «Вучань года» 2008, Касцючук Андрэй у 2012 г. атрымаў тытул «Містар Кобрын».

Кружкі, клубы і секцыі, якія працуюць у школе, дапамагаюць раскрыць самыя разнастайныя таленты і здольнасці вучняў.

ДУА «Сярэдняя школа №7 г. Кобрына” - школа з паглыбленным вывучэннем англійскай мовы ў 5-11 класах, павышаным узроўнем – у пачатковых. Профільнае навучанне (грамадска-эканамічны, філалагічны, хіміка-біялагічны, тэхналагічны, спартыўны профілі). Працуе пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Прафесійнае навучанне праходзіць на базе міжшкольнага навучальна-вытворчага камбіната. Спартыўныя секцыі (баскетбол, лёгкая атлетыка, гімнастыка), турыстычны кружок. Працуе экалога-краязнаўчы цэнтр. Дадатковыя адукацыйныя паслугі на платнай аснове ў пачатковых класах.

**Сідарук, І.** Кветкі для любімага дырэктара: [аб дырэктары СШ № 7] /Ігар Сідарук //Кобрынскі веснік. – 2013. – 5 кастрычніка. – С.1.

**Кириевская, Е.** «Под сению кулис…»: [коллектив учащихся СШ №7 был назначен лидером Пушкинского фестиваля, организованного в БГУ имени А.С. Пушкина]/Елена Кириевская //Кобрин-информ. – 2012. – 25 мая. – С.9.

**Курига, Е.** Дело всей её жизни: [о директоре СШ №7 г. Кобрина Н. Игнатюк] /Елена Курига //Кобрин-информ. – 2007. – 4 октября. – С.3.

**Грышкевіч, С.** Профіль дэманструе свае перавагі: [укараненне профільнага навучання на прыкладзе СШ №7] /Сяргей Грышкевіч //Настаўніцкая газета. –2007. –27 верасня.

**Великолепная** десятка : [из 22 дипломов кобринских школьников, победителей областной алимпиады 2005 г., 10 – в активе учащиеся СШ №7]//Кобрынскі веснік. – 2006. – 4 лютага.

**Пянко, А.** Школа станет красивее и теплее: [СШ №7 – реконструкция школы] /А. Пянко //Кобрынскі веснік. – 2006. – 7 чэрвеня. – С.1.

**Шевченко, А.** Оценка школе за ремонт: [прошёл капитальный ремонт СШ № 7] /А. Шевченко //Кобрин-информ. – 2006. – 7 сентября. – С.2.

**Сайт** СШ № 7 г. Кобрина http://sch7.kobrin.edu.by/

## ДУА “Мінянская сярэдняя школа” – 55 гадоў



*З гісторыі адукацыі в. Мінянка.*

У 50 гады працавала 4 школы: Яўсімавіцкая пачатковая (загадчык Астапук Сцяпан Рыгоравіч), Стрыёўская пачатковая (загадчык Хільчук Емяльян Паўлавіч), Рэчыцкая пачатковая (загадчык Вінаградаў Пракоп Харлампіевіч) і Засімоўская сямігодка (дырэктар Малышаў Мікалай Рыгоравіч).

Па ініцыятыве старшыні калгаса Карэнюгіна Аляксандра Іпалітавіча было пачата будаўніцтва новай школы. 1 верасня 1959 года Мінянская школа гасцінна расчыніла свае дзверы. Яшчэ некаторы час працавала Засімоўская сямігодка, пачатковыя школы ў вёсках Рэчыца і Стрыі.

Першым дырэктарам школы быў Малышаў Мікалай Рыгоравіч. Ён узначальваў школу з 1959 па 1965 гады. З 1965 па 1979 гады школу ўзначальваў Швайчук Міхаіл Сцяпанавіч . З 1980 па 1998 год дырэктарам школы працавала Ячнік Ніна Міхайлаўна. За пярыяд яе кіраўніцтва шмат змен адбылося ў

школе. Быў зроблены капітальны рамонт, заменены старыя печкі, падлога і яшчэ шмат чаго зроблена.

З 1999 па 2009 год школу ўзначальвала Радковіч Галіна Уладзіміраўна, якая сёння з'яўляецца загадчыкам аддзела адукацыі Кобрынскага райвыканкама. З'явілася асобна пачатковая школа, а на месцы старых будынкаў размясціўся школьны краязнаўчы музей і школьная бібліятэка. І ў самой школе былі праведзены сур'ёзныя змены. Кіраўніком школы цяпер з'яўляецца былая вучаніца школы, настаўніца фізікі Молчан Галіна Іванаўна.

Сёння Мінянская школа - гэта сярэдняя агульнаадукацыйная экалагічная школа. Спецкурсы "Экалагічная граматыка", "Экалогія", "Экатэатр". Заняткі экалагічнага, фізкультурна-спартыўнага (настольны тэніс, лёгкая атлетыка, шахматы, футбол) накірункаў, прававога цыклу. Кружок "Юныя эколагі". Працоўныя аб'яднанні школьнікаў "Лясун", "Школьнае ляснікоўства" і "Сонейка", рамонтна-будаўнічая брыгада. Экалагічная сцежка, музей. Дадатковыя адукацыйныя паслугі на платнай аснове: інфарматыка ў 2-4 кл., нямецкая мова ў 1 кл.

**Занько, Н.** Вучымся эканоміць: [Мінянская школа заняла першае месца ў рэспубліканскім конкурсе "Энергамарафон-2012" ] /Настасся Занько; фота аўтара //Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 красавіка. – С.3.

**Занько, Н.** Школа любві да прыроды: [аб поспехах Мінянскай экалагічнай школы] /Настасся Занько; фота аўтара //Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 красавіка. – С.3.

**Сянкевіч, М.** На іх спадзяецца Зямля: [вучні Мінянскай школы сталі пераможцамі абласнога конкурсу навукова-даследчых прац] /Мікола Сянкевіч //Народная трыбуна. –2013. – 3 мая.- С.2.

**Грышкевіч, С.** Экалагічная адукацыя: ад гульняў да даследчай дзейнасці: [на 3 абласной навукова-практычнай канферэнцыі па праблемах экалагічнага выхавання адзначаны ўстановы Кобрыншчыны, у тым ліку Мінянская СШ] /Сяргей Грышкевіч //Настаўніцкая газета. – 2012.– 14 студзеня. – С.13.

**Бялоў, Дз.** Вопыт прыходзіць у працы: [50 гадоў споўнілася Мінянскай сярэдняй экалагічнай школе] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2009. – 29 жніўня. – С.2.

**Нікалаева, Н.** Сябры лесу: [члены школьнага лясніцтва "Лесавік" Мінянскай СШ прадставяць Беларусь на 6 Міжнародным юніёрскім лясным конкурсе, які пройдзе ў Маскве] /Надзея Нікалаева //Звязда. – 2009. – 4 верасня. – С.3.

**Грышкевіч, С.** Мінянская школа-аазіс: [прыярытэтным накірункам вуч.-выхаваўчага працэсу Мінянскай СШ з'яўляецца экалагічнае выхаванне]/Сяргей Грышкевіч //Настаўніцкая газета. – 2007. – 4 кастрычніка. – С.3.

**Паўлава, М**. У Мінянцы шмат новага: экалагічны накірунак работы Мінянскай СШ /М. Паўлава //Кобрынскі веснік. – 2004. – 12 чэрвеня. – С.7.

**Сайт** Минянской СШ http://min.kobrin.edu.by/

## ДУА "Хідрынская сярэдняя школа" – 40 гадоў



*З гісторыі адукацыі в. Хідры.*

Навучанне дзяцей у в. Хідры пачалося ў 80-х гадах 19 стагоддзя. Вялося яно па чарзе ў сялянскіх хатах. Тэрмін навучання ў царкоўна-прыхадской школе абмяжоўваўся галоўным чынам 3-мя гадамі. Падчас польскай акупацыі (1921-1939) навучанне вялося на польскай мове.

Адразу пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у вёсцы была адкрыта пачатковая школа. У 1949 г. адкрылася 7-летняя школа (у 1961 г. - 8-летняя). Шмат энергіі справе станаўлення адукацыі ў в. Хідры аддаў Віктар Сцяпанавіч Канчан. Змяніўшы аўтамат на пяро, ён актыўна ўключаецца ў развіццё школы, якой кіраваў звыш 15- ці гадоў.

У 1974 г. адкрываецца сярэдняя школа. Пачынаючы з 1-га выпуску, сярэднюю адукацыю атрымалі звыш 600

навучэнцаў, якія працуюць у розных сферах народнай гаспадаркі.

З 1962 г. школу ўзначаліў Майсяюк Віталь Панцялеевіч.

З 1966г. - Надольская Клаўдзія Фёдараўна.

З 1983г. - Кульчынскі Андрэй Іванавіч.

З 2003г. - Назарук Алена Мікалаеўна.

На сёняшні час пры Хідрынскай сярэдняй школе існуе ліцэйны клас філалагічнага профіля на аснове дамоўленасці з Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А.С.Пушкіна, профільнае навучанне (эканамічны, філалагічны), павышаны ўзровень вывучэння замежнай мовы. Прафесійнае навучанне на базе навучальна-вытворчага камбіната. Заняткі па інтарэсах у пачатковых класах, факультатывы (5-7кл.), курсы па выбары (8-11кл.) па агульнаадукацыйных прадметах. Секцыі (баскетбол, футбол, плаванне, настольны тэніс, лёгкая атлетыка, дзюдо, шахматы і шашкі), кружкі мастацка-эстэтычнага цыклу.

Дадатковыя адукацыйныя паслугі на платнай аснове: англійская мова (1-2 кл.).

**Елизарова, Ж.** Слово об учителе: [об учителе русского языка и литературы Хидринской СШ Н.Д. Козлович] /Жанна Елизарова //Кобрин-информ. – 2011. – 29 сентября. – С.6.

**Грышкевіч, С.** Сацыяльных партнёраў у аграгарадку зашмат не бывае : [гэта доказвае вопыт Хідрынскай СШ] /Сяргей Грышкевіч//Настаўніцкая газета. – 2009. – 23 красавіка. – С.6-7.

**Гармель, Е.** Смотрите и учитесь: названа лучшая школа агрогородка : [прошёл закл. этап обл. конкурса "Школа агрогородка – центр формирования социокультурной среды села", где 3 место заняла Хидринская СШ] /Е. Гармель //Заря. – 2008. – 13 декабря. – С.10.

**Грышкевіч, С.** Школа аграгарадка – гэта школа сацыяльнага партнёрства: [на Брэстчыне вызначаны лепшыя навучальныя ўстановы аграгарадкоў, у тым ліку Хідрынская СШ] /Сяргей Грышкевіч //Настаўніцкая газета. – 2007. – 27 верасня. – С.2.

**Сайт** Хидринской СШ http://xidri.kobrin.edu.by/

## ДУА “Кіселявецкі дзіцячы сад – сярэдняя школа”- 65 гадоў




Сямігадовая школа ў мястэчку працавала да 1970 г. За гэты час яе кіраўнікамі былі: Салоўка Іван Фёдаравіч (1949 - 1953 гг.), Хамічэнка Лізавета Антонаўна (1953 - 1955 г.г); Нікіцін Аляксей Дзмітрыевіч (1955 - 1956 г.г.), Салей Мікалай Андрэевіч (1956 - 1976 г.г.).

У 1968 году пачата будаўніцтва новай 8-гадовай школы. У 1969 - 1970 г. адбыўся пераезд у новы будынак. Школа разлічана на 150 чалавек.

Дырэктары школы:

З 1976 па 1986 г. - Сінгалевіч Серафім Фёдаравіч (10 гадоў).

З 1986 па 1998 г. - Олех Кастусь Якаўлевіч (12 гадоў).

З 1998 па 2002 г. - Будзько Іван Іванавіч (4 гады).

З 2002 гады - Зінкевіч Ірына Міхайлаўна .

З 1994-95 навуч. г.- пераход на 11-летняе навучанне. У 1996 году быў першы выпуск 11-гадовай школы. З 2003 г. - комплекс дзіцячы сад - сярэдняя школа (1 рознаўзроставая група).

З 2006 г. - дзве рознаўзроставыя групы.

З 2012 г. - тры рознаўзроставыя групы.

Кіселявецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа прадастаўляе адукацыйныя паслугі дашкольнікам у адпаведнасці з праграмай "Пралеска" і рэалізуе праграму агульнай сярэдняй адукацыі. Профільнае навучанне (філалагічны профіль), павышаны ўзровень вывучэння матэматыкі (10 кл), беларускай мовы (9 кл).

Прафесійнае навучанне на базе Кобрынскага навучальна-вытворчага камбіната. Праходзяць заняткі па інтарэсах у пачатковых класах, факультатывы (5-7 кл.), курсы па выбар (8-11кл.) па агульнаадукацыйных прадметах. Заняткі ў кружках: дэкаратыўна-прыкладнога, мастацкага, краязнаўчага, фізкультурна-спартыўнага (настольны тэніс, гульнёвыя віды спорту) накірункаў, танцавальным.

Дадатковыя адукацыйныя паслугі на платнай аснове: група выхаднога дня (па дзіцячым садзе), ранняе навучанне чытанню.

**Кондрашук, Н.** Лучшая школа агрaгородка: [команда Киселевецкого детского сада-средней школы с победой вернулась с областного конкурса на лучшую школу агрогородка] /Наталья Кондрашук//Кобрин-информ. – 2012. –20 декабря.– С.5.

**Бялоў, Дз.** Поўніцца дзецьмі вёска : [у Кіселявецкім дзіцячым садку-сярэдняй школе адкрылася трэцяя група] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. –2011. – 19 лістапада. – С.2.

**Аб узнагароджанні** Міністэрства адукацыі за шматгадовую плённую работу: [ ганаровай граматай Міністэрства адукацыі РБ узнагароджана Зінкевіч Т.М., дырэктар ДУА “Кіселявецкі дзіцячы сад-сярэдняя школа”]//Настаўніцкая газета. – 2010. – 2 кастрычніка. – С.2.

**Бялоў, Дз.** Разам з мамай – у садок : [аб Кіселявецкім дзіцячым садку-сярэдняй школе] /Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2010. – 3 сакавіка. – С.2.

**Школа**, в которой учатся жить: [Киселевецкий детский сад-средняя школа отметил 60-летний юбилей] //Кобрынскі веснік. – 2009. – 11 лютага. – С.1,4.

**Сайт** Киселевецкого детский сада-средней школы http: //kisel.kobrin.edu.by/

# ДУА “Раённы цэнтр дзіцячай творчасці”

**Ансамблю танца «Пралесачкі» –**
**40 гадоў**
**Студыі выяўленчага мастацтва -**
**40 гадоў**
**Эстраднай студыі «Крыніца» -**
**35 гадоў**




**Ансамбль танца «Пралесачкі»** створаны ў 1974 г. (кіраўнік - Святлана Іосіфаўна Чырун). У рэпертуары ансамбля- фальклорныя, сюжэтныя, народныя і сучасныя эстрадныя танцы. С.І. Чырун за падрыхтоўку і ўдзел калектыву ў Міжнародным фестывалі рэгіянальнага танца «Палескі карагод» (2000) узнагароджана Ганаровай граматай. Званне ўзорнага прысвоена ў 1995 г.

**Студыя выяўленчага мастацтва** створана ў 1974 г. Кіраўнік - Анатоль Рыгоравіч Зуброў. Юныя мастакі -удзельнікі гарадскіх, раённых, абласных выстаў дзіцячай творчасці, рэспубліканскіх мастацкіх конкурсаў і міжнародных праектаў ЮНЕСКА. Работы студыйцаў выстаўляліся ў Анголе, Германіі, Бельгіі, Грэцыі, Японіі, Тунісе, Югаславіі, Італіі, Францыі, Нідэрландах, Польшчы, Чэхаславакіі і інш. Прафесійнымі мастакамі сталі выпускнікі студыі Віталь Трафімаў, Эдуард Качан, Наталля Скарга, Барыс Салівончык і інш. Званне народнай прысвоена ў 1983 г.

**Эстрадная студыя «Крыніца»**. У верасні 1979 г. пры гарадскім Доме піянераў і школьнікаў быў створаны эстрадны ансамбль «Крыніца». Кіраўнік - Мікалай Ігнатавіч Мацвяйчук. З часам ансамбль перарос у эстрадную студыю, дзе займаецца каля 40 хлопчыкаў і дзяўчынак. У рэпертуары - сучасныя эстрадныя песні, дзіцячыя песні з мультфільмаў, беларускія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы, аранжыроўкі да народных песень М.І.Мацвяйчука. Яны неаднаразова былі лаўрэатамі абласных фестываляў «Рытмы маладосці», «Беларусь - мая песня», тэлевізійнага фестывалю «Усе мы родам з дзяцінства». Званне ўзорнага прысвоена ў 1987 г.

**Ансамбль** танца «Пралесачкі» Дома творчасці юных //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.511.

**Студыя** выяўленчага мастацтва //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка.Кобрынскі раён.-Мінск:БЕЛТА,2002.- С.511.

**Эстрадная** студыя «Крыніца» //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.511.

**Казакова, А.** На "Волне идей":[образцовый ансамбль танца "Пралесачкі" РЦДТ побывал на международном фестивале-конкурсе детского и молодёжного творчества "Новая волна идей - 2013"]/Анна Казакова //Кобрин-информ. - 2013.- 4 июля. - С. 7.

**Казакова, А.** "Пралесачкі" в книге рекордов Украины:[на международном фестивале в Украине кобринский коллектив собрал максимальное количество дипломов]/Анна Казакова //Кобрин-информ. - 2012.- 2 августа. - С.3.

**Казакова, А.** Танец – это маленькая жизнь : [образцовый ансамбль танца "Пралесачкі"]/Анна Казакова //Кобрин-информ. - 2012. - 24 мая. - С.2.

**Зубров, А.** "Я вижу город через призму детских рисунков": [руководитель изостудии – о детских работах]/Анатолий Зубров //Кобрынскі веснік. – 2011. – 16 ліпеня. – С.10.

**Елизарова, Ж.** В ритме "Кобринской польки": [образцовый ансамбль танца «Пралесачкі» одержал победу в республиканском конкурсе] /ЖаннаЕлизарова//Кобрин-информ.–2011.– 15декабря.- С.5.

**Елизарова, Ж.** С танцем по жизни : [о руководителе образцового ансамбля танца «Пралесачкі» С.И.Чирун] /Жанна Елизарова //Кобрин-информ. – 2011.– 22 сентября.- С.26.

**Информ**-курьер:местные новости : [образцовый эстрадный ансамбль «Крыніца» защитил звание «Образцового»] //Кобрынскі веснік. – 2011. – 12 лютага. – С.2.

**Юшкевич, П.** Юные и талантливые : [коллектив "Пралесачкі" стал победителем на республиканском конкурсе "Юные таланты Беларуси»] /Павел Пашкевич //Заря. –2011.– 6 декабря. – С.2.

**Курига, Е.** «Пралесачкі» снова на высоте :[с международного фестиваля образцовый коллектив приехал с двумя дипломами]/Елена Курига //Кобрин-информ.–2009.–16 июля. – С.3.

**Танцы** з …бабулінага куфэрка: [“Пралесачка” паспяхова выступіла на міжнародным фестывалі]//Народная трыбуна. – 2009. – 18 ліпеня. – С.3.

**Уладзіміраў, Дз.** І ніякай “папсы”: [аб эстрадным ансамблі “Крыніца”]/Дзмітрый Уладзіміраў // Кобрынскі веснік. – 2009. – 1 красавіка. – С.7.

**Летние** успехи “Пралесак” : [коллектив “Пралесачкі” принял участие в 6 Международном детском фестивале песни и танца]//Кобрин-информ. – 2008. – 17 июля. – С.2.

**Сацук, А.** “Пралесачкам” аплодировали стоя /Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2008. – 21 ліпеня. – С.3.

**Охремук, Л**. Нарисую город будущего: [две темы – День города и благоустройство – были главными в конкурсе воспитанников изостудии] /Л. Охремук //Заря.–2003.–12 августа. – С.2.

**Аб** эстрадным ансамблі “Крыніца” Дома творчасці юных //Кобрынскі веснік. – 2002. – 11 мая. – С.2.

**Мацвяйчук, М.** “Крыніца” збірае і выхоўвае таленты: [пры Кобрынскім Доме піянераў і школьнікаў быў створаны эстрадны ансамбль “Крыніца”] /М. Матвяйчук //Кобрынскі веснік. – 2000. – 7 сакавіка. – С.4.

**Астраух, В.** У “Пралесачак” – юбілей /В. Астравух //Кобрынскі веснік. – 1999. – 29 мая. – С.2.

**Остроух, В.** Ах, вернисаж: [юбилейный вернисаж, посвящённый 25-летию народной студии изобразительного искусства]/В. Остроух //Кобрынскі веснік. – 1999. – 6 лістапада. – С.2.

**Шугай, А.** 20-годдзе студыі выяўленчага мастацтва пры Доме творчасці юных /А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 1998. – 25 сакавіка. – С.4.

# Юбілеі ўстаноў культуры раёна

## Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы – 75 гадоў





Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці гарадской бібліятэкі, якая размяшчалася ў невялікім драўляным доме па вуліцы Суворава. Сюды былі звезены кнігі і абсталяванне з усіх нацыяналізаваных бібліятэк, сталі паступаць пасылкі з усходніх раёнаў рэспублікі. Была нават адкрыта невялікая чытальная зала. Да лета 1941 г. кніжны фонд налічваў 14 тыс. экзэмпляраў. За гады Вялікай Айчыннай вайны акупанты расстралялі 4 супрацоўнікаў установы, разрабавалі кніжны фонд, у бібліятэцы працаваў адзін работнік, а літаратура была толькі на польскай мове. Пасля вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў ужо 22 ліпеня 1944 г. на нарадзе актыву ў райкоме партыі А.М.Мартынаву было даручана ў найкарацейшы тэрмін аднавіць работу бібліятэкі. Яна размясцілася ў мураваным будынку па вуліцы Савецкай. З 1960 г. Кобрынскую бібліятэку ўзначальвала В.Д. Касько.

У 1978 г. бібліятэчная сетка раёна перайшла на цэнтралізаваную сістэму абслугоўвання, якая аб’яднала 62 бібліятэкі з кніжным фондам 680 тыс. экзэмпляраў. У бібліятэцы было 3 аддзелы: абслугоўвання (6 чалавек), апрацоўкі і камплектавання літаратуры (7 чалавек), методыка-бібліяграфічны (4 чалавекі).

У маі 1980 г. у адным з будынкаў па вуліцы Жданава пачала працаваць новая цэнтральная раённая бібліятэка. Пры цэнтральнай раённай бібліятэцы была створана літаратурна-

паэтычная група «Рытм», члены якой выступалі ў маладзёжных аўдыторыях, на вытворчых участках, у вучылішчах з самай разнастайнай тэматыкай. Дзейнічае таксама прафесійны клуб краязнаўчага напрамку «Бацькаўшчына», які аб’ядноўвае ўсіх бібліятэкараў раёна.

З 1995 г. бібліятэку ўзначальвае М.В.Іванова. У практыку работы бібліятэкі ўкараняюцца такія формы прапаганды кнігі, як гадзіны і вечары беларускага фальклору, гадзіны карысных парад і цікавых паведамленняў, дні перыядычнага друку, урокі краязнаўства, бібліятэчныя вячоркі. Работнікі бібліятэкі супрацоўнічаюць з мясцовым друкам, радыёвяшчаннем, у прыватнасці, выступаюць па мясцовым радыё з нарысамі пра знакамітых жыхароў раёна ў цыкле перадач «Шануем нашых землякоў».

Сёння цэнтральная раённая бібліятэка абслугоўвае больш за 6 тысяч чытачоў, мае 80 тысяч адзінак бібліятэчнага фонду, як на бумажных, так і на электронных носьбітах. Бібліятэка прадастаўляе 39 відаў платных паслуг, большая частка якіх выконваецца з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі. З 2002 г. пры бібліятэцы працуе Публічны цэнтр прававой інфармацыі. З 2010 г. бібліятэка атрымала безлімітны доступ у сетку Інтэрнэт, кругласутачнае злучэнне з кожнага аўтаматызаванага рабочага месца. Ёсць электронная пошта, электронны каталог. Працуюць ксеракапіравальныя апараты, сканэры, апарат для ламініравання, мультымедыйная сістэма. Са снежня 2011 г. адкрыты сайт бібліятэкі. З 2013 г. бібліятэка вядзе абслугоўванне карыстальнікаў у электронным рэжыме, працуе ў аўтаматызаванай інфармацыйнай бібліятэчнай праграме ALIS -WEB.

Ідзе работа па перакладу сабраных на працягу шматлікіх гадоў краязнаўчых матэрыялаў у электронную форму, па стварэнню краязнаўчых паўнатэкставых баз дадзеных на электронных носьбітах.

**З успамінаў** А.М. Мартынава //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.416-417.

**Іванова, М.В**. Бібліятэкі Кобрыншчыны /М.В. Іванова

//Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.414-415.

**Кобринская** центральная районная библиотека//Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С.467.

**Галавейка, Т**. …А назаўтра сайт бібліятэкі наведалі 488 чалавек : [Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка правяла акцыю пад адкрытым небам «Кнігі выйшлі пагуляць», прысвечаную Дню горада] /Таццяна Галавейка //Культура. – 2013. – 27 ліпеня. – С.3.

**Занько, Н.** З любоўю да роднай літаратуры: [Кобрынская раённая бібліятэка падводзіць вынікі Года кнігі] / Настасся Занько //Кобрынскі веснік. - 2013. - 2 студзеня. – С. 2.

**Кондрашук, Н**. “Золотой фонд” библиотеки: [в ЦБ состоялось праздничное мероприятие, посвященное Дню библиотек] /Наталья Кондрашук //Кобрин-информ. - 2012. - 20 сентября. - С. 3.

**Курачук, С.** Выбар прафесіі – выбар лёсу: Абітурыенту-2013: [работа ЦБ па прафарыентацыі моладзі, аб прафесіі бібліятэкара] /Святлана Курачук //Кобрынскі веснік. – 2013. – 6 ліпеня. – С.10.

**Мельнік, Р.** І подых свежага паветра, і водгук даўніны сівой : [у рамках святкавання Дня горада па вуліцы Суворава прайшла акцыя Кобрынскай цэнтральнай бібліятэкі “Кнігі выйшлі пагуляць”] / Раман Мельнік, Дзмітрый Бялоў //Кобрынскі веснік. – 2013. – 24 ліпеня. – С. 1-2.

**Савчук, С.** Библиотека приглашает в онлайн: [книголюбы Кобринщины могут воспользоваться услугами централизованной библиотечной системы в режиме smart] / Светлана Савчук // Кобрынскі веснік. - 2013. - 19 кастрычніка. - С.3.

**Вовк, Ю.** Во славу книги: [в центральной библиотеке стало традиционным проведение уроков знаний] / Юлия Вовк //Кобрин-информ.- 2012.- 6 сентября. - С. 30.

**Занько, Н.** Кабрынчане ацанілі буккросінг : [пастаянная паліца буккросінгу ў ЦБ абнавілася ўжо некалькі разоў]/Настасся Занько //Кобрынскі веснік.- 2012.- 25 красавіка. - С.3.

**Інфармкур'ер** : мясцовыя навіны : [в Кобринской районной библиотеке появился свой сайт] //Кобрынскі веснік. – 2012. – 28 студзеня. – С.2.

**Кондрашук, Н.** На службе у читателей: [сотрудники библиотеки всегда рады видеть читателей в своих стенах] / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2012. – 19 июля. – С. 5.

**Курачук, С.** Краеведение – это увлекательно!: [в центральной библиотеке прошел месячник по краеведению] /Светлана Курачук //Кобрин-информ.- 2012. - 6 декабря. - С. 9.

**Сідарук, І.** З пашанай да чытачоў:[у Кобрынскай бібліятэцы любяць і шануюць як сталых, так і новых чытачоў] /Ігар Сідарук //Кобрынскі веснік. – 2012. – 1 верасня. - С.1.

**Фотоконкурс** «Человек читающий»: [в рамках мероприятий, приуроченных к Году книги, центральная библиотека объявила фотоконкурс] //Кобрынскі веснік.- 2012. - 16 чэрвеня. - С.4.

**Жук, Е.** А в Кобрине – библиовечеринка! : [Кобринской ЦБ впервые провела ночь в библиотеке] /Елена Жук //Вечерний Брест. – 2011. – 18 мая. – С.3.

**Курачук, С.** За правовыми знаниями – в библиотеку: [о работе публичного центра правовой информации при центральной районной библиотеке] /Светлана Курачук //Кобрин-информ. - 2011. - 1 декабря. - С.30.

**Курачук, С.** Книга о главном: [в фонде центральной библиотеки появилась уникальная книга – факсимильное издание Слуцкого Евангелия]/Святлана Курачук //Кобрин-информ. - 2011. - 7 апреля. - С.33.

**Мартынчик, К.** У пашане – беларуская кніга: [аб беларускамоўным фондзе цэнтральнай раеннай бібліятэкі]/Кацярына Мартынчык//Кобрынскі веснік. – 2011. - 8 кастрычніка. - С.3.

**Гром, А.** Культурный центр родного края: [роль центральной библиотеки в культурном развитии края] /Анна Гром //Кобрынскі веснік. – 2010. – 15 студзеня. - С.8.

**Кандрашук, Н.** Цэнтр у цэнтральнай: [70 год адзначыла Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка] /Наталля Кандрашук //Культура. – 2009. – 7-13 лістапада. – С.12.

**Мельнік, Р.** Бібліятэка мяняе імідж: [Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка пераживае капітальны рамонт] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік. – 2009. – 15 жніўня. – С.2.

**Цветкова, Л.В**. В ногу со временем: [об услугах, предоставляемых Кобринской центральной районной библиотекой] /Л.В. Цветкова //Кобрин-информ. – 2009 . – 6 августа. – С. 3.

**Курачук, С.Д**. Роль ПЦПИ в правовом просвещении населения: [о работе ЦПИ в Кобринской районной библиотеке] /С.Д. Курачук //Бібліяпанарама. – 2007. - №12. – С. 51-54.

**Сайт** Кобринской центральной районной библиотечной системы http://krcls.by

## Кінатэатру «Радуга» камунальнага ўнітарнага кінавідовішчнага прадпрыемства "Кобрынская раённая кінавідэасетка" - 30 гадоў






**Кінатэатр "Радуга"** з'явіўся ў Кобрыне ў 1984 г. па вуліцы Пушкіна. Будынак кінатэатра знаходзіцца ў цэнтры горада. Вялікая зала разлічана на 300 пасадкавых месцаў, малая - на 140 месцаў. Кінатэатр абсталяваны сучасным відэапраектарам, сістэмай Dolby. Да паслуг наведвальнікаў кінатэатра-пракат DVD-дыскаў.

У фае кінатэатра з суботы на нядзелю праводзіцца начная дыскатэка. Запрашаюцца DJ з Мінска, іншых рэгіёнаў Беларусі. Выступаюць музычныя калектывы розных кірункаў і стыляў.

З верасня па май у кінатэатры "Радуга" праходзяць кіналекторыі для школьнікаў горада і раёна, рэгулярна

арганізуюцца розныя выставы - дзіцячага малюнка, мастацкіх фатаграфій.

У кінатэатры працуе бар.

**Другак, Ж.** В процессе изучения и поиска: [интервью с новым директором КУКП "Кобринская районная киновидео-сеть" Ж. Другак] / Жанна Другак; беседовала Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2013. - 4 апреля. - С. 6.

**Другак, Ж.** “Радуга” чакае гасцей: [інтэрв’ю з дырэктарам кінавідэасеткі Ж. Другак]/Жана Другак, запісаў Раман Мельнік//Кобрынскі веснік. – 2013. – 13 верасня. – С.4.

**Казакова, А.** Новые цвета "Радуги": [о новых проектах, идеях в работе кинотеатра "Радуга"] /Анна Казакова //Кобрин-информ. - 2013. - 6 июня. - С. 5.

**Казакова, А.** Семь цветов "Радуги" : [чем живет сегодня кинотеатр "Радуга"] /Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013.- 1 августа. - С. 3.

**Грышко, Р.** “Сапраўдныя аматары фільмаў не прамяняюць кінатэатр на камп’ютар”: [становішча кінатэатра “Радуга” на сённяшні дзень]/Руслан Грышко, гутарыла Настасся Занько //Кобрынскі веснік. – 2012. -14 красавіка. – С.4.

**Мельнік, Р.** Прыгоды ў стылі “5D” : [у кінатэатры “Радуга” усталяваны атракцыён “5D”] /Раман Мельнік //Кобрынскі веснік. – 2012. – 28 студзеня. – С.3.

**Грышко, Р.** Гасцінна запрашае “Радуга” /Руслан Грышко //Кобрынскі веснік. – 2010. - 5 мая. – С.4.

**Гришко, Р.И.** Заиграет ли «Радуга» новыми красками? /Р.И. Гришко //Кобрин-информ. – 2010. – 10 июня. – С.6.

**«Радуга»** зажгла дискотеку : [вновь начала работу дискотека «Радуга» ]//Кобрин-информ. – 2008. – 3 января. – С.2.

**Васільеў, Р.** Канікулы і кіно – разам весялей : [ аб рабоце кінатэатра ў летні пярыяд ]/Р. Васільеў //Кобрынскі веснік. – 2006. – 8 ліпеня.

**Звучание** – класс! : [кинотеатр «Радуга» приобрёл новую профессиональную звуковую аудиоаппаратуру системы «Dolby digital 5.1] //Кобрынскі веснік. – 2005. – 5 лістапада. – С.3.

**Мельник, Р.** У «Радуги» цвета радости :[о работе диско-бара «Радуга» ] /Роман Мельник // Кобрынскі веснік. – 2004. – 15 мая. – С.7.

## Хору Балоцкага сельскага клуба – 45 гадоў



**Хор Балоцкага сельскага клуба** створаны ў 1969 г. Кіраўніком быў А.Я.Пракапюк, які прадоўжыў справу бацькі Я.І. Пракапюка, таленавітага музыканта. У калектыве 23 удзельнікі. Пры хоры арганізаваны калектыў-спадарожнік.

Балоцкі хор з 1994 г. носіць званне народнага. Калектыў – лаўрэат 2-га тура 1-га Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, удзельнік міжнародных фестываляў народнай творчасці на Украіне, у Мінску, украінскай песні ў Брэсце (2000). Узнагароджаны дыпломам саюза кампазітараў за прапаганду народнай песні. Неаднаразова беларускае тэлебачанне і радыё запісвалі выступленне хору для радыёперадач “Спадчына”, “Радавод”. Узнагароджаны дыпломам саюза кампазітараў за прапаганду народнай песні.

**Хор** Балоцкага сельскага клуба //Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка. Кобрынскі раён. - Мінск: БЕЛТА, 2002. - С.509.

**Мельнік, Р.** У кожным творы – часцінка душы: [народны хор Балоцкага сельскага хора]/Раман Мельнік//Кобрынскі веснік. – 2011. – 9 красавіка. – С.12.

**35 гадоў** спаўняецца народжнаму хору Балоцкага сельскага клуба //Народная трыбуна. – 2004. – 13 лістапада. – С.2.

**Хільчук, М.** І песня льецца шчырая, ад сэрца…: [аб народным хоры у в. Балоты]/Марыя Хільчук //Кобрынскі веснік. – 2004. – 28 лютага. – С.6.

**Хільчук, М.** З песняй парадніліся: [35 гадоў народнаму хору в. Балоты]/Марыя Хільчук //Кобрынскі веснік. – 2004. – 27 лістапада. – С.2.

# Змест


**Прадмова** с.2

**Дакументы сведчаць: асноўныя юбілейныя даты горада і раёна** с.3

Юбілейныя даты вёсак Кобрынскага раёна с.8

**Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем** с.28

**Юбілеі прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна** с.75

Юбілейныя даты сельгаспадарчых прадпрыемстваў раёна с.99

Юбілеі медыцынскіх устаноў раёна с.105

Юбілейныя даты ўстаноў сувязі раёна с.112

Юбілеі ўстаноў адукацыі раёна с.116

Юбілеі ўстаноў культуры раёна с.132

# Каляндар
# дат і падзей Кобрыншчыны

*(краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2014 год)*

*Складальнікі*: С. Курачук
Л. Сысоева

*Рэдактар*: М. Іванова

225306 вул. Жукава, 12., г.Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка

E-mail kobrin@brest.by